**сяргей егарэйчанка**

# лебедзі



# паміраюць разам

сяргей егарэйчанка

# лебедзі паміраюць разам

Мінск
Выдавец І. П. Логвінаў
2011

УДК 821.161.3-1
ББК 84 (4Беи)
Е 28

**Егарэйчанка, С. А.**
Е 28 Лебедзі паміраюць разам / Сяргей Егарэйчанка. — Мінск : І. П. Логвінаў, 2011. — 192 с.

ISBN 978-985-6991-39-7.

УДК 821.161.3-1
ББК 84 (4Беи)

ISBN 978-985-6991-39-7
© С. А. Егарэйчанка, 2011
© І. П. Логвінаў, афармленне, 2011

# Аповесць пра чалавека,
# які не хацеў быць Богам

*І калі вясёлкай над труной*
*вып'е кроў да кроплі з маіх жылаў,*
*Беларусь, накрый мяне зямлёй.*
*Не, счакай, яшчэ аддам я вочы*
*сваёй здані,*
*каб мая душа*
*не зблудзіла на чужыну ўночы,*
*каб між намі не лягла мяжа.*
*Беларусь мая, мая магіла,*
*з бел-чырвона-белага радна*
*ці кашулю мне на смерць пашыла?*
*Беларусь мая, мая магіла,*
*ты ж адна ў мяне, як ёсць адна.*

Анатоль Сыс "Беларусь маяё мая магіла"

– Дзеду Юрась, скажы, ты б хацеў быць Богам? Выправіць усё тое зло, якое было ў тваім жыцці, не даць памерці тваёй Аксане, рабіць людзей навокал шчаслівымі?

Стары памаўчаў, потым адказаў:

– Я б хацеў. Максім, я пражыў шмат гадоў, шмат болю і зла бачыў. Кожны раз мне рабілася прыкра, да болю прыкра, ад таго, што я нічога не магу зрабіць – не маю духу, сілы, веры. Я б хацеў стаць Богам, і, можа быць, хоць камусьці на зямлі ад гэтага было б трошачку лягчэй, радасней і шчаслівей. Хто ведае? А ты, хіба б адмовіўся?

– Я б адмовіўся. Я б забыўся, пачаў будаваць сваё ўласнае шчасце, не заўважаючы вялікага гора вакол. Каб быць Богам трэба мець занадта вялікае сэрца, каб бачыць увесь боль чалавечы, бачыць і дапамагаць. Альбо трэба не мець

аніякага сэрца, каб не заўважаць нічога, не дапамагаць адным, забыўшыся на астатніх. Я б не змог быць Богам. Я б не хацеў ім быць.

# Аповесць пра чалавека, які не хацеў быць Богам

Калісьці даўным-даўно тут не было нічога. Ні гоману голляў пухнатых елак, ні подыху прыемнай прахалоды, ні спеваў птушак. Калісьці на гэтым месцы высіліся толькі няроўныя выспы голых пагоркаў.

Не было і высотных дамоў, якія сёння ўздымаюцца праз колькі метраў ад гэтага бору, адрэзанага ад мікрараёну гулкай аўтастрадай.

Слова “даўно” кожны разумее, як хоча. Для кагосьці “даўно” – гэта сівыя стагоддзі і справы дзён, пра якія пішуць толькі ў падручніках гісторыі і псеўдагістарычных раманах. Нехта лічыць, што “даўно” – гэта дзесяць, дваццаць, трыццаць год таму – часы маладосці актуальнага рэспандэнта. Ну а нехта можа сказаць: “Гэта было даўно – хіба заўчора”.

Калісьці даўным-даўно тут не было нічога.

І, самае галоўнае, тут не было гэтых западзін грунта, на першы погляд непрыкметных, побач з якімі можна прайсці, не заўважыўшы, не звярнуўшы ні кроплі ўвагі, калі не ведаць, што яны азначаюць. Розныя па памеры – метр на тры, два на пяць, тры на дзесяць, – яны падаваліся ранамі на грудзях зямлі – неглыбокімі, але балючымі, некалі крывавымі, а зараз загоенымі рубцамі.

Гэтым рубцам было ад сілы паўстагоддзі. І жывыя яшчэ тысячы, хто памятаюць тыя часы, памятаюць, але жадаюць забыць. Мажліва таму, што дагэтуль баяцца ўспамінаў. Мажліва таму, што баяцца помсты. Іх страх жывы нават праз пяцьдзесят гадоў.

Спякотны травеньскі дзень пераваліў за сярэдзіну. Сонца завісла над вершалінамі елак, яго промні хутка сушылі аголеную рыдлёўкамі глебу.

Сярод зялёнага дывана маладой травы, якая густа пакрывала гэтыя пагоркі, ярка-чорнымі плямамі ззялі тры глыбокія ямы. З іх перыядычна вылятала зямля, выкінутая наверх салдацкай рыдлёўкай. Рота байцоў страйбата ўжо некалькі гадзін працягвала працу, абсалютна не разумеючы, для чаго яна патрэбная. Прынамсі, тым жа пытаннем задаваліся яшчэ й некалькі маладых экспертаў-крыміналістаў, якія зрэдчас пераходзілі ад ямы да ямы.

Ды былі тут і тыя, для каго гэтая справа не толькі не была бессэнсоўнай, але мела выключнае значэнне. Такіх людзей было некалькі: з аднаго боку – спецыялісты-археолагі інстытута гісторыі, з другога – мясцовыя і раённыя партыйныя бонзы і функцыянеры. Абодва бакі прагнулі, каб справа скончылася на іх карысць, бо перамога праціўнікаў мела б папросту непрадказальныя вынікі, як для адных, так і для другіх.

Раскопы ўжо блізіліся глыбінёй да двух метраў. Старшыня партыйнай дэлегацыі не хаваў свайго задавальнення: ён радасна пасміхаўся ў вусы, перыядычна паглядаючы на твары навукоўцаў. Праца падыходзіла да лагічнага (з пункту гледжання прадстаўнікоў улады) заканчэння.

– Вацлаў Міхайлавіч, – з аднаго раскопу даляцеў раптам нізкі голас салдата, – вы мусіце на гэта паглядзець.

Старэйшы з археолагаў не прымусіў сябе доўга чакаць.

З ямы выцягнулася рука байца з нейкім незразумелым прадметам.

– Костка... – прашаптаў навуковец, асцярожна прымаючы знаходку. Нельга было дакладна вызначыць, што гэта за костка – рыдлёўка салдата, стомленага шматгадзіннай

працай, проста размалацiла яе на дробныя фрагменты, якiя не паддавалiся нiякай iдэнтыфiкацыi.

– Далей капаць з максiмальнай асцярожнасцю! Пра любыя знаходкi адразу паведамляць мне, – голас археолага крыху дрыжэў, ён не мог стрымаць узрушанасцi.

Знаходка магла быць адзiнкавай i не мець нiякага дачынення да справы, з-за якой тут сабралася столькi кiраўнiкоў парткама. Костка магла належаць нейкай жывёлiне, памерлай дзясяткi год таму.

Але ўжо праз дзве хвiлiны стала ясна, што гэта не так. З-пад чорнай глебы паказалася яшчэ адна знаходка. На гэты раз баец быў асцярожны. Да справы падключылiся прафесiйныя археалогii. За дваццаць хвiлiн перад вачыма збянтэжаных чыноўнiкаў паўстала жахлiвае вiдовiшча – гэта быў добра захаваны чэрап з акуратнай дзiрачкай на патылiцы.

Верхняй пярэдняй часткi чэрапа фактычна не было – яе праламала куля на выхадзе.

# Мы

Жыць. Гэта ўсё, чаго мы хацелі. Жыць і працаваць. У нас не было дзяцей – мы былі шчэ занадта маладымі, каб мець сваіх. Прынамсі, нам гэта не перашкаждала – нашай радасцю ўсё роўна былі дзеці, хай і чужыя.

Вёска наша была даволі вялікай – хоць і не з'яўлялася райцэнтрам, але мела сваю школу. Школу, у якой навучаліся без малага амаль сорак дзетак. Гэта збольшага былі малыя, што жылі ў навакольных вёсках, раскіданых на адлегласці да дзесяці кіламетраў.

Маленькія і амаль дарослыя, яны кожны дзень тупалі тысячы крокаў, каб атрымаць тое, чаго так прагнулі – веды. Бацькі, амаль усе непісьменныя сяляне, марылі, што дзеці – іх надзея і адзіная радасць – вырвуцца з кола беднасці і нядолі, якое год за годам, дзесяцігоддзе за дзесяцігоддзем пераследвала тых, хто ўмеў здабываць свой хлеб толькі працай рук, потам і слязьмі.

Надзеі, надзеі... збольшага дарэмныя, наіўныя – наўрад ці ім наканавана было спраўдзіцца, але....

Але людзі пра гэта не ведалі. Ім і нельга было тое ведаць – прапагандысцкая машына Саветаў працавала нічым не горш за міністэрства прапаганды доктара Гебельса ў Германіі, якая ў гэты ж час дасягнула ўжо нечуванай магутнасці разам з нечуванай бесчалавечнасцю.

І гэта пры тым, што людзі – і тут, у шматпакутнай Беларусі, і там, у шматпакутнай Нямеччыне, былі адныя і тыя ж – са сваімі праблемамі, забабонамі і марамі. Ніхто з іх не хацеў бессэнсоўнай жорсткасці і пакутаў, ні для сябе, ні для сваіх блізкіх.

Але й тут і там людзі верылі, што дзяржава не можа памыляцца, а правадыры народаў жадаюць лепшай долі кожнаму.

Былі, вядома, і тыя, хто не верыў, але іх з кожным днём рабілася ўсё менш ды менш – хтосьці пацíху сцішваўся у сваёй непрымірымасці, а кагосьці сцішыцца прымушалі. Каго словам, каго пагрозай, каго катаваннямі.

Каго куляй.

Ды пра ўсё гэта не ведалі тыя, каму ведаць не было патрэбна.

Не ведалі гэтага тады й мы – так званая "новая інтэлігенцыя" – маладыя настаўнікі, якіх пасля заканчэння спецыяльных курсаў накіравалі працаваць у гэты куток Беларускай ССР на самай мяжы Мінскага раёну – за дваццаць кіламетраў ад варожай, як нам увесь час казалі, Польшчы.

Прынамсі, Польшчай мясцовы парткам упарта называў беларускія землі, забраныя па сумнавядомай дамове 1921 года.

Я спецыяльна кажу "мы". "Мы" – гэта я і мая жонка, разам з якой мы й скончылі настаўніцкія курсы. Шлюб узялі ўжо амаль напрыканцы іх, са сціплай надзеяй, што нас накіруюць працаваць разам. Нам пашчасціла – рэдкі выпадак – размеркаванне насамрэч адбылося з улікам нашага шлюбу.

Мне было дваццаць шэсць гадоў. Ёй – дваццаць чатыры.

Мяне звалі Савіцкі Максім Леанідавіч.

Яе – Савіцкая (Самусевіч) Таццяна Віктараўна.

Мы працавалі тут ужо больш за год. Я наўмысна не ўдакладняю, што гэта за "тут", не ўзгадваю назву вёскі, проста таму, што вёсак з такім лёсам дзясяткі на абшарах беларускай зямлі, і такая гісторыя магла здарыцца ў кожнай. Але аб гэтым крыху пазней.

Ішла восень тысяча дзевяцьсот трыццаць шостага года...

# Жаўнер прывіднай арміі

Станіслаў Міхайлавіч не спаў ужо колькі начэй. Не мог, не хацеў, баяўся. Апошнім часам ён баяўся кожнага груку, кожнага шоргату. Нельга сказаць, што ягоная пужлівасць не мела падставаў – не, зусім не. Яму было чаго баяцца. Ён баяўся свайго ўваскрэслага мінулага.

Страх быў з ім усе шэсцьдзесят сем гадоў, якія ён пражыў на свеце. Спачатку страх галоднай смерці – сваёй, жонкі, дзетак. Царская эпоха была бязлітаснай да такіх, як ён. Пасля бясконцы подых смерці смутных год рэвалюцый і войнаў – грамадзянскай і сусветнай, потым... Потым, пасля смерці ўсіх, дзеля каго ён яшчэ хацеў жыць, прыйшоў час ахвяравання сабой дзеля справы вольнай Беларусі. Асабісты ад'ютант генерала Езавітава, жаўнер у войску Станіслава Балаховіча, стралец збройнага чыну – менавіта ў такой паслядоўнасці ён пражыў пачатак дваццатых гадоў. Кожны новы кіраўнік лакальнай арміі ўзнікаў раптоўна і гэтак жа раптоўна знікаў, збягаў за мяжу, як толькі рабілася горача. Ён збегчы не мог. Не ўмеў, не навучылі ў дзяцінстве паказваць спіну тым, хто толькі й чакаў, каб усадзіць у яе нож. Так і кідаўся ад аднаго правадыра супраціву да іншага, нязменна расчароўваючыся ў кожным з іх. Калі ж не засталося аніводнага, ён зрабіў свой выбар. Яго схаваў цёмны беларускі лес – яго і яшчэ трох верных сяброў. Дзе яны зараз, тыя сябры? Адзін Бог можа даць адказ. Можа быць, у іх атрымалася, як у яго, выйсці з лесу праз некалькі год марнай барацьбы і пачаць новае жыццё пад новай маскай і змененым прозвішчам. Наўрад ці. Стары быў гатовы паклясціся, што ўсе яны гніюць ў зямлі з куляй у

галаве. Тая самая зямля, за якую яны ахвяравалі жыццём, прыняла іх, атуліла вечным холадам і вечным спакоем. Зямля ўмее па-свойму быць удзячнай за ахвяры.

Стары ўздыхнуў і з цяжкасцю падняўся на ногі. Пабіты імбрык пырскаў кіпнем ва ўсе бакі. Стары скрывіўся, ўзяў прыхватку і выхапіў гарбатнік з печы. Наліў кіпень у кубак, закінуў туды ж травяны збор, накрыў талеркай.

Травы ён збіраў сам – на чай ўсё роўна не было грошай. Па праўдзе, ён і не любіў чаю – ну хто ж будзе травіцца ім, калі пад рукой самыя смачныя расліны, да таго ж сабраныя сваімі рукамі? Тры гады жыцця ў лесе прымусілі яго зразумець кожны лісток роднага краю, ён заўжды мог даць каштоўную параду, якую травінку даць хвораму і які збор заварыць чалавеку са слабымі нервамі.

Нельга сказаць, што старога любілі ў вёсцы. Не тое, каб яго баяліся, не. Баяліся ягонага цёмнага мінулага. Ён ніколі не распавядаў, адкуль ён з'явіўся тут, і дзе быў дагэтуль. Савецкая ўлада навучыла падазрона ставіцца да людзей з цьмянай біяграфіяй, і, тым больш, – не мець з такімі цесных кантактаў – не доўга так дажыцца і да кулі ў патыліцу, проста так, за кампанію, за сувязь з ворагам народа.

У вакно гучна грукнуўся камень. Стары насцярожыўся. Не з-за сапраўднага страху, а так, дзеля парадку. Візіту афіцэра НКУС ён чакаў гадамі і прызвычаіўся жыць у чаканні гэтай падзеі. Стары армейскі наган узору 1898 года з шасцю баявымі патронамі, які ляжаў у шуфлядзе стала, таксама чакаў сустрэчы. Чакаў, каб апошні раз гучна сказаць сваё слова. Стары ніколі не верыў, што за ім не прыйдуць. Прыходзілі за ўсімі, і вінаватымі і бязвіннымі. Проста, мабыць, шчэ не прыйшоў час.

Трывога была дарэмнай – камень у вакно кінуў суседскі хлапчук.

Стары ўздыхнуў. Рана ці позна гэткія жарты скончацца тым, што ягонае сэрца не вытрымае і спыніцца назаўжды. Калі, канешне, раней яго не спыніць стрэл з нагана. Так ці йнакш, жыць яму засталося зусім нядоўга – зіму стары не пераЖыве – гэта ён адчуваў дакладна. Засядзеўся ён на свеце. Занадта шмат нажыў ворагаў, каб гэтак шмат жыць. Лёс падараваў яму й так досыць гадоў, і стары быў за гэта ўдзячны.

Station Станіслаў Міхайлавіч працягнуў руку за пяром і чарнілам, што стаяла на краі стала. Затым ён дастаў з шуфляды, у якой ляжаў рэвальвер, паперу, спісаную крывым незразумелым почыркам. Гэта яго тэстамент. Невядома, дзеля каго ён пісаўся, магчыма, для таго самага афіцэра НКУС, які прыйдзе за ім, а магчыма, гэтая папера трапіць у рукі да чалавека са шчырым сэрцам, які ніколі не трымаў зла на старога.

Апошні варыянт, праўда, надта малаверагодны. Не так шмат было ў старога дабразычліўцаў. Дакладней, сам ён не мог назваць аніводнага.

Тэстамент быў амаль скончаны і выпраўленняў не патрабаваў. Насамрэч, тэстаментам гэтую паперу можна было назваць з вялікай нацяжкай. Гэта больш было падобна да крыку спакутаванай душы. Усё, што не было сказана за гады жыцця, не вышаптана, не выплакана...

Па правую руку ад сябе Стары паклаў даўнюю паблёклую фотакартку. З яе ўсміхаліся стомленыя жаўнеры – стральцы асобнага атраду генерала Станіслава Булак-Балаховіча. Твары былі яшчэ досыць разборлівымі, хаця фотаздымак ён насіў пры сабе ўжо 16 гадоў. Стары знайшоў сябе, потым сваіх сяброў, з якімі разам кукаваў ў лесе. Здымак даўно трэба было знішчыць. Былы жаўнер у чарговы раз папракнуў сябе за тое, што дагэтуль не зрабіў гэтага. Карт-

ка наўпрост магла паслужыць матэрыялам для абвінавачання кагосьці з ягоных сяброў, калі такія яшчэ засталіся ў жывых. Шанцаў, канешне, было няшмат, але Стары не мог дараваць сабе нават думкі аб тым, што з-за ягонай слабасці маглі пацярпець тыя, хто праліваў кроў побач з ім.

Але рука здрадліва адмаўлялася знішчаць фотакартку. Напэўна, гэта была апошняя рэч у хаце, якая выклікала яшчэ ў душы Старога хоць нейкія сентыменты.

Рэзкім рухам рукі Стары прыбраў картку на старое месца – побач з рэвальверам.

Недзе ў грудзях зноўку закалола. Клятае сэрца... Хоць бы на дзень яно скончыла балець! Але не, не жадала. Напэўна, у гэтым былі свае плюсы. Боль у сэрцы дзень за днём нагадваў Старому, што ён яшчэ жывы і працягвае змагацца, хай невядома з кім, хай тае барацьбы нікому не бачна, магчыма, нават для самому Старому. Сэрца не давала яму забыцца, што справа няскончаная, і не мае пакуль ён – Стары – права на адпачынак.

Сёння боль быў асабліва надакучлівым – тупым і бясконцым, нібы хтосьці з садысцкай настойлівасцю тыкаў акурат у сэрца іржавым шылам.

Стары апусціў пяро ў чарніліцу і паклаў галаву на рукі. Яшчэ, яшчэ дзесяць хвілін адпачынку і ён зноўку прымецца за паперу. Толькі б супакоіўся хоць крыху гэты немагчымы боль.

Дзверы асцярожна рыпнулі. У іх прасунуўся дужы малады хлопец у галіфэ.

Ён асцярожна, але з адчуваннем уласнай перавагі, азірнуўся па баках. Заўважыў Старога, які нібы спаў за сталом, паклаўшы твар на далоні. Хлопец гучна кашлянуў. Стары не падняў твару на гук. Здавалася, што ён увогуле не чуе і працягвае спаць.

Крыху знервавана хлопец зрабіў два крокі і падкрэслена звонка шчоўкнуў абцасамі цяжкіх ботаў. Пасля гэтага ён гаркнуў голасам, прызвычаеным да камандаў:

– Станіслаў Міхайлавіч Шарэцкі!

Голас яго абсалютна не выказваў аніякіх інтанацыяў. Ён не пытаўся, а менавіта сцвярджаў сказанае.

Галава Старога варухнулася.

– Што?.. Хто тут?!

– Старшы лейтэнант Народнага Камісарыяту Унутраных Спраў Міхал Звягінцаў. Вы арыштаваныя. Папрашу сабраць вашыя рэчы і накіравацца са мной да аддзелу камісарыяту для правядзення следчых мерапрыемстваў і судовай працэдуры. Падрабязнасці будуць вам растлумачаны на месцы.

– Канешне, канешне... Скажыце толькі, ці ёсць у мяне дзве хвіліны, каб узяць самае небходнае?

– Адна. Мы не можам затрымлівацца.

Рука Старога асцярожна пацягнулася ў шуфляду. Час прыйшоў. Час, якога Стары так доўга чакаў. Вось ён, канец. Фініш жыцця з хамаватым тварам афіцэра-ГПУшніка.

Далонь лягла на рукаятку рэвальвера. Стары хуткім рухам узвёў курок.

Рэзкі шчаўчок не мог не быць пачутым лейтэнантам. Хутчэй дзякуючы рэфлексам, чым свядомай думцы, дасведчаная рука выхапіла наган з кабуры. Ззаду ў дзверы ўваліліся два НКУСаўцы з шэрагоўцаў, якія чакалі загаду камандзіра на выхадзе. У руках яны сціскалі такія ж наганы. Не было ніякіх падставаў, каб сумнявацца ў тым, што страляць яны будуць без усялякага папярэджання.

Стары стаяў пад рулямі трох рэвальвераў, яго ўласная зброя была сціснута ў руцэ, рульны выхад глядзеў у столь. Старога крыху хістала, з боку можна было б падумаць, што ён п'яны.

– Я патрабую, каб вы зараз кінулі рэвальвер на падлогу. Інакш мы вымушаныя будзем адкрыць агонь, – усё тым жа голасам, пазбаўленым эмоцыяў, сказаў лейтэнант. Здавалася, што гэтая сітуацыя ні на крок не выбіла яго з каляіны. – Я лічу да трох. Адзін... два...

– Хай жыве вольная Беларусь! – прагучаў раптам крык і ў той жа момант гучна выбухнулі ўсе чатыры рэвальверы.

Стары ляжаў на падлозе. На ягоных грудзях грудзях ярка чырванелі тры ўваходныя адтуліны. Чацвертая знаходзілася на правай скроні, але лейтэнант яе пакуль не бачыў.

– Вось жа сукін сын, – са злосцю сплюнуў адзін з НКУСаўцаў.

– А якая, па сутнасці, розніца? Усё роўна падох бы ў яме, – інтанацыя лейтэнанта не змянілася ні на кроплю. – Хопіць языкамі малоць. Падхапілі гэтага і ў машыну. У нас на чарзе яшчэ тры такіх на гэтую ноч.

Цела вынеслі. Лейтэнант тымчасам уважліва вывучыў усе дакументы, якія ляжалі на стале і ў шуфлядзе, некалькі хвілін углядаўся ў твары на фотакартцы. Потым ён схаваў ўсё гэта ў свой планшэт і хуткім крокам выйшаў з хаты.

На падлозе засталася чырванець шырокая лужына крыві – ніхто не палічыў патрэбным прыбраць яе.

Чырвоная кроў на чорнай падлозе, закіданай зямлёй з ботаў, не знікала яшчэ доўгі час. Прыйшла зіма, за ёй лета, за ім восень і зноўку зіма, а бурыя плямы так і цямнелі на грубых дошках падлогі.

Просты і самы красамоўны помнік – глядзіце, тут памёр патрыёт!

Толькі не было каму глядзець...

# Дзед Юрась

Не, Старога асабіста я не ведаў. Мы жылі хоць і ў суседніх, але дастаткова аддаленых вёсках. У раёне жылі без малога дзесяць тысяч чалавек, вядома ж, кожнага я не мог ведаць. Жыхары гэтай мясцовасці цікавілі мяне пераважна дзеля паўнавуковых этнаграфічных даследаванняў. На жаль, часу для таго, каб займацца гэтай сваёй цікавасцю у мяне не было – я адказваў за навучанне амаль пяцідзесяці дзяцей самых розных узростаў – ад сямігадовых да зусім дарослых шаснаццацігадовых юнакоў і дзяўчат.

Я не мог ведаць, якую ролю ў маім лёсе адыграў Стары і яго спадчына.

Вечар рана апускаўся на вёску ў гэтыя халодныя кастрычніцкія дні. Было толькі пяць гадзін, а слабое сонечнае святло пакрысе знікала. Яго, праўда, і так фактычна не было ўжо з месяц – цяжкія хмары закрылі ўсё неба – праз іх было не прарвацца нават самаму моцнаму, самаму жывому промню.

Ад такога надвор'я пакутвалі ўсе – і дзеці, і дарослыя. Не было чутно ні жартаў, ні смеху людзей, што прызвычаіліся шукаць у весялосці ратавання ад беспрасветных галодных будняў савецкага селяніна.

Прынамсі нас з Таняй гэтая хвароба не закранула – мы ішлі па дарозе і пасміхаліся адзін аднаму. Навокал усё падавалася нам надзвычай прыгожым, нават гэтае грознае і пахмурнае неба, нават размытая бясконцым дажджом сцежка, нават паваленыя хаты, якія даўно не ведалі гаспадарчай рукі. Нам не трэба было прыгажосці шыкоўнай, мы мелі тое што мелі – а астатняе нам давала каханне і праца, якая прыносіла задавальненне. Так бывае: наступае ў

жыцці момант, калі ўсё абрыдае і непрыгожае адыходзіць на другі план, застаецца толькі ўсмешка каханага чалавека, якая кампенсуе ўсе непрыемныя пачуцці. На жаль, часцей бывае наадварот, але кожны мусіць імкнуцца менавіта да такога стану.

Мне імкнуцца было не трэба – я меў усё, што хацеў. І дзякуй Пану Богу, што жаданні мае былі такімі сціплымі.

Вяскоўцы добразычліва віталіся з намі, на кожным кроку мы адчувалі бязмежную павагу да сябе. Канешне ж, адукаваныя, прыехалі з губернскага горада – так тут па старой звычцы звалі абласны цэнтр.

– Здароў, Максім! – пачуў я гучны басавіты голас. З-за акуратнай драўлянай брамы паглядаў на нас дужы пажылы чалавек. На выгляд яму было гадоў семдзесят, а насамрэч праз месяц мусіў сустрэць ужо дзевяты дзясятак – гады міласэрна абышлі яго, пакінуўшы і сілу, і розум. Дзед насіў доўгую – да грудзей – сівую бараду, а рукі яго, здавалася, мелі такую моц, што лёгка маглі задушыць у абдымках ляснога мядзведзя. Стары асілак да таго ж як ніхто іншы ў вёсцы ўмеў спяваць песні, якіх ведаў вялізарную колькасць, за што яго вельмі любіў навакольны люд.

Дзед Юрась – а менавіта такое было ў яго імя – заўжды быў рады даць параду, і дужа не клапаціўся, ці мае яна хоць якую небудзь практычную каштоўнасць. Дзед лічыў сябе апошняй інстанцыяй ва ўсіх пытаннях. І хоць усе ведалі, што прыслухоўвацца да прамоваў старога Юрася зусім неабавязкова, але, тым не менш, калі ў жыцці вяскоўцаў здаралася якая-небудзь непрыемнасць, усе ішлі менавіта ў гэтую хату. Бадай, каб паслухаць жыццярадасны голас, выпіць чарку дзедавай самагонкі, выліць старому сваё гора. Пасля такога візіту людзі звычайна сыходзілі дадому, ўпэўненыя ў тым, што ўсё сапраўды наладзіцца.

Часам дзед дапамагаў не толькі словамі, але і справай, калі сам бачыў, што абставіны насамрэч складаныя.

Словам, для гэтай вёскі дзед быў бясспрэчным аўтарытэтам, чалавекам, якога заўсёды прынята выслухаць і з якім варта пагадзіцца хоць на словах.

– Здароў, дзеду! – адгукнуўся я. – Як маешся?

– Спіна клятая, баліць ды баліць, і нічым яе не сцішыць, – паскардзіўся дзед. Зрабіў ён гэта, праўда, са сваёй фірмовай хітрай усмешкай на твары, з чаго можна было зрабіць выснову, што гэтым фактам ён падзяліўся з намі не столькі з-за таго, што ў яго было жаданне сапраўды пажаліцца, а таму, што яму проста хацелася паразмаўляць з намі, зацягнуць на кубак гарбаты ці самагону, у залежнасці ад таго, які настрой – лірычны ці, наадварот, іранічна-баявы быў у яго. Па ўсім было відаць, што сёння дзед быў у гуморы і проста так ад яго будзе не адбіцца. – Захадзіце да мяне, раскажыце хоць якія навіны ў свеце, а то ж ведаеце, дзед тут жыве адзін, хутка так і ногі працягне ад адзіноты.

– Ой, дзеду, каму-каму, а ўжо табе смерць ад адзіноты ніяк не пагражае, – смеючыся адказала Таня. – Калі б людзі паміралі толькі ад гэтага, гатова спрачацца, што ты б перажыў не толькі ўсю нашую вёску, але й палову краіны дакладна.

– Мілая-светлая пані! Хто ж, як не ты, можа так упэўніць у заўтрашнім дні? – засмяяўся й дзед. – Ну чаго вы, так і будзеце стаяць пад брамай, га? Запрасіў жа, заходзьце, будзеце жаданымі госцікамі. Да мяне людзі звычайна ідуць без запрашэння, калі хочуць мяне пачуць, а я час ад часу хачу сам кагосьці запрасіць, каб у гэтай хаце з'яўляліся сапраўды чаканыя людзі. – Дзед адчыніў веснічкі і прапусціў спачатку Таню, а потым і мяне. Пасля гэтага ён зноў акуратна зачыніў браму і шырокім жэстам запрасіў нас у хату.

Мы ўтрох зайшлі ў светлы пакой. Чаго-чаго, а вось гаспадарчай дбайнасці старому дакладна не бракавала. Нягледзячы на тое, што ягоная жонка памерла яшчэ ў рэвалюцыйныя гады, дзед з лёгкасцю адзін спраўляўся са ўсёй гаспадаркай, пры гэтым знаходзячы яшчэ й час, каб дапамагаць суседзям. Хата знутры была прыгожая і дагледжаная, на печы амаль у вайсковым парадку роўнымі шэрагамі стаялі патэльні, імбрыкі і заварнікі, вокны свяціліся чыста вымытым шклом, а на падлозе ляжаў хоць і просты, але акуратны і прыгожы дыван.

Стары ніколі не дазваляў сабе ні хвіліны разгубленасці, ён справядліва лічыў, што слабіна для яго будзе азначаць хуткую смерць, а паміраць ён пакуль не збіраўся. Часам складвалася ўражанне, што дзед адчувае на сабе адказнасць за кожнага жыхара гэтай вёскі. Прынамсі, нават мне падавалася, што калі раптам не стане дзеда, вёска таксама пакрысе развалiцца, знікне. Магчыма, гэта было проста песімістычнай фантазіяй, але пэўная доля верагоднасці тут была.

Дзед пасадзіў нас на ложак, які стаяў у яго побач са сталом, а сам прыняўся бегаць па хаце, збіраючы на стол посуд і простую закуску. У мяне ўжо не засталося ніякіх сумневаў, што фінальным акордам на стале з'явіцца менавіта мутнаваты напой, якім дзед частаваў самых жаданых гасцей.

Нарэшце наш добры гаспадар скончыў насіцца па пакоі і прысеў побач з намі на крэсла.

– Ну раскажыце хоць старому, як жывецца вам. Ці не трэба якая мая дапамога? Ці не крыўдзіць вас хто?

Мы пераглянуліся з Таняй і зноў ўсміхнуліся. Вядома ж, што тут проста не было каму нас крыўдзіць, жылі мы ў вёсцы, як сапраўдныя каралі, атуленыя з усіх бакоў павагай і любоўю, аб чым мы й паведамілі дзеду Юрасю.

– Вось і выдатна, – усміхнуўся дзед. – А тое ў жыцці ўсялякае ж здараецца... а раптам хто на вас нейкую злобу затоіць? Бачу-бачу па тварах, не верыце вы мне, ды й сапраўды, з-за чаго б? А я вам вось як скажу – ды проста ні з-за чаго. Альбо хоць з-за таго, што вы такія маладыя, прыгожыя, паважаныя. Ведаеце, сяляне ж цёмны народ, непісьменны збольшага. Зайдзрасць на пустым месцы для іх – нармалёвая з'ява, ніхто іх не вучыў, што зайздросціць грэх... – Дзед паглядзеў на нас сур'ёзнымі вачыма, пасля гэтага зноўку расцягнуў вусны ў шырокай усмешцы. – Вось уяві, Максім, тыдзень таму зайшоў да мяне Сашко-сусед, ты яго павінен ведаць – сынок ягоны ў цябе вучыцца. Прыйшоў, значыць, і кажа... АХ ТЫ КУРВА!!!

З-пад нагі дзеда раптам выскачыў агромністы руды кот, які яўна не чакаў нічога добрага ад свайго гаспадара. Працягваючы бурна лаяцца, дзед Юрась сцягнуў з нагі стары тапак і запусціў ім услед жывёліне. Ад пагрозы кот схаваўся пад шырокай шафай, тапак жа грукнуўся ў сцену, пасля чаго зваліўся на падлогу, акурат перад тварам кашака, які, здавалася, быў цалкам задаволены жыццём і сваім учынкам.

– Не, ну вы толькі ўявіце, якая курва! – шалеў дзед. – Узяў я яго два гады таму, маленечкім кацянём, думаў будзе мне пацукоў лавіць у хаце, як усе нармалёвыя каты, а ён! Вымахаў, пачвара гэткая, нахабны стаў – проста ратавання няма! Узяў сабе звычку: падбіраецца да маіх ног асцярожненька, а потым хваць зубамі! Гэта ён так весяліцца, значыць. Больш заняцца яму няма чым, бач ты! Паглядзіце, якая морда задаволеная! У, ты, халера скурвелая! – прыгразіў дзед кулаком у бок шафы.

– Слухай, дзеду, а дзе ты такой лаянцы навучыўся? Апроч як ад цябе я ў вёсцы больш нідзе такой не чуў, – не вытрымаў я.

– Эээ, Максім, – стары зноўку ўсміхнуўся. – Я ж такі чалавек... Шмат усяго ўва мне намяшана. Маці-та мая сапраўдная ўкраінка, маларoска, як зараз бальшавікі завуцьё і як раней царскія начальнікі звалі. А вось бацька – натуральны паляк, нарадзіўся, значыцца, у польскай вёсцы Віскідкі, што пад Варшавай. Добры ён чалавек быў, бацька-та. Шмат чаго пра Радзіму сваю мне распавядаў, калі я дзіцёнкам быў. І пра жыццё польскае і пра гісторыю іх. І пра касцёл у Віскідках, куды ён яшчэ малым хадзіў кожную нядзелю. Стары, казаў, касцёл, нават старажытны, я зараз забыўся-та, якога стагоддзя, ніколі я гэтыя стагоддзі не ўмеў у памяці трымаць, я ж чалавек просты. Усё бацька хацеў нас з маці да сябе забраць у Польшчу – мы тады пад Ільвовам жылі. Хацеў ён, значыцца, хацеў, ды узяў і памёр раптам. Мне тады дзесяць гадоў было, як зараз памятаю, плакала маці моцна. Прыгожая яна была, мая маці, як сапраўдная паненка, дарам, што з сялян. Такіх прыгожых зараз-та і не засталося на свеце, можа толькі ты, пані Таццянка, прыгажэйшая. І бацьку яна любіла вельмі.

Прынамсі ад яго я й навучыўся гэтай лаянцы. Татка-та заўжды, калі быў чымсьці дужа незадаволены, ўсё “курва” ды “скурвелы” казаў. Мне ён, праўда, забараняў таксама так казаць; памятаю, было мне гадоў сем – ну дурань-дурнем яшчэ. Сеў на асу, яна, натуральна, мяне й цапнула. Я ў плач, ды ў крык, бягу да бацькі, раву: “Тата, там нейкая курва мяне ўкусіла!”. А бацька-та як пачуў, дык не толькі не пашкадаваў мяне, а яшчэ й па дупе дадаў сваёй бацькоўскай рукой, каб не паўтараў за ім тое, што не трэба. Дрэнны, праўда, з бацькі настаўнік быў, так я на ўсё жыццё і прызвычаіўся па-польску лаяцца. Зараз усе здзіўляюцца, як ты. Толькі, ведаеш, Максім, не ўсім я распавядаю гэта, як табе з Танечкай. Не любяць, ой, не любяць – дзед перай-

шоў на шэпт, – бальшавікі палякаў, хоць плач. Кожны, хто польскія карані мае, для іх нібы вораг. Ну нельга ж так жыць, Максім, нельга, калі з усіх бакоў ворагі падаюцца. – Дзед цяжка ўздыхнуў і зноўку загаварыў сваім звычайным гучным голасам. – Давай, Максім, яшчэ табе крыху свайго напою налью, такі ніхто ва ўсім раёне не ўмее рабіць!

Я засмяяўся.

– Так, дзеду, такі дакладна ніхто не ўмее, нездарма ж да тваёй хаты людзі так і цягнуцца! Ну, добра, налі яшчэ, толькі самую крышачку, бо жонка мая лаяцца будзе.

Дзед недаверліва паглядзеў на Таню.

– Паненачка Таня? Будзе лаяцца? Ды кінь ты, Максімка, жонка твая – анёльчык, самы натуральны анёльчык, не ўмее яна лаяцца, на што заўгодна спрачацца гатовы. Так, Таццянка?

Таня таксама пачала смяяцца.

– Ой, дзеду Юрась, мяне вы захваліце, а мужа майго спаіце, дакладна вам кажу! Хто ж пасля гэтага будзе настаўнічаць тут?

– Не, мая даражэнькая, такіх, як вы, немагчыма сапсаваць! – дзед раптам зрабіўся сур'ёзным. – Шмат я бачыў людзей на сваім шляху, Таня, і добрых і дрэнных, і разумных і дурных. Ды толькі вы іншыя. Я нават бачу святло, якое ад вас зыходзіць – душы гэта вашы свецяцца. А ведаеце, чаму? У звычайных людзей так не бывае. А ў вас, мала таго, што самі вы светлыя, яшчэ й шчасце ёсць. Такіх людзей, Танечка, здалёк бачна: ідуць яны па жыцці і свецяцца, нібы душы сваі дораць усім навакольным. І не захвальваю я вас, бо ведаю, што вы сціплыя занадта, каб вас захваліць. Ведаеш, іншым я б пажадаў заўсёды заставацца ў жыцці такімі ж, вам не жадаю. Проста з-за таго, што ведаю, вы й так не зменіцеся ніколі...

Дзедаў кот мякка скокнуў на ложак, на якім сядзелі мы з Таняй. Без усялякіх цырымоніяў ён забраўся на жончыны калені і завуркатаў, нібы паказваў, што вось, маўляў, ён тут і гатовы прыняць ад яе сеанс пагладжванняў і пачэсванняў за вухам. Таня ласкава ўсміхнулася і паклала рукі на мяккую поўсць.

Стары цяжка падняўся з-за стала.

– Пайшлі, Максімка, я папалю... Ты з намі пойдзеш, Танюшка?

– Не, дзеду, не пайду. Не хачу тваю жывёліну зганяць.

– Жывёліна гэтая мая зусім сорам страціла, – забурчэў стары. – Выгнаць яго ўжо даўно трэба за такія паводзіны...

Гэтак дзед працягваў бурчэць ўвесь час, пакуль мы не выйшлі з хаты. На ганку дзед скруціў тонкую папяроску і запаліў.

– Ведаеш, Масім, жыву адзін, здавалася б, чаму не паліць у хаце? А вось не магу, не дазваляе сумленне. Нібыта жонка мая жывая, не выносіла яна папяроснага дыму, сынку... Я, як калісьці ўзяў сабе за правіла не паліць у хаце тады, амаль пяцьдзесят год таму, так і не адступаюся ад яго. Звычка...

– Усім бы такія звычкі, дзеду, – усміхнуўся я.

– Не, Максімка, усім не трэба. Па-першае, усім лепш увогуле не паліць. Але, паколькі гэта немагчыма, трэба ўлічыць той факт, што людзі з дурнымі звычкамі таксама неабходныя ў жыцці, бо калі не будзе дурных звычак – не стане ў прыродзе й добрых, так гэтая самая прырода прыдумана Панам Богам... – Стары глыбока зацягнуўся і працягнуў размову. – Бацька мой, Максімка, той самы паляк, каталіком ён быў. Веру каталіцкую ў душы трымаў і бараніў яе ад усяго свету. Крыжык ягоны дагэтуль у мяне ляжыць, ён мне яго падараваў на мой дзявяты дзень нараджэння. Ад

яго я таксама ў Бога верыць стаў, хоць і не так упэўнена, як ён...

– Дзеду Юрась, а калі ты ў Беларусь прыехаў?

– О, сынку, я сюды прыехаў у час першае рэвалюцыі ў Петраградзе, пяты год то быў... Ці не рэвалюцыяй гэта зараз бальшавікі клічуць, га? Заблытаўся я ў гэтых азначэннях... Ды не ў тым справа. Голадна нам было на роднай Украіне, сынку, вельмі голадна. Нашыя мясціны тады, не пад Расіяй, праўда, былі, пад Аўстрыяй, але нам, люду простаму, ад таго не лягчэй было зусім. Як паміралі з голаду тады, так і зараз паміраем... Верыш, Максімка, як цяжка было нам з жонкай з'ехаць адтуль! Нават не з-за перашкодаў ўсіх – збеглі мы па-сутнасці з гэтай Аўстрыі. Цяжка з-за таго, што было нам тады шмат гадоў – я на шосты дзясятак пайшоў, жонка мая сарака двух год ад нараджэння была... Вось і ўяві сабе, як у такім узросце адважыцца на невядомае. Але адважыліся, проста з-за таго, што не было іншага выйсця, толькі галодная смерць.

Але, дзякуй Пану Богу, абышлося, аселі тут, гаспадарку нейкую завялі... Пан Бог-та мяне сілай не пакрыўдзіў, і пасля пятага дзясятка я з усім спраўляўся, ды й зараз спраўляюся, як бачыш. Але не з-за гэтага ўсё атрымалася. Ты б толькі ведаў, сынку, колькі разоў у мяне рукі апускаліся, кінуць усё хацелася, не верыў я, што пражывём мы. І толькі адно мяне ратавала – усмешка жонкі маёй даражэнькай... Я калі яе бачыў, прымушаў сябе далей працаваць, і разам з ёй усміхацца. Бо жыва я сабе ўяўляў, што калі здамся я, жоначка мая адна не пражыве. Так і жыў...

Вы мне, дзіцяткі, вельмі моцна падабаецеся. Ты мне, Максім, нагадваеш мяне самога пяцьдзесят год таму, а Танечка твая – маю Аксанку. Проста гляджу я на вас і сябе з ёй бачу. І нават слёзы ў мяне, Максімка на твары з'яўляюц-

ца, толькі вы іх не бачыце, бо не хачу я, каб вы іх бачылі. Не павінен, сынку, ніхто мужыцкіх слёз бачыць, бо калі мужык плача, значыць ён здаўся. А здавацца мужыку ніколі нельга, бо на ім усё трымаецца ў жыцці, – стары кінуў папяросу ў спецыяльную сметніцу, якая стаяла ў яго тут жа, акурат для такіх выпадкаў, і паглядзеў кудысьці ў бок лесу.

– А потым аказалася, што тут ніяк не лепш, чым было там, ва Украіне... Толькі мы тут умацаваліся, як пайшлопаехала ўсё... чые толькі па гэтай зямлі боты не хадзілі: і палякі, і рускія, і немцы, і паўстанцы-беларусы... шмат каго бачыла гэтая зямля. Шмат каго бачыла і шмат каго трывала. Трывала і аддавала нам апошняе, што магла аддаць. Ды толькі скончыліся і яе сілы. Памерла мая Аксанка ад голаду і хваробы ў васемнаццатым годзе, памерла і нічога я зрабіць не змог. З тых пор я люта ненавіджу ўсіх, хто зброяй дзвініць. Яны, яны, Максімка, адабралі ў нас апошні хлеб і апошнюю надзею. Усе гэтыя жаўнеры розных арміяў, якія толькі можна сабе памысліць.

Ззаду ціха падышла Таня. Яна таксама ўважліва слухала дзеда, а дзед працягваў, не заўважаючы яе:

– Вось тады толькі, Максімка, маё жыццё спынілася пасапраўднаму. Гэта зараз я так, па звычцы існую. Менавіта не жыву, а існую. Бо з апошнім подыхам Аксанкі маёй і мая душа нібыта адляцела, – дзед зноўку спыніўся, каб скруціць яшчэ адну цыгарку. – Ты беражы яе, чуеш, сынку, беражы і барані! Калі прыйдзецца цела сваё за яе пакласці, ды што там цела – душу аддаць – не сумнявайся ні хвіліны! Бо нельга так жыць без кахання, вер мне, нельга. Я-та гэта разумею, як ніхто іншы.

Дзед змоўк, потым павярнуў твар да нас. Заўважыўшы, што Таня стаіць побач, Стары засмучана гэкнуў і з незадаволеным выглядам зноўку адвярнуўся да лесу.

З хвіліну мы стаялі так, без аніводнага гуку, нікому не хацелася парушаць цішыню.

Раптам дзед зноўку скіраваў на нас свой позірк.

– А хочаш, Танечка, я вам спяю?

– Хачу, дзеду, – ціха адказала Таня.

– Гэта старая песня. Яшчэ маці мая яе спявала, мне тады гадоў пятнаццаць было. Людзі казалі, што яе напісаў нейкі паэт украінскі, толькі не ведаю я імя ягонага...

Стары на хвілінку замоўк, глыбока ўздыхнуў і заспяваў:

Ніч яка, Господи! Місячна, зоряна:
Ясно, хоч голки збирай...
Вийди, коханая, працею зморена,
Хоч на хвилиночку в гай!
Сядем укупі ми тут під калиною –
І над панами я пан...
Глянь, моя рибонько, – срібною хвилею
Стелеться полем туман;
Гай чарівний, ніби променем всипаний,
Чи загадався, чи спить?
Он на стрункій та високій осичині
Листя пестливо тремтить;
Небо незміряне всипано зорями –
Що то за Божа краса!
Перлами-зорями теж під тополями
Грає перлиста роса.
Ти не лякайся-но, що свої ніженьки
Вмочиш в холодну росу:
Я тебе, вірная, аж до хатиноньки
Сам на руках однесу.
Ти не лякайсь, а що змерзнеш, лебедонько:
Тепло – ні вітру, ні хмар...

Я пригорну тебе до свого серденька,
Й займеться зразу, мов жар;
Ти не лякайсь, аби тут та підслухали
Тиху розмову твою:
Нічка поклала всіх, соном окутала –
Ані шелесне в гаю!
Сплять вороги твої, знуджені працею,
Нас не сполоха їх сміх...
Чи ж нам, окривдженим долею клятою,
Й хвиля кохання – за гріх?[1]

Таня, чамусьці, плакала. Я адчуваў сябе быццам бы раптам пасталеў гадоў на трыццаць.

– Ну, пані Таня, не трэба плакаць, – дзед Юрась асцярожна паклаў руку на яе галаву. – Вось дурань стары...

Таццянка, не кажучы ні слова, абхапіла рукамі магутную шыю старога і з ўсіх сіл прыціснула яго да сябе.

– Не, дзеду, гэта вы мяне прабачце. Развяла тут багну...

Стары ўсміхнуўся.

– Хадземце, вярнемся ў хату, халодна тут неяк...

Самагон дзед Юрась прыбраў, затое на стале з'явіліся кубкі, у якіх, разносячы прыемны пах па ўсёй хаце, настойвалася гарбата.

З дазвалення старога, Таня скінула абутак і забралася на ложак з нагамі. Яна сядзела, нібы схаваўшыся ад усяго свету за маёй спінай, паклаўшы рукі мне на плечы і асцярожна дыхаючы ў мае валасы.

Стары сядзеў, моўчкі паглядаючы на нас. Раз-пораз яго вусны кранала лёгкая ўсмешка, ён задумаўся аб чымсьці сваім.

---

[1] Міхал Пятровіч Старыцкі, "Виклик", 1870

За вакном стала зусім цёмна, вечар надышоў непрыкметна, на падыходзе была ўжо ранняя кастрычніцкая ноч.

– Нам час збірацца, дзеду, – парушыў я маўчанне.

– Пасядзіце яшчэ паўгадзінкі, – папрасіў дзед. – Мне з вамі вельмі прыемна. Ведаеце, як пагана заставацца кожную ноч аднаму ў цёмнай хаце? Адчуваеш, нібыта ты усімі кінуты. А вы... вы, дзіцяткі, мне амаль родныя ўжо, хоць я вас толькі паўгады ведаю, – стары пляснуў далоннюю сабе па галаве. – Зусім забыўся. Я як адчуваў, што ў мяне сёння госцікі будуць. Вось, напёк... Як вечар пачаў надыходзіць, дык я думаў ужо, што дарэмна, самому прыйдзецца ўсё есці, а тут як раз вы з'явіліся, – ён палез у печку і выцягнуў адтуль талерку з піражкамі. – Вось, пані Танечка, для вас. Вы яблычкі любіце? Са сваёй яблынькі апошняй. Абы каго častаваць не стаў бы – для звычайных гасцей у мяне самагонка ёсць, ім хапае – ніякіх піражкоў не трэба. А вось вас, мілая, я з агромністай радасцю пачастую. Бярыце, бярыце, з гарбаткай-та! Смачна? – спытаўся ён з надзеяй.

– Вельмі! – пахваліла Таня. Піражкі сапраўды былі вельмі смачныя, я сам не заўважыў, як з'еў адзін, потым другі... Хацеў было ўжо цягнуцца за трэцім, ды раптам стала неяк няёмка.

Дзед засмяяўся.

– Ну што ж ты, Максімка? Бяры, бяры яшчэ, я шмат напек!

Заліўшыся фарбай, я ўзяў чарговы піражок. Дзед задаволены назіраў за мной.

Гадзіннік паказваў адзінаццаць. Далей затрымлівацца было не варта, нам яшчэ трэба было ісці амаль з кіламетр дадому. Стары прапанаваў нас правесці, але мы, падзякаваўшы яму за клопат, адмовіліся. Не варта было злоўжываць дабрынёй дзеда.

На развітанне дзед Юрась падаў мне некалькі піражкоў, акуратна загорнутых у невялікі ручнічок.

– Гэта вам з раніцы пачаставацца. Заняткі-та ў школе будуць заўтра?

– Так, дзеду, канешне. Заўтра панядзелак, – адказала Таня. – Дзякуй вам вялікі за пачастунак! І вы да нас таксама заходзьце. Такіх піражкоў, дзеду, я рабіць не ўмею, на жаль, але ж паспрабую, каб і вы засталіся задаволены нашым пачастункам!

Дзед падзякаваў і выйшаў да брамы, каб развітацца з намі.

Мы адышлі ўжо амаль на сто крокаў, калі я азірнуўся. Стары так і стаяў ля брамы і глядзеў нам услед. Я азіраўся яшчэ некалькі разоў, пакуль фігурка дзеда Юрася і ягоная хата не зніклі ў цемры.

# Маёр Раманаў

У школу Таня з раніцы не пайшла. З вялікай цяжкасцю ў мяне атрымалася абудзіць яе а сёмай гадзіне – у час, калі яна звычайна ўжо сама падымалася і рыхтавала нам двaім сняданак. Адчувала яна сябе вельмі дрэнна: шчокі ў яе палалі, а ў вачах быў характэрны хворы бляск. Учарашні шпацыр пад начным дажджом відавочна не прайшоў без наступстваў.

Я прыклаў руку да яе ілба, пасля чаго сказаў, што нікуды яе з дому не выпушчу. Спачатку яна спрабавала спрачацца, але потым сама зразумела, што ледзьве можа ўстаць на ногі, не тое што дайсці да школы і прабыць там некалькі гадзін.

Я хутка паснедаў дзедавымі піражкамі з малаком, пасля чаго цёпла апрануўся і выйшаў з хаты, загадаўшы Тані нікуды не сыходзіць і чакаць майго вяртання, не ўстаючы з ложку. Перад гэтым я распаліў полымя ў печы і паставіў у яе рондаль з малаком.

Шлях да школы займаў звычайна хвілін дзесяць. Дарога была ўся размыта дажджамі і ісці было даволі складана.

Палова на восьмую – гэта час, калі вёска і яе жыхары ўжо паўтары гадзіны як працуюць на калгаснай гаспадарцы. Па дарозе я амаль нікога не сустрэў – усе былі занятыя справай. Я чамусьці адчуваў сябе няёмка з-за таго, што магу сабе дазволіць прачынацца а сёмай, а не а пятай, як большасць вяскоўцаў. Праўда, я мог суцяшаць сябе тым, што працоўны дзень селяніна сканчаецца з наступленнем цемры, якая рана апускалася на вёску ўвосень, мой жа працоўны дзень быў ненармаваны – спачатку я быў на занятках у школе, потым займаўся арганізацыйнай працай з дакументамі і правяраў сшыткі. Часам гэтая праца сканчалася ўжо

пасля дванаццатай ночы, таму я мог сабе дазволіць гэтую палёгку ў дзве дадатковыя гадзіны сну.

Заняткі ў школе пачыналіся а восьмай – збольшага праз тое, што дзецям з навакольных вёсак трэба было па паўтары-дзве гадзіны, а то й больш, каб дабрацца да месца. Я шкадаваў іх і мне было цяжка зразумець, як можна дазволіць сабе марнаваць некалькі гадзін на дзень толькі на дарогу, але іншага выйсця не было, зразумела, што ніякага транспартнага злучэння паміж вёскамі фактычна не існавала. Заставалася толькі радавацца таму, што дарогі пакуль былі годнымі для таго, каб па іх ісці пешшу, без асаблівай небяспекі патануць у багне.

Сёння я спазніўся на заняткі, напэўна, у першы раз, за ўвесь час, як я працаваў настаўнікам – турботы з захварэлай Таняй аднялі ў мяне дваццаць хвілін часу. Пад дзвярамі сабраўся ўжо досыць вялікі натоўп вучняў, як маіх, так і тых, у якіх настаўнічала Таня. Выбачыўшыся за спазненне, я паведаміў, што Таццяна Віктараўна сёння не можа прыйсці, бо вельмі моцна хварэе. Па тварах дзяцей я не мог зразумець, чаго ў іх больш – шкадавання сваёй настаўніцы, якую дзеці вельмі любілі, альбо радасці, што заняткаў для іх сёння хутчэй за ўсё не будзе. Гэтыя дыяметральна супрацьлеглыя эмоцыі адначасова спалучаліся ў дзіцячых вачах.

Я ўздыхнуў і з адмысловым жалем у голасе сказаў, што вымушаны адпусціць дадому тых, хто навучаецца ў Тані. Толькі самых маленькіх я вырашыў пакінуць у школе, каб яны не міналі дома бацькам.

Дзіцячы натоўп адразу разбіўся на дзве групы: з аднаго боку тыя, хто з сумным ад неабходнасці правесці некалькі гадзін у школе выглядам пацягнуліся праз дзверы ў класны пакой, і тыя, якія з вясёлымі крыкамі накіраваліся ледзве не бегам дадому.

Прайшло каля трох гадзін. Я займаўся з самымі малодшымі дзеткамі – каля дошкі стаяў сямігадовы Ясік і напружана ўспамінаў, як пішуцца літары "я" ды "ў". Хлопчык толькі пачаў вучыцца – у школу ён хадзіў крыху менш за два месяцы. Ясік быў сынам кіраўніка раённага парткама. Гэты светлы хлопчык смешна хмурыўся і адчайна чырванеў, але ўспомніць тое, што я ад яго патрабаваў, ніяк не мог.

Дзве хвіліны я з лёгкай усмешкай назіраў за Ясем. Потым я вырашыў, што не варта больш катаваць беднае дзіця і дазволіў яму сесці на сваё месца.

– Заўтра, Ясь, ты павінен прынесці мне сшытак з дамашняй работай. Кожную літару, якую ты сёння не ўспомніў, напішы прописам на паўстаронкі. Пішы акуратна ды ўважліва, бо інакш я прымушу цябе зноўку перапісаць усё.

Чырвоны, як рак, хлапчук пачаў хутка ківаць мне сваёй белабрысай галавою. Яму было вельмі сорамна ад таго, што ён расчараваў мяне. Да таго ж ён вельмі хваляваўся, што я раскажу ўсё ягонаму бацьку – чалавеку жорсткаму, хоць і не пазбаўленаму пачуцця справядлівасці.

Я б не стаў расказваць. Я ніколі не рабіў так, бо лічыў, што ўсё, што адбываецца ў будынку школы, тычыцца толькі маіх вучняў і мяне.

Нечакана ў дзверы пагрукалі. Даволі асцярожна, але з упэўненасцю. У клас ўвайшоў высокі чалавек у форме афіцэра НКУС. На выгляд яму было гадоў сорак, можа крыху нават меней. Чалавек быў высокі і з добрай выпраўкай – яна адчувалася нават пры тым, што ён стараўся трымацца як мага больш вольна. Ягоныя блакітныя вочы аббеглі дзяцей, потым спыніліся на мне. Твар быў досыць строгім, але гэтую строгасць псавалі (альбо наадварот?) нейкія дзіцячыя ямачкі на шчоках, якія надавалі твару добрыя рысы.

Я падняўся з крэсла, на якім сядзеў побач з купкай ста-

рэйшых вучняў і падышоў да дзвярэй, каб павітаць візітоўцу.

– Маёр Віктар Леанідавіч Раманаў, Камісарыят Унутраных Спраў, – прадставіўся той і працягнуў мне руку. Я пяціснуў яе і таксама назваў сябе. Маёр кіўнуў і, нібы пытаючыся дазволу, паказаў вачыма на месца за маім сталом.

– Так, канешне, прашу сядаць, – нельга казаць, каб я быў рады госцю з гэтага ведамства ў маёй школе, але ніякага жадання псаваць адносіны з Камісарыятам я не меў.

Я падцягнуў да стала другое крэсла і сеў побач з афіцэрам. У класе стала ціха; нягледзячы на тое, што ва ўсіх вучняў было заданне, зараз яны з асцярожнай цікавасцю назіралі за мной і маім госцем. Але я адразу вырашыў, што ім не варта слухаць нашыя размовы.

– Прашу ўсіх вяртацца да працы. Праз дзесяць хвілін я падыду да ўсіх і праверу што вы паспелі зрабіць, – самым строгім голасам, на які быў здольны, сказаў я. Па класе пракаціўся цяжкі ўздых і дзеці паціху пачалі вяртацца да сваёй працы.

– Можа гарбаты? – асцярожна прапанаваў я.

– Дзякуй, не адмоўлюся, – дабрадушна ўсміхнуўся афіцэр. Не магу сказаць чаму, але ягоныя паводзіны выклікалі прыхільнасць і мая насцярожанасць пакрысе пачала знікаць.

У школе стаяла буржуйка, каб дзеці не замёрзлі ўзімку. На ёй жа я час ад часу заварваў гарбату – для сябе і дзяцей, калі было зусім холадна. Я наліў у заварнік трохі вады і паставіў яе на агонь.

– Чым абавязаны?

– Ды як вам сказаць... Ёсць у мяне да вас невялічкая справа, але аб ёй потым. Наколькі я ведаю, вы не так даўно тут?

– Адносна нядаўна. Крыху больш за паўгады.

– А што здарылася з папярэднім настаўнікам? Вы мяне прабачце, што задаю шмат пытанняў – прафесія такая, – з нейкай вінаватай усмешкай апраўдаўся ён. – Не здзіўляйцеся, што не ведаю, я сам не так даўно на гэтай пасадзе, прыслалі са Смаленска...

– Ну што вы! – заўсміхаўся й я. – Хіба ж тут ёсць штосьці, што можна было б хаваць? Мой папярэднік проста па ўзросце ўжо не спраўляўся са сваімі абавязкамі. Яму далёка за семдзесят, ды са здароўем у яго вялікія праблемы, наколькі я ведаю...

– Ах вось яно што... Дарэчы, мне казалі, што вы працуеце не адзін – разам з жонкай, так?

Я пацвердзіў.

– Гэта, канешне, добрае рашэнне, даслаць яшчэ аднаго настаўніка... Дзетак апошнія два гады стала куды больш у школку хадзіць, адзін бы вы дакладна не здолелі б за ўсімі дагледзець. Толькі дзе ж яна, жонка вашая?

– На жаль, захварэла. Сёння ёй было вельмі дрэнна, не магла нават з ложка падняцца. Прыйшлося ёй застацца дома. Ведаеце, слабое здароўе ў маёй Таццянкі.

– Гэта вельмі непрыемна. Я пра задроўе, канешне, а не пра тое, што яе няма, вы не падумайце. А вось імя вельмі прыгожае, маё любімае. Беражыце жонку. Пакуль не ачуняе, не пускайце на працу, бо тут вельмі лёгка зусім здароўе згубіць, самі ж разумееце.

Нягледзячы на тое, што гэты чалавек прадстаўляў установу, назву якой народ вымаўляў толькі шэптам, ён пачынаў мне падабацца ўсё больш ды больш. Ягоны адкрыты позірк і добрыя словы абудзілі давер да яго. Але я вырашыў для сабе пакуль не рабіць хуткіх высноў і паспрабаваць пазнаёміцца з ім крыху бліжэй.

Тым часам мой візітоўца працягваў размову.

– Скажыце, можа вам што патрэбна тут? Калі што, толькі дайце мне даведацца, магчымасцяў у мяне шмат, адразу здабуду неабходнае. Каму-каму, а для настаўніка нічога не шкада. Усё ж-такі нашых дзетак вучыце – будучыню краіны.

Я адважыўся на пытанне.

– Скажыце, а якая ў вас пасада?

Мой суразмоўца схапіўся.

– Хіба я не сказаў адразу? Я ўзначальваю мясцовы аддзел Камісарыяту.

Вось дык нумар! Мой новы знаёмы – кіраўнік аддзелу НКУС. Не тое, каб я быў вельмі рады такому сяброўству, але ж і адмаўляцца ад яго я не спяшаўся – з такімі сувязямі можна было нічога не баяцца.

– Дык вось, вернемся да той самай маленькай справы, аб якой я казаў напачатку нашай размовы.

Я крыху напружыўся.

– Слухаю вас.

– Ёсць у мяне дачушка, Валя, дзевяць гадоў ёй. Ведаеце, першапачаткова мяне павінны былі накіраваць на працу ў Віцебск, а потым нечакана перакінулі сюды. Мы тут толькі месяц, жонкі ў мяне няма, а сам я вельмі заняты... Вось толькі зараз час знайшоўся, каб з вамі паразмаўляць. Не прымеце дачушачку маю ў сваю школку? У Віцебску ў мяне сувязі ёсць, там я ўжо ўсё зрабіў, і ў школку дзіцятка маё вызначыў, а вось бач ты, як ўсё склалася...

Мая напружанасць адразу знікла і я ўсміхнуўся.

– Канешне ж, прыводзьце вашу Валю, прымем яе. Заўтра зможаце прывесці?

– Сам не змагу, прашу зразумець – справы. Але хтосьці з маіх падначаленых яе прывядзе – сама яна дарогі не ведае. Нічога, калі не сам прывяду?

– Не, нічога страшнага, афармлю яе са словаў вашага пасыльнага.

– Ну вось і дзякуй вам! А то я ўжо хваляваўся, што прыйдзецца тэрміновымі справамі ахвяраваць.

Тым часам закіпела вада і я наліў два кубкі гарбаты. Маёр піў яе з нейкім дзіцячым задавальненнем на твары. Напэўна ён даўно ўжо не частаваўся гарбатай так, не ў службовым кабінеце і не спяшаючыся па справах.

Мы крыху паразмаўлялі яшчэ пра тое, як нам з Таней жывецца ў вёсцы, абмеркавалі надзённыя праблемы вяскоўцаў, я распавёў майму суразмоўцу пра тое, што спатрэбіцца ягонай дачцэ ў школе. Неўзабаве маёр падняўся.

– Дзякуй вялікі за гарбату, на жаль, час мне бегчы. Не праводзіце да выхаду?

Я пагадзіўся і мы разам выйшлі з класа.

У дзвярах маёр падаў мне руку і, пацiснуўшы яе, сабраўся ўжо выйсці на вуліцу, як раптам нібыта ўспомніў яшчэ штосьці.

– Мне, шчыра кажучы, няёмка пытацца ў вас аб гэтым, але прашу зразумець – службовая неабходнасць... Калі не памыляюся, вучыцца ў вас такі хлопчык, Ясь Самахвалаў, так?

Я пацвердзіў.

– Дык вось, бацька ягоны... партыйны кіраўнік мясцовы, вы ж, напэўна ведаеце?

Я зноўку кіўнуў.

– Паўтаруся, мне няёмка пытацца аб гэтым, я разумею, дзеці, ды ўсё такое... Ясь нічога не распавядаў пра бацьку? Можа, калісьці словы ягоныя пераказваў, ці яшчэ што?

Размова мне адразу перастала падабацца. Але я быў зусім не здзіўлены, ад візіту афіцэра НКУС я, у прынцыпе, чагосьці такога й чакаў.

Я рашуча заматаў галавою.

– Не, не казаў нічога. Прабачце мне маю цікавасць, а ў чым справа, калі гэта, канешне, не тайна?

– Ды так... Ёсць у Камісарыята пэўныя прэтэнзіі да Ясевага бацькі. Вельмі вас прашу, нікому не распавядаць пра гэтае пытанне, добра?

– Зразумела, – адказаў я.

– Вось і дзякуй за разуменне. І яшчэ раз прабачце, што з такімі пытаннямі да вас у школу прыйшоў. Усяго найлепшага.

Ён развярнуўся і хуткім крокам пайшоў па сцежцы, якая вяла ад школы на галоўную вуліцу вёскі.

Я стаяў і разгублена глядзеў яму ўслед. Нягледзячы на гэтую размову, маёр мне падабаўся. Было добра бачна, што яму вельмі не хочацца задаваць мне гэтыя пытанні, ён з павагай ставіўся і да мяне і да школьных сценаў, але праца ўсё ж была вышэй.

Мне было вельмі цікава, як з такім сумленнем гэты чалавек трапіў на пасаду кіраўніка аддзелу Камісарыяту Унутраных Спраў. Можа, гэта быў проста такі стэрыятып, але мне падавалася, што там працуюць зусім іншыя людзі.

Я ў задуменні вярнуўся ў класу. Канешне ж, пакуль мяне не было некалькі хвілін, дзеці паднялі шум і зусім не займаліся справай, якую я ім даручыў. Тым не менш, як толькі адчыніліся дзверы і я ўвайшоў у класу, адразу зноўку стала ціха. Бедлам, які тут быў хвіліну таму, выдавалі толькі чырвоныя твары маіх вучняў. Зараз жа дзіцячыя вочы, як адзін, аддана глядзелі на мяне, хоць ў іх яшчэ блішчалі гарэзлівыя іскрынкі.

Праз чатыры гадзіны я зачыніў дзверы школы і паціху пайшоў дадому. З маёй галавы ніяк не ішоў сённяшні візіт Раманава. Па праўдзе, мне няма ў чым было асабіста віна-

ваціць камісарыят, але ўсё ж я троху баяўся гэтай установы. НКУС у народзе сапраўды паважалі і баяліся. Ніхто не ведаў, дзе межы магчымасцяў яго супрацоўнікаў, але ні ў каго не выклікаў сумненняў той факт, што лепш ніколі не станавіцца ў іх на дарозе.

На вуліцы зусім сцямнела. Я асцярожна прабіраўся паміж лужынаў, якія пакрывалі ўсю шырыню дарогі. Пару разоў мне не пашанцавала і я-такі ўступіў у халодную ваду. Натуральна, настрой мне гэта не падняло, але ходу я прыбавіў. Хацелася аднаго – дайсці дадому і ўрэшце рэшт сагрэцца ля гарачай печкі, паставіць сушыцца мокрыя боты.

Але больш за ўсё мне хацелася ўбачыць Таню.

Міма мяне з грукатам праехала ў напрамку выезду з вёскі вялікая чорная машына. Я бачыў такія і раней, але даволі рэдка. Машына была не грузавой, але й не пасажырскай. Шырокі чорны кузаў ня меў аніводнага вакенца, таму заставалася толькі здагадвацца, што мог везці такі борт. Напэўна, я б і не зацікавіўся зусім гэтай машынай, каб не той факт, што ехала яна не ў бок горада, а наадварот – у накірунку выезду да лесу. Туды ішла зусім дрэнная сцежка, я ведаў, што яна вяла ўздоўж лесу да глухой вёсачкі, якая месцілася прыкладна за дзесяць кіламетраў ад нашага райцэнтру. Што забыўся кіроўца на гэтай дарозе? Мне падумалася, што ён, верагодна, проста пераблытаў дарогу.

З задумлівасці мяне вывеў струмень халоднай вады і бруду, што вылецеў з-пад колаў машыны і абдаў мяне па самую шыю. І без таго не лепшы настрой у мяне зусім сапсаваўся, і я, лаючыся пра сябе на няўважлівага кіроўцу, пачаў далонямі счышчаць з сябе бруднае месіва, якое прыліпла да вопраткі. Калі ж больш-менш ачысціў старую куртку і штаны, я падняў галаву – машына ўжо схавалася за паваротам ля лесу.

Я вырашыў, што хопіць займаць свой розум непатрэбнымі думкамі і зноўку пашыбаваў ў накірунку свайго дому.

Свет у хаце не гарэў, таму я ціхенька скінуў на ганку боты і зазірнуў у пакой. Таня спала на ложку, па-дзіцячы падклаўшы пад галаву далоні. Насуперак кепскаму настрою я ўсміхнуўся, потым выйшаў, каб прынесці крыху дроваў і распаліць печку – у хаце адчувальна халадала. З ранку, калі я тапіў печку апошні раз, усё цяпло паспела выйсці, і зараз паветра ў памяшканні было не нашмат цяплейшым, чым на ганку.

Сухія бярозавыя паленні я склаў ля печкі, спрабуючы рабіць як мага менш шуму. Потым я запаліў агонь і ўжо праз дзесяць хвілін языкі полымя весела аблізвалі дрэва.

Я паставіў грэцца імбрык і сеў за стол. Святло запальваць я не хацеў, каб не абудзіць Таню; спаць мне таксама не хацелася. У выніку я проста сядзеў і глядзеў у вакно. Думак у галаве не было зусім, можна сказаць, што я сам прымусіў сабе больш не думаць сёння пра тыя пытанні, якія ўвесь дзень турбавалі мяне.

З гэтага трансу мяне мяне вывеў кашаль маёй жонкі. Таня не спала, а, павярнуўшы галаву, глядзела на мяне. Толькі прыступ кашлю выдаў, што яна прачнулася.

– Прывітанне! І даўно ты ўжо так шпіёніш за мной?

– Хвілін дваццаць. Я не спала ўжо калі ты разводзіў агонь. Але я вырашыла проста паляжаць так, нічога не кажучы табе. Мне было так прыемна ляжаць ў цёплым ложку і зусім нічога не рабіць, нават не казаць нічога!..

– Я пачынаю табе зайздросціць!

– Было б чаму, – яна зноўку закашляла. – Ты таксама хочаш ляжаць з хворым горлам і тэмпературай?

– Не, – прызнаўся я. – Я толькі хачу ляжаць дома і нічога не рабіць!

– Дык кладзіся, – засмяялася Таня.

Я ўстаў з крэсла і, падышоўшы да ложка, нахіліўся, каб абняць яе.

– Толькі не надумай мяне цалаваць, не хапала толькі, каб абодва настаўнікі заўтра не прыйшлі да школы, – прашаптала яна. Прынамсі, яе словы прайшлі міма мяне, таму што ўжо ў наступны момант я цалаваў яе вусны.

– Ну вось... ты ніколі не будзеш мяне слухацца, – з найгранай крыўдай сказала яна.

– Канешне не буду, таму што я цябе кахаю.

– Абдымі мяне, – папрасіла яна.

Я лёг на ложак і абняў яе за плечы.

– Не хварэй, прашу, не хварэй! Мне было так цяжка без цябе!

Яна ткнулася тварам у мае валасы і, чамусьці ціха ўсхліпнула.

– Я буду старацца. Абяцаю. Хаця б толькі таму, што мне самой было проста невыносна адной быць у гэтай хаце. Самотна і страшна...

Я асцярожна выцер слёзкі, якія раптам з'явіліся на яе твары.

– Хочаш, я заўтра застануся дома з табой? Толькі схаджу да дзяцей, сказаць, што не будзе заняткаў і вярнуся назад?

– Не. Я сабе не дарую, калі з-за мяне прападзе цэлы дзень заняткаў. Проста... проста не затрымлівайся доўга, абяцаеш?

Я паабяцаў.

– Дзякуй... і даруй мне, што кінула цябе сёння. Я слабая...

– Не, сонейка, ты моцная! Проста і моцным людзям часам патрэбны адпачынак, каб яны не зламаліся. Ты мусіш проста крышачку адпачнуць.

– Распавядзі мне, што сёння было ў школе? Як там мае дзеткі?

– Вельмі сумавалі па табе, – я сказаў чыстую праўду. –

Маленькіх я затрымаў, астатніх адпусціў, – я не ведаў, ці распавядаць ёй пра візіт чэкіста. Нарэшце вырашыў, што лепш распавесці.

Яна выслухала мяне з хмурым тварам. Пасля таго, як я скончыў, яна памаўчала хвілінку.

– Мне гэта не падабаецца, Максім. Вельмі не падабаецца.

– Чаму? У мяне склалася ўражанне, што ён нядрэнны чалавек.

– Я не вельмі веру, што сярод чэкістаў ёсць тыя, каго можна сапраўды назваць нядрэнным чалавекам са шчырай душой. Гэта не тая прафесія. Гэтае ўсё – гарачае сэрца, халодны розум і чыстыя рукі – хлусня і глупства!

Я прамаўчаў. Мне не было чым крыць. Танін бацька быў пад следствам ЧК, калі ёй было толькі дзесяць год. Таня ніколі не распавядала, у чым яго вінавацілі. Я ведаў толькі тое, што ён – афіцэр чырвонай арміі – не вытрымаў гэтага прэсу з боку Камітэту і скончыў жыццё самагубствам. Але ў мяне проста не мог скласціся ў галаве вобраз маёра Раманава з халодным і бязлітасным катам, які імкнецца вынішчыць усіх, хто хоць якімсьці чынам мог аказацца ворагам савецкай улады.

– Распытваў пра бацьку Ясіка, кажаш? І што ты адказаў?

– Ды па сутнасці нічога. Сказаў, што мне нічога пра яго невядома, а сам Ясь нічога не распавядаў.

– Гэта добра. Заўжды так адказвай. Так прасцей і самому не трапіць пад падазрэнне і не схлусіць пра людзей, якіх ты не ведаеш. Мне вельмі шкада, што мяне самой сёння не было і я не змагла паглядзець на гэтага твайго знаёмца. Можа заўтра…

– Заўтра ты застанешся ў ложку, Таня, – цвёрда сказаў я.

– Але…

– Ніякіх “але”. Прабач мяне, але я не дазваляю.

Яна кіўнула галавой.

– Добра. Заўтра я нікуды не пайду... Здаецца, імбрык ужо закіпеў – рэзка змяніла яна тэму. – Ты мог бы...

– Канешне, зараз, – я падняўся з ложка і дастаў кубкі.

Праз хвіліну па хаце разнесся прыемны пах гарачай гарбаты. Я паднёс кубкі да ложка і падаў адзін Тані.

– Асяцярожна, гарачы вельмі.

Яна акуратна прыняла кубак і падзякавала мне – аднымі вачыма. Я сеў побач з ложкам і зрабіў асцярожны глыток. Напой быў церпкі, але даволі прыемны, асабліва пасля цяжкага дня і шпацыру па лужынах. Я піў, з задавальненнем, цокаючы языком.

Тым часам у хаце стала цяплей. Я зняў кашулю, нават Таня крыху адкінула цёплую коўдру.

Неўзабаве я вырашыў вярнуцца да размовы пра Раманава.

– Так не можа быць, каб усе тыя, хто працуюць у Камісарыяце былі пагалоўна бязлітаснымі катамі. Не можа. Інакш які быў бы сэнс ў існаванні чэкістаў? Катаванне толькі дзеля катавання? Я не разумею.

Таня памаўчала. Яна паўсядзела на ложку, сціскаючы кубак з гарбатай абедзвюма рукамі, схаваўшы далоні ў рукавы кашулі, каб было не так горача.

– Я не ведаю, Максім. Ведаю толькі тое, што ані разу за свае гады я не бачыла аніводнага добрага ўчынку ад чэкістаў.

– Не хачу рабіць ніякіх высноў, Таня, я проста рызыкну падумаць, што далёка не ўсё тое, што на першы погляд падаецца злым, не служыць дабру, проста мы можам гэтага не бачыць да пэўнага часу.

– Я заблыталася, – Таня хмура глядзела кудысьці ў бок. – Я зусім заблыталася... Максім, а калі за нашае жыццё гэты пэўны час, пра які ты кажаш, ніколі не настане, мы так і

павінны глядзець на зло, суцяшаючы сябе здагадкамі аб тым, што, можа, на самой справе, яно служыць дабру? Пражыць у зле і памерці ў ім? Можа быць, тое дабро зусім не вартае таго зла?

Зараз настала мая чарга глыбока задумацца. Ніякага адказу ў мяне не было, па вялікім рахунку, Таня заблытала мяне самога.

– Я не ведаю, Таня. Я нават не ведаю, ці маем мы права рабіць якія-небудзь высновы пра тое, што мы бачым, не ведаючы нічога аб тым, дзеля чаго гэта адбываецца. Можа быць так, што маю рацыю я, можа, што ты. Можа так быць, што мы абодва – патроху.

Мы памаўчалі яшчэ дзве хвілінкі. Пасля гэтага Таня разгублена сказала:

– Слухай, што мы з табой задурылі сабе галавы з-за нейкага НКВДзіста? Ці яно таго вартае?

– Вядома ж, што не вартае! – Я дазволіў сабе крыху адысці ад гэтай напружанасці, якая невядома з чаго сквала мяне апошнія хвіліны. І сапраўды, чаму візіт Раманава выклікаў столькі эмоцый і ў мяне, і ў Тані? Я не мог знайсці адказу на гэтае пытанне.

– Абдымі мяне, – зноўку папрасіла Таня. – Мне так не хапае цябе апошнім часам, нават калі ты побач, калі мы з табою разам ў адным будынку, адным пакоі... Праца, праца, праца... яна аддаляе нас з табой адзін ад аднаго, ты не адчуваеш гэтага? Праца замяняе нам адзін аднаго, а так не павінна быць...

Я прысеў побач.

– Я адчуваю, але што мы можам зрабіць? Мы не можам аддаваць менш сіл нашай працы, інакш нашыя намаганні ўвогуле знікнуць дарма.

– Не можам, – пагадзілася яна. – Але можам больш ад-

даваць адзін аднаму. Нават праз сілу, нават праз стомленасць і знерваванасць. Толькі так мы захаваем тое, дзеля чаго мы разам. Я не бачу іншага выйсця.

– Напэўна яго й няма... Ты маеш рацыю, як заўсёды.

– А ведаеш, Максім, я не хачу заўсёды мець рацыю. Мне хочацца часам памыляцца, каб ты мяне паправіў і падтрымаў. Мне хочацца быць звычайнай жанчынай, са сваімі дурнотамі, забабонамі, і, галоўнае, сваёй моцнай верай у свайго мужа. Верай і вялікім каханнем. Прынамсі, у мяне ёсць і вера, і каханне. Не хапае толькі аднаго – я не магу дазволіць сабе быць такой, як мне хочацца. Я ненавіджу Тацяну Віктараўну і я мару быць проста "каханай Танечкай", як раней. Але я не дазваляю сабе гэтага, проста не ў стане сабе гэта дазволіць. Можа, калісьці праз гады...

– Не будзе ніякага "праз гады", Таня. Мы жывём зараз, і толькі зараз мы павінны аддавацца цалкам гэтаму жыццю. Мы павінны палаць і спальваць сябе, не пакідаючы нават попелу. Спальваць працай, і, галоўнае, спальваць каханнем. Мы маладыя – пакуль. Потым, разам з маладосцю, скончыцца і ўсё тое, што ёсць зараз – каханне, якое б'е праз край, і пачуцці, якія немагчыма стрымаць, нават калі моцна гэтага хацець. Потым застанецца толькі звычка, а звычка, Таня, – гэта самае страшнае, што можа быць, бо ўжо няма кахання, а пяшчотныя пачуцці да каханага чалавека застаюцца толькі так, хутчэй па інэрцыі. Не будзе ніколі гэтага "праз гады"...

– Скажы, а навошта ў такім разе доўгае жыццё? Навошта кахаць, пакутваць, страчваць урэшце рэшт? Дзеля чаго кожны дзень дзед Юрась успамінае сваю жонку? Для чаго Бог даў чалавеку такі тэрмін, за які можна спаліць сябе, а потым стаць проста халодным абпалкам, якому нічога не патрэбна?

– Не ведаю. Але, калі Бог так вырашыў, значыць гэта

насамрэч патрэбна. Дзед Юрась не стаў такім абпалкам, пра які ты кажаш. Але і жыццё ў яго было не такое, як ва ўсіх.

– Скажы, а праз шмат гадоў ты таксама будзеш мяне кахаць проста так, як ты сказаў, "па інэрцыі"? – па яе голасе было чутно, што яна крышачку злуецца.

– Я не магу сказаць, Таня, што будзе з намі заўтра, ты ж хочаш, каб я сказаў, што будзе праз доўгія-доўгія гады. Я толькі магу даць табе абяцанне, што я буду кахаць цябе столькі, колькі Бог даў мне часу, каб аддаць яго на каханне. І я буду маліцца, каб гэты час быў ніяк не меншым за маё жыццё. Я табе абяцаю.

Таня прыціснулася да мяне.

– Дзякуй. Ведаеш, мне зусім не спадабалася тое, як ты пачаў казаць аб усім гэтым. Але за тое, як ты завяршыў свае словы, я гатовая дараваць табе ўсё. І... – яна вытрымала даволі вялікую паўзу, перад тым, як працягнуць. – Я даўно не казала табе гэтыя словы. За ўсім тым, што нас чакала тут, за той самааданай працай, за тыя часы, якія мы прысвяцілі іншаму, а павінны былі прысвяціць адзін аднаму, я забывалася сказаць табе самае галоўнае, тое, што павінна казаць кожную хвіліну. Я цябе кахаю.

Раптам я адчуў, што на маіх вачах з'явіліся слёзы. Я не плакаў з тых часоў, калі быў дзіцем, але гэтыя словы Тацянкі неўзабаве абудзілі ўва мне тое, што было схавана недзе ў глыбіні душы, за магутным мурам спраў і забабонаў. Я ў думках падзякаваў Богу за тое, што зараз цёмна і Таня не бачыць гэтых слёзаў.

– Я таксама кахаю цябе, мілая. І заўжды буду кахаць, колькі б дзён мне не адлічыла жыццё. Хай парушыцца ўвесь свет, я толькі хачу, каб у самы апошні момант мы былі разам. Толькі разам і толькі ўдваіх.

Мы заснулі амаль адначасова...

# Валя

Я не вельмі добра адчуваў сябе з раніцы. Чамусьці балелі суставы і проста гудзела галава. Тым не менш я своечасова падняўся з ложка, імкнучыся не вельмі шумець, каб не абудзіць Таню, якая моцна спала. Я асцярожна прыклаў далонь да яе ілба. Тэмпература была, хоць і не такая высокая, як учора.

Я паснедаў, апрануўся і ціхенька выйшаў з хаты.

Дзеці пакрысе падцягваліся да школы. Увайшоўшы ў будынак, я павітаўся з тымі, хто ўжо прыйшоў і пачаў рыхтавацца да занятку.

За пяць хвілін да пачатку ўрока ў дзверы зайшоў высокі малады чалавек, апрануты ў вайсковае галіфэ, які вёў за руку маленькую дзяўчынку.

– Старшы лейтэнант дзяржбяспекі Звягінцаў, – прадставіўся ён. – Да вас учора заходзіў маёр Раманаў...

– Так, так, вітаю, – я паднаўся са стула. З цяжкасцю я ўспомніў учарашнюю размову з маёрам – у галаве ўсе думкі былі нібы ў тумане. – А гэта, напэўна, Валя, так? – я паспрабаваў выдавіць нейкае падабенства ўсмешкі.

– Дакладна, – кіўнуў галавой лейтэнант. – Маёр, на жаль, вельмі заняты на працы, таму я нейкі час буду прыводзіць Валю і забіраць яе дадому пасля заняткаў. Наколькі я разумею, вам трэба атрымаць неабходныя дакументы?

– Так, вядома. Але гэта зойме няшмат часу, я не затрымаю вас больш чым на дзесяць хвілін.

– Выдатна. У такім выпадку пачнем, калі можна.

Я запісаў дадзеныя дачкі маёра ў ведамасць.

– Раманава Валянціна Віктараўна, 1928 года нараджэння, першы клас скончыла ў Смаленску. Я нічога не наблытаў?

– Не. Усё абсалютна дакладна.

– Выдатна. У такім разе, я больш не буду вас затрымліваць.

– Калі мне зайсці за Валей? – запытаўся лейтэнант.

– Можаце забраць яе а палове на трэцюю.

– Дзякую, – лейтэнант коратка казырнуў і хуткім крокам выйшаў з памяшкання.

Першая гадзіна заняткаў прайшла ціха і спакойна. Дзеці выконвалі мае заданні, я тым часам спрабаваў разабрацца з паперамі. Пракляты галаўны боль усё ніяк не хацеў суцішыцца, таму я штохвілінна адрываўся ад дакументаў, заплюшчваў вочы і закрываў твар далонямі. Вельмі хацелася скончыць заняткі і адпусціць дзяцей дадому, але я не мог сабе гэтага дазволіць.

Замест гэтага я паклікаў да сябе маленькую Валю, каб паразмаўляць з ёй і высветліць узровень ведаў.

Дзяўчынка выклікала ў мяне ўражанне вельмі сціплага і ціхага дзіцяці. Яна выглядала нават менш, чым на свае восем гадоў. Падышоўшы да мяне, яна асцярожна села на самы куточак крэсла, які я паставіў побач са сваім сталом, і апусціла вочы долу.

Я ўсміхнуўся ёй і папрасіў не хвалявацца. Потым я задаў некалькі агульных пытанняў, запытаўся, як ёй вучылася ў Смаленску, папрасіў распавесці мне пра сябе. Потым, калі дзяўчынка крышачку разгубілася, пачаў запытвацца аб тым, чаму яна навучылася ў першай класе, асцярожна спрабуючы вызначыць мяжу яе ведаў. З таго, што я змог высветліць, я зрабіў выснову, што Валя была даволі разумнай дзяўчынкай, хоць і без нейкіх звышнатуральных здольнас-

цяў. Я з задавальннем адзначыў для сябе, што ніякіх праблемаў з дачкой маёра ў мяне ўзнікнуць не павінна.

Я адпусціў Валю на яе месца, а сам пачаў працаваць з асобнымі групамі дзяцей. Праца без Тані была цяжкай, мне прыходзілася тлумачыць новы матэрыял і даваць заданні розным па ўзросце дзецям, а гэта вельмі затрымлівала і ўскладняла працу. Тым не менш, я здолеў наладзіць працэс так, што мой ўдзел быў патрэбны толькі мінімальна, таму я паспяваў справіцца са ўсім.

***

Таня не спала. Я зайшоў, не распранаючыся, – вельмі змерз пакуль ішоў. У хаце было цёпла – нават горача, у печцы весела трышчалі дровы, і ва ўсім памяшканні пахла чымсьці вельмі прыемным. Мая жонка сядзела за сталом, захутаўшыся ў цёплы плед, і правярала вучнёўскія сшыткі, якія я пакінуў учора дома.

– Прывітанне.

Яна падняла галаву і павіталася са мной – аднымі вачыма.

– Ну й навошта ўставала і выходзіла з хаты? – з усмешкай запытаўся я.

– А я не выходзіла. Гэта дзед Юрась заглядваў – ён і дроваў прынес і агонь развёў.

– Сур'ёзна? А што хацеў?

– Ды проста праведаць зайшоў. Яму ўжо хтосьці данёс, што я два дні ў школе не з'яўлялася, дык ён і вырашыў пацікавіцца, што са мной здарылася. Доўга стаяў, охаў ды ахаў, надаваў цэлую кучу каштоўных парадаў, што трэба і што не трэба рабіць, каб хутчэй паправіцца. Але галоўнае не гэта, – Таня падняла на стале тканы ручнік. Як высветлілася, пад ім знаходзілася шырокая талерка, ад якой і ішоў

той самы прыемны пах. – Паглядзі, ён зноўку прынес нам піражкоў. І вялікі слоік з мёдам. Казаў, што мёд – лепш за ўсе лекі. Буду лячыцца.

– Ого! А мяне пачастуеш? – я схапіў з талеркі адзін піражок.

– Толькі калі ты вельмі добра мяне папросіш!

– Ах вось як? Не буду нічога прасіць! Захварэю і памру – вось наўпрост каб ты потым сама на сябе лаялася, – і я найграна адвярнуўся ў іншы бок.

– І не захварэеш, і не памрэш. Проста таму, што ў цябе не хопіць нахабства пакінуць мяне адну на сто дзесяць дзяцей ў гэтай Богам забытай вёсцы. Вось так. Ну й яшчэ таму што… – яна замаўчала і раптам я адчуў яе рукі на сваіх плячах. – Таму што я цябе сагрэю і не дам захварэць і памерці.

– Вось гэта ўжо зусім іншая размова! – я хутка павярнуўся зноўку да яе. – Ты абяцаеш?

– Моцна– моцна абяцаю!

– Ну вось і цудоўна. А калі ты паабяцала, то ты зараз мусіш наліць мне кубак гарачай гарбаты з мёдам і піражком. Такім чынам, мы зноўку вярнуліся да таго, з чаго пачалі размову.

– Ты невыносны!

– Я ведаю. Але ж менавіта за гэта ты мяне кахаеш?

– Толькі за гэта! Проста больш няма за што.

– Ну-ну, не можа ўжо такога быць. Няўжо я такі дрэнны і злы? Вось глядзі – з дзеткамі тваімі працую, хату таплю… час ад часу. Ну, гэта нават калі не казаць пра тое, што я згадзіўся з табой ажаніцца…

– Згадзіўся?! Ну нічога сабе! Пачнем з таго, што ты гэтую авантуру мне й прапанаваў. Табе яшчэ пашчасціла, што я дурная – доўга не думала, не паспела нікога лепш знайсці!

– Угу. Не паспела. Ды й не знайшла б.

– Савіцкі Максім Леанідавіч, ведаеце, хто вы?

– Н-ну?

– Вы самы эгаістычны Нарцыс, якога я калісьці бачыла.

– Вось так і разбіваюцца ўражанні аб сабе, як аб самым сціплым чалавеку ў свеце, – я ўздыхнуў. – Ну дык што, гарбаткі мне нальеш?

– Скажы “калі ласка”!

– Не скажу.

– Скажы!

– Не скажу!!

– Скажаш!

– Цікава, чаму б гэта?

– Ды проста таму, што цябе самому лянота ўстаць ды наліць!

– Ну добра-добра, упэўніла. Сапраўды лянота.

– Ты не сказаў!

Я выдавіў з сябе самы цяжкі стогн, на які толькі быў здатны.

– Калі ласка!

– Іншая справа! – Таня ўскачыла і схапіла кубак. – Давай распранайся, ў хаце горача, а ты ў гэтым тулупе сядзіш.

***

Я спаў неспакойна. Мне снілася маленькая Валя, потым маёр Раманаў, потым Звягінцаў, які чамусьці ўсё хацеў злавіць мяне і ўдарыць цяжкім ялавым ботам. Я бег, бег, бег ад яго, спатыкаўся, падхопліваўся і зноўку бег. Звягінцаў усё набліжаўся і мне ўжо падавалася, што я не збягу. Нарэшце я зноўку ўпаў і лейтэнант адразу аказаўся побач са мной. На ягоным твары гуляла д’ябальская ўсмешка. Ён падняў нагу, зацягнутую ў той самы бот, над маім тварам…

– ...Камісарыят Унутраных Спраў! Адчыніце дзверы!!

Я не адразу зразумеў, што адбываецца. Стукалі адначасова і ў вокны і ў дзверы. З вуліцы даносіўся брэх сабак і хуткі тупат ног. Судзячы па гуках, чэкісты ламіліся не толькі да нас – грукат было чуваць і ад іншых дамоў, што стаялі навокал.

– Адчыніце дзверы!!

Я падхапіўся, раптам адчуўшы, што ў мяне мокрая ад поту ўся спіна. Што такое? Чаго ад мяне хочуць НКВДзісты?

Таня таксама прачнулася і глядзела на мяне спужанымі вачыма.

Я хутка падбег да дзвярэй і адчыніў замок. За дзвярыма стаялі два сяржанты-чэкісты. Абодва трымалі рукі на адкрытых кабурах, з якіх праглядвалі рукаяткі рэвальвераў. Адзін з іх трымаў на кароткім павадку вялізнага сабаку, які проста заходзіўся ад брэху.

– Што такое? – нельга сказаць, што ў мяне быў той тон, якім варта размаўляць з супрацоўнікамі чэка, але мой голас быў проста своеасаблівай абарончай рэакцыяй – каб не паказаць свайго страху я падсвядома вырашыў падавацца злым.

На маё шчасце гэбісты гэтага не заўважылі.

– Ваша імя і прозвішча!

– Савіцкі Максім Леанідавіч. Што...

– Вы жывеце адзін?

– З жонкай. Ды што ў рэшце рэшт...

– Паклічце жонку.

– Не трэба нікога клікаць, я тут, – Таня выйшла з-за маёй спіны.

Заўважыўшы яе, сяржант, які вёў размову, крыху збавіў абароты.

– Скажыце, калі ласка, ваша імя і прозвішча.

– Савіцкая Таццяна Віктараўна. Можа быць хоць мне вы паведаміце, у чым ўсё ж-такі справа?

– Пазней. Акрамя вас у хаце нікога нямя?

– Вядома, не! Слухайце... – я сапраўды пачаў злавацца.

– Правер, – старэйшы з іх кіўнуў таму, які трымаў павадок з сабакам.

– Ды што вы сабе...

– Максім Леанідавіч і Таццяна Віктараўна, у раёне вашай вёскі збег вельмі апасны злачынец, які этапаваўся канвоем НКУС разам з іншымі ворагамі. Мы правяраем ўсе хаты ў вёсцы, вы не адны такія. Прашу мяне выбачыць, але ў нас інструкцыя.

Я хацеў быў пачаць спрачацца з ім, але Таня паклала мне руку на плячо і лёгка пахітала галавою, маўляў, не трэба. Я заткнуўся.

З хаты паказаўся другі чэкіст.

– Чыста.

Першы кароценька казырнуў.

– Яшчэ раз прашу нас выбачыць. Калі вы заўважыце кагосьці незнаёмага ці падазронага ў вёсцы, вельмі прашу паведаміць аб гэтым. Усяго найлепшага. Дабранач.

Чэкісты рэзка развярнуліся і амаль бегма выляцелі з двара, да наступнай хаты, наколькі я зразумеў.

Мы моўчкі вярнуліся ў хату. Я старана зачыніў дзверы, потым залез у яшчэ цёплы ложак і стаў глядзець кудысці на страху. Мяне калаціла – не ад холаду, хоць я вельмі змерз пакуль мы размаўлялі ў дзвярах. Проста мяне надта напалохалі гэтыя чорныя людзі са зброяй.

Упершыню я адчуў, што гэта такое, калі ўначы да цябе ў хату ломяцца чэкісты.

Да раніцы я ўжо так і не заснуў.

# Нашыя часы,
# Інстытут Гісторыі НАН РБ

– А што вось гэта?

– Цяжка сказаць... Хутчэй за ўсё – нейкі фрагмент скуранога партманэта, вось паглядзі сюды, нават манета ў пяць капеек паміж кускамі матэрыі захавалася. Але нельга выключыць і той магчымасці, што яна трапіла сюды цалкам выпадкова,і ніякі гэта на самой справе не партманэт...

Вацлаў Міхайлавіч Мірагоўскі прыгладзіў адной рукой напаўсівыя валасы. Археолагу ішоў пяцьдзесят шосты год. Менавіта ён і кіраваў тымі самымі раскопкамі, падчас якіх былі знойдзеныя пахаванні расстраляных. Незвычайныя знаходкі ён дэманстраваў свайму вучню – аспіранту Акадэміі, дваццацітрохгадоваму хлопцу, які стаяў побач з ім і з вялікай цікавасцю разглядаў прадметы, выцягнутыя ягоным настаўнікам з пластыкавых пакетаў.

– Вось паглядзі сюды. Партсігар алюмініевы, цікавая знаходка. Большасць расстраляных яўна паходзіла з простых людзей – сялян, ну, можа, вясковай інтэлегенцыі. А вось гэта ўжо хутчэй за ўсё належыла камусьці з больш высокім сацыяльным статусам. Але самае цікавае не гэта – паглядзі сюды, – археолаг адчыніў створкі партсігара. – Бачыш, вось тут. Уяўляеш, нават захавалася папяросная папера! Тытунь, вядома, даўно высыпаўся і сатлеў, а вось папера, чамусьці, захавалася. Цікава, прынамсі, тое, што такая рэч захавалася ў магіле і яе не аднялі перад выкананнем. Як ты думаеш, чаму?

– Ну... магчыма таму, што ўладальніка расстралялі пазасудова, проста з месца арышту павезлі адразу на расстрэльны палігон... Можа такое быць?

– Можа, канешне. Такое таксама здралася, хоць і не вельмі часта. Але часцей за ўсё так адбывалася з самымі беднымі сялянамі, якіх мала хто лічыў. Разумееш, увесь абсурд сітуацыі ў тым, што ў канцы трыццатых гадоў рассстрэльная параноя дасягнула найвышэйшай кропкі, апагею. Дык вось, мясцовым органам НКУС "зверху" даваўся загад расстраляць пэўную колькасць "ворагаў". Вось і здаралася так, што калі пад канец справаздачнага перыяду НКУС не выконваў пастаўленых планам лічбаў, па цёмных і глыбокіх вёсках гойсаў "чорны варанок", які забіраў ні ў чым не вінаватых людзей, выцягваў іх з хаты, і адразу на палігон. "Збірайце рэчы, вы арыштаваныя – За што? – Там растлумачаць". Ніхто нічога нікому не тлумачыў, вядома, звычайна ўжо праз некалькі гадзін небарака ляжаў у яме з маленькай дзірачкай на патыліцы і агромністай дзіркай на ілбе. Чэкісты задаволеныя – па паперах план выканалі, часам, такімі метадамі й перавыконвалі план.

Менавіта ў такіх выпадках асабістыя рэчы ў арыштаваных не забіралі. Яны збіралі самае неабходнае – думалі, што едуць на допыт альбо ў турму, а іх везлі адразу на выкананне.

Вацлаў Міхайлавіч задумліва пастукаў асадкай па стале.

– А вось і яшчэ адна знаходка цікавая. – На гэты раз з шуфляды на свет паказаўся зусім маленькі пакецік. Археолаг адкрыў яго і патрос над далонню аспіранта. З паліэтылену выпаў счарнелы металічны кругляш. Адразу нельга было й зразумець, што гэта такое.

– Медалік, – патлумачыў Вацлаў Міхайлавіч, злавіўшы пытальны погляд свайго вучня. – Каталіцкі медалік. Я нават з ксяндзом кансультаваўся наконт яго. Ён сказаў, што гэта даволі пашыраная выява Маці Боскай, такіх раней было шмат. Але гэты – куды больш стары, не трыццатых гадоў дакладна, хутчэй ён нават з другой паловы дзевят-

наццатага стагоддзя. Бачыш, вакол абадка лацінскія літары? Тут па-польску напісана “О, Марыя, без граха нарожаная, маліся за нас, хто ідзе да цябе”. Таксама загадка, адкуль гэтая рэч магла з’явіцца ў расстрэльнай яме. Тым больш, што яма гэта, напэўна, адносіцца да пачатку трыццаць сёмага году – Заходняя Беларусь яшчэ была пад Польшчай, і каталікоў адтуль сюды вазіць на выкананні не маглі.

– Вацлаў Міхайлавіч, – аспірант адважыўся на пытанне. – А колькі чалавек было ў раскапанай яме?

– Калі падлічыць усе фрагменты костак, атрымліваецца, што не менш сарака пяці.

– А колькі выяўлена магільных западзін?

– Ах, вось ты да чаго... Мы налічылі дзвесце трынаццаць яўных западзін і яшчэ дзесяць, якія пад пытаннем.

– То бок, калі ўзяць за сярэднюю колькасць сорак пяць чалавек у яме, атрымліваецца каля... – аспірант моўчкі варушыў вуснамі, падлічваючы пра сябе. – ... Дзесяці тысячаў чалавек!!!

– Я лічу што ўсё ж такі менш. Па-першае, гэта даволі буйная яма. Ёсць там, канешне, і буйнейшыя, але большая частка западзін менш па памерах. Ну а па-другое... Мы не можам быць упэўненымі, што ва ўсіх ямах ёсць пахаванні. Пэўная частка з іх можа быць пустая. Але на гэтым палігоне, мяркую, ляжыць ня менш за сем – восем тысячаў чалавек.

– Сем тысячаў... А колькі можа быць такіх месцаў?..

– Ніхто не скажа табе зараз, колькі. Адно магу сказаць – шмат. Толькі зараз у мяне ёсць звесткі аб дзесяці патэнцыйна не меншых палігонах. Але іх куды больш, я ўпэўнены.

На століку ля вакна раптам зайшоўся залівістым перазвонам тэлефон. Вацлаў Міхайлавіч цяжка падняўся з-за стала і падышоў.

– Слухаю.

– Вацлаў Міхайлавіч Міраноўскі?

– Так.

– Вацлаў Міхайлавіч, вам лепей згарнуць вашыя даследванні адносна масавых пахаванняў, якімі вы займаецеся ад мінулага тыдня, і перадаць справу вайсковай пракуратуры.

– З кім я размаўляю? Назавіцеся.

– Вацлаў Міхайлавіч, гэта вельмі настойлівая парада. Гэтыя даследванні могуць быць вельмі непажаданымі, а іх вынікі даволі небяспечнымі. Пакуль гэта толькі парада.

– Назавіце сябе!

– Маёр Камітэту Дзяржбяспекі Міхалевіч.

– Маёр Міхалевіч, прашу выслухаць мяне. Ніякіх даследванняў я згортваць не збіраюся, тым больш не збіраюся нікому перадаваць справу. Хай вайсковая пракуратура займаецца сваімі справамі, я як дзяржаўны эксперт, буду займацца сваімі. Нагадаю вам, што па факце масавых пахаванняў невядомага паходжання ўзбуджана крымінальная справа і займацца ёй – гэта мой абавязак як эксперта-археолага і як навукоўца. Дзякуй вам за клопат, але ён абсалютна недарэчны.

– Падумайце яшчэ раз, Вацлаў Міхайлавіч. Паўтаруся, пакуль гэта толькі парада. Пакуль. Да пабачэння.

Слухаўка выдала порцыю кароткіх гудкоў.

– Прыплылі... – ціхенька сказаў навукоўца.

Аспірант занепакоена назіраў за збялелым тварам свайго настаўніка.

– Штосьці здарылася, Вацлаў Міхайлавіч?

– Не, пакуль яшчэ не... Прабач мяне, Алесь, на сёння мы скончым, мне лепш пайсці дадому.

– Можа вас правесці?

– Не, дзякуй за клопат, усё на самой справе добра.

Археолаг прыбраў знаходкі, паклаў іх зноўку ў шуфляду і зачыніў яе на ключ. Пасля гэтага ён накінуў паліто і, хутка развітаўшыся з аспірантам, выйшаў у калідор.

Інстытут Гісторыі НАН РБ ужо апусцеў – працоўны дзень скончыўся паўгадзіны таму. Вацлаў Міхайлавіч ішоў па мармуравай падлозе і кожны ягоны крок цяжкім грукатам адбіваўся ў калідоры.

Сэрца хутка тахкала – не, археолаг не спужаўся гэтай размовы. Па сутнасці, ён чакаў яе, хоць і спадзяваўся, што яна не адбудзецца.

Але размова адбылася. І на душы Вацлава Міхайлавіча было неспакойна – амаль так жа неспакойна, як тады, калі з вадкай зямлі пачалі выцягваць чалавечыя косткі.

З раніцы Таня пачала апранацца разам са мной.

– Ты збіраешся выйсці сёння на працу?

– Так. Хопіць валяцца на ложку. Тым больш мне вельмі хочацца пазнаёміцца з той самай дачкой маёра, яна ж мая новая вучаніца – другі клас, так?

– Так. Можа усё ж такі яшчэ дзень застанешся дома? У цябе твар бледны і вочы блішчаць. Ты яшчэ хворая.

– Не. Усё добра, Максімка, павер мне. Са мной ўсё ў парадку.

– Глядзі сама. Толькі калі раптам адчуеш сябе дрэнна, адразу перадавай мне вучняў і ідзі да дому, добра?

– Дамовіліся, – яна крыху расцягнула ва ўсмешцы вусны. – Дзякуй.

# Каляды

Калядная раніца выдалася надзвычай цудоўнай. Нарэшце выпаў снег, якога так чакалі апошні месяц, ён блішчаў на сонцы тысячамі маленькіх дыяментаў, слепячы вочы. Непралазная багна на дарозе была скаваная ільдом, які ў сваю чаргу прыкрыўся пухнатым снежным дыванам – такім чынам па дарозе зноўку можна было прайсці, не баючыся патануць у брудным месіве.

Дзед Юрась чакаў нас увечары ў сваёй хаце. Вядома ж, Каляды не адносіліся да святаў, якія адзначаліся ў Савецкай краіне, але дзед па старой традыцыі, якую ён пераняў ад свайго бацькі, адзначаў Боскае Нараджэнне, ціха і непрыкметна, каб не прыцягнуць ўвагу.

Дзедава жытло было чыста прыбрана, на стале стаялі яловыя галіны, якія Стары ўпрыгожыў самаробнымі цацкамі. Сціплы пачастунак таксама чакаў нас на святочным белым абрусе.

Мы не спазніліся – роўна а дзевятай гадзіне, як і дамаўляліся, я і Таня стаялі ля дзвярэй гасціннага гаспадара.

Стары сустрэў нас задаволенай усмешкай і гучнымі вітаннямі.

– Праходзьце, мае даражэнькія, праходзьце! Вас ужо зачакалася святочная курка, калі не лічыць, канешне, што я сам ад раніцы ўсё лічыў час да вашага прыходу!

Стары проста свяціўся радасцю і... напэўна шчасцем. Ён шмат разоў выказваў нам сваё стаўленне да нас з моманту нашага знаёмства – мы адчувалі, што сталі для яго блізкімі і дарагімі.

Сапраўды, гадзінкі праз паўтары святочнага застолля

Стары, троху ўжо чырвоны ад уласнай самагонкі, але не згубіўшы цвярозасці розуму, казаў нам:

– Ведаеце, мае мілыя, я шмат гадоў жыў адзін, сам-насам са сваёй гаспадаркай, сваім домам і... сваёй адзінотай. Так, так, амаль дваццаць год прайшло з таго часу, як мая Аксаначка пайшла ў лепшы свет, пакінуўшы мяне аднаго тут, чакаць з ёй сустрэчы. Я ніколі не думаў, што зноўку з'явяцца ў маім жыцці людзі, якія стануць для мяне па-сапраўднаму роднымі, дзеля якіх я буду жадаць жыць далей. Пан Бог вырашыў інакш, і ў маім жыцці з'явіліся вы. Шкада толькі што гэта адбылося толькі зараз, калі мае гады ўжо няспынна ідуць да схілу, але я ўдзячны і за гэтае. Вы мае дзеці, і я хацеў бы аддаць ўсё што ў мяне ёсць, толькі каб убачыць вашае шчасце, вашую радасць. Ніколі ў мяне не было дзяцей, і вось, нарэшце, ёсць вы. О, як бы я хацеў каб у мяне з'явіліся яшчэ й унукі! Не кажыце, што я прашу ад вас занадта шмат, падаруйце старому яшчэ трошачку шчасця, прашу вас! Я б тады мог сказаць, што мой шлях быў не дарэмны, і што хоць напрыканцы мне ўсміхнулася жыццё.

Стары хвілінку памаўчаў.

– Танечка, мілая мая дачушачка – ты дазволіш мне так цябе зваць? – у мяне ёсць для цябе невялічкі падарунак, – дзед Юрась падышоў да шуфляды, пакапаўся ў ёй, дастаў невялічкую скрыначку. – Адчыні.

Таня ўзяла шкатулку, зазірнула ў яе. Я таксама глядзеў праз яе плячо. Там, на кавалачку ільняной тканіны, ляжаў невялічкі медалік. На ім была выява святой Маткі Боскай Марыі. Па краі медаліка я заўважыў нейкія выгравіраваныя словы. Я не стаў прыглядвацца да дэталяў, таму што Стары працягнуў свой маналог:

– Гэты медалік належыў маёй Аксане, а ёй яго падараваў яе бацька – ён таксама быў каталіком. Я хачу верыць,

што табе, сонейка, ён прынясе больш шчасця, чым маёй жонцы. Насі яго і ўспамінай пра старога Юрася. Можа быць, калі мяне не стане, толькі ён адзін будзе табе нагадваць пра дзеда.

Таня з удзячнай пяшчотай паглядзела на Старога.

– Дзякуй, дзеду, дзякуй вялікі! – яна павесіла медалік на шыю і нясмела працягнула. – Ведаеш, і ў мяне і ў Максіма бацькі сапраўды даўно памерлі. Для нас ўсё тое, што ты зараз казаў, мае агромністае значэнне. Дазволь жа й нам быць для цябе больш чым сябрамі, быць тваімі дзецьмі! І, хто ведае, можа быць і сапраўды, дасць Бог, у цябе будуць унукі, – Таня памаўчала, потым скончыла. – Я, прынамсі ў гэта веру.

Стары падышоў да нас і прыціснуў абодвух сваімі магутнымі рукамі да грудзяў. Потым ён адвярнуўся і правёў рукой па вачах.

– Пайшлі, Максімка, як у той раз, выйдзем, я папалю. Накінь мой кажух, ён побач з табой ляжыць.

Я не прымусіў Старога доўга чакаць. Разам мы выйшлі на двор. Дзед Юрась, не спяшаючыся, запаліў папяроску.

– Тут, Максімка, летам дваццатага году, калі на нашых землях стаялі палякі, здарылася цікавая гісторыя. Польскі жаўнер закахаўся ў мясцовую дзяўчыну. Баявых дзеянняў тады не было, польскі лагер проста стаяў на пазіцыях і хлопец ледзве не кожны вечар праводзіў са сваёй каханкай. Ён быў малады, маладзейшы за цябе, яму было ад сілы гадоў дваццаць. Ён кахаў аддана і шчыра, наўпрост палаў у сваім каханні. А аднойчы яму распавялі, што ягоная каханка здрадзіла яму з ягоным жа сябрам, з якім ён не раз пад кулямі ляжаў у акопнай зямлі. Паляк спачатку адмаўляўся паверыць гэтаму, а калі, нарэшце, паверыў, так раз'юшыўся, што быў гатовы забіць кожнага, хто трапіцца на ягоным

шляху. Ён не шмат бачыў у сваім жыцці – боль, страх, смерць – больш нічога навокал. І тады, калі ён ужо пачаў верыць у тое, што шчасце, нарэшце, усміхнулася і яму, здрада стала самым страшным, што ён пераЖЫЎ. Ён бег па гэтай самай дарозе, якая ідзе праз маю хату, бег і крычаў. На бяду ён сустрэў таго самага свайго былога сябра, яны сышліся акурат тут, ля майго двара. Паляк не стаў разбірацца, хто тут вінаваты, а проста падняў сваю вінтоўку і адзіным стрэлам забіў свайго таварыша.

Яго б растралялі свае ж за гэта, так ці інакш, доўга б ён ужо не пражыў. Але ад сваёй польскай кулі яго выратавала рускае наступленне. Літаральна праз паўгадзіны на гэтай зямлі пачалася артпадрыхтоўка, у небе было шмат аэрапланаў, яны скідвалі бомбы па польскіх пазіцыях. Таго, забітага, нават не паспелі прыбраць, а забойцу пасадзіць пад арышт, калі і яго, і ягонага канвойнага накрыла выбухам. Іх абодвух разарвала наўпрост на шматкі. Рускія наступалі так імкліва, што палякам было не да сваіх забітых. Яны адступілі ад вёскі літаральна за гадзіну, і больш ужо ніколі не вярталіся.

Я пахаваў тады ўсіх, каго мог – рускія таксама не асабліва клапаціліся пра гэта, яны былі занятыя наступленнем. І я... я падабраў вінтоўкі тых першых трох забітых, падабраў і схаваў у сваёй хаце пад падлогай. Не ведаю, навошта я гэта зрабіў, але тады мне чамусьці падавалася гэта вельмі важным. Яны і зараз ляжаць у маім схроне, гэтак жа гатовыя да бою, як і шаснаццаць год таму, і мне хочацца верыць, што яны больш ніколі не пададуць голасу, ды толькі ўсё ў руках Пана Бога. Калі раптам што здарыцца, я хачу, каб ты ведаў – схрон пад маім ложкам, забіты дошкамі падлогі. На ўсялякі выпадак. Ніхто ня ведае, што ў наш век можа здарыцца...

Я крыху здзіўлена нахіліў галаву. Мне было незразумела, навошта стары распавёў мне гэту гісторыю, але спрачацца з ім і дапытвацца я не стаў.

Мы вярнуліся ў хату, а яшчэ праз пару гадзін я і Таня пачалі збірацца дадому. Дзед Юрась вырашыў правадзіць нас да сваёй брамы. Развітваючыся, я задаў Старому пытанне:

– Скажы, дзеду, а што напісана на тым медаліку, які ты падараваў Тане?

– "O Maryjo Bez Grzechu Poczęta, módl się za nami, którzy się do Ciebie uciekają", гэта значыць...

– О, Марыя, без граха народжаная, маліся за нас, хто ідзе да цябе...

– Верна, сынку. Яна моліцца за ўсіх нас. І за вас будзе маліцца. Часам у жыцці дапамагае нават малітва. Вось так...

Як і ў мінулы раз Стары назіраў за намі, пакуль мы не схаваліся за паваротам. Ён глядзеў нам услед, і ягоны пільны позірк супакойваў маю душу. Маладая сям'я атрымала новага бацьку. Я быў амаль шчаслівы тым вечарам.

# Пачатак

Гэта пачалося яшчэ ўвосень. Аднекуль з гораду праз нашу вёску пачалі гойсаць вялікія чорныя машыны з крытым кузавам без вакон. Ніхто не ведаў, што возяць у такіх бартах, вяскоўцам заставалася толькі здагадвацца.

Пакрысе гэтыя чорныя грузавікі прабілі праз снег і прамерзлую глебу глыбокую сцежку, каляіны ад колаў машынаў цягнуліся ад канца вёскі, дзе сканчалася нармальная дарога, аж да самага лесу і знікалі ў ім, схаваныя ад вачэй высокімі дрэвамі.

А потым мы чулі глухія хлапкі, якія ледзьве ўлоўлівала вуха. Гэта было падобна, як бы гарох смажылі на патэльні ў далёкім пакоі – “пах”, “пах”, “пах” – раз за разам, хлапок за хлапком. Яны раздаваліся і партыямі, рана з ранку і позна ўвечары, спачатку па гадзіне, потым ўсё больш ды больш.

Грузавікі таксама з цягам часу пачалі ездзіць часцей. Калі спачатку мы бачылі толькі тры-чатыры машыны на дзень, то ўжо да канца вясны яны мільгалі праз вёску фактычна адна за адной. Нарэшце, нельга ўжо было заўважыць нейкай сістэмы ў іх руху – ад самага рання да позняй ночы, дзень за днём без перапынкаў яны вазілі свой таямнічы груз ў напрамку лесу.

Ніхто не наважваўся хадзіць да лесу, каб паглядзець, у чым насамрэч справа. Гэта было зразумела – лясную сцежку, па якой ездзілі машыны, ахоўвалі патрулі ўзброеных вінтоўкамі людзей ў форме НКУС.

А недзе напачатку снежня ў лесе пачалося будаўніцтва. Побач з чорнымі крытымі грузавікамі з’явіліся грузавікі з адкрытымі бартамі, на якіх везлі ў лес апрацаваныя дошкі і будаўнічы матэрыял. Таямнічых будаўнікоў не палохаў

ні мароз ні снег, які ляжаў высокімі гурбамі. Літаральна за два тыдні трохметровы плот абкружыў лес на пяць кіламетраў углыб. На ўездзе ў лес была збітая агромістая брама з цяжкімі створкамі, якія адчыняліся, калі пад'язджалі новыя машыны. Штодзень і штоноч ля брамы неслі варту два шэрагоўцы НКУС.

Тайна лесу станавілася ўсё больш і больш загадкавай.

Напэўна, не было ў вёсцы жыхара, які б не меў свайго меркавання наконт таго, што адбывалася ў лесе. Але меркаванні і адкрытыя здагадкі пражылі нядоўга.

Пакуль аднойчы ўначы ў вёсцы не пачалі спыняцца чорныя машыны...

***

Заняткі скончыліся дваццаць хвілін таму. Я пакрысе збіраў свае рэчы, перыядычна адказваючы на дзіцячыя словы развітання.

Ля задніх сталоў стаялі і аб чымсьці шапталіся Ясік з Валяй. На дзіва, дзеці пасябравалі, я часта заўважаў, як яны разам сыходзілі са школы, калі за Валяй не заходзіў маёр альбо Звягінцаў. Больш сяброў ні ў хлопчыка, ні ў маёравай дачкі ў класе не было, верагодна гэта таксама адыграла сваю ролю.

Дзеці не спяшаліся сысці, яны яўна чакалі калі з класа выйдзе апошні вучань. Напэўна штосьці яны хацелі сказаць мне, штосьці такое, чаго яны не хацелі данесьці да чужых вушэй.

Я зразумеў іхні намер.

Праз пятнаццаць хвілін класа апусцела, засталіся толькі мы ўтраіх. Дзеці пераступалі з нагі на нагу, было бачна, што ім складана пачаць размову.

– А вы чаму не сыходзіце дадому? – ветліва запытаўся я.

Яны асцярожна наблізілся да мяне, дакладна ўжо пашкадаваўшы, што ўвогуле вырашылі завесці са мной размову.

– Максім Леанідавіч... мы...

– Мы б хацелі...

– Калі ласка, я вас слухаю. У вас штосьці здарылася?

– Максім Леанідавіч... мы наконт той высокай брамы ў лесе.

– Тааак... – жэстам я загадаў ім сесці за стол перада мной, сам пайшоў і зачыніў дзверы ў класны пакой. Думкі блыталіся. Што ж хацелі мне распавесці мае маленькія вучні? – Вы хадзілі да брамы?

– Так, мы хадзілі. Мы... – Голас Валі дрыжаў і зрываўся, было добра бачна, што яна вельмі хвалявалася і ледзве стрымлівалася ад таго, каб не заплакаць.

– Ну, маленечкая, што такое? Калі ласка, супакойцеся і распавядзіце мне, усё што з вамі здарылася, а я падумаю, чым бы я мог вам дапамагчы. Але спачатку скажыце мне, навошта вы ўвогуле пайшлі туды?

Размову працягнуў Ясік – Валя больш не сказала ніводнага слова.

– Максім Леанідавіч, толькі не лайцеся на нас! Мы... нам няма чаго было рабіць, і мае, і Валіны бацькі затрымліваюцца на працы ажно да ночы, вось мы і бадзяемся разам па вёсцы. Мінулым днём мы вырашылі прайсціся да лесу, проста так, мы не хацелі нічога дурнога! Мы пайшлі і нечакана выйшлі да плоту. Мы вырашылі абысці яго вакол і паглядзець, наколькі далёка ён цягнецца. Прыкладна ў кіламетры ад брамы мы знайшлі лаз – дарослы чалавек ніколі б не праціснуўся ў яго, але для нас ён быў акурат па памеры.

– І вы... залезлі за плот? – падсвядома я ўжо здагадваўся, што будзе далей, але пакуль трымаў свае здагадкі пры сябе.

– Так…. Мы пралезлі праз гэты лаз і пайшлі асцярожна паміж дрэвамі. Мы не хацелі каб нас хтосьці бачыў, таму ішлі вельмі ціхенька, хаваючыся за кожным кусцікам. Прыкладна праз пяць хвілін мы выйшлі да вялікага прагалу. Там было шмат людзей, ўсе ў форме, вельмі падобнай да той, якую носіць бацька Валі. Яны размаўлялі паміж сабой, палілі цыгарэты. Частка з іх збірала нейкія рэчы. А за імі вялікі бульдозер раўняў зачымсьці раскапаную яму – яна была ўжо засыпаная, і мы не бачылі што ў ёй, калі там, канешне, увогуле штосьці было. Але галоўнае не гэта. Галоўнае што…

– Гэтая яма дыхала! – Валя ледзьве не закрычала і па яе шчаках нарэшце пацяклі слёзы.

– Цішэй, калі ласка! Не крычыце і, галоўнае, ня трэба плакаць. Ясік, што вы на самой справе бачылі?

Хлопец праглынуў ком у горле і зноўку адкрыў моманам перасохлыя вусны.

– Максім Леанідавіч, яма насамрэч дыхала. Альбо дыхала ТОЕ, ШТО БЫЛО Ў ЁЙ. Ледзве заўважна зямля падымалася і апускалася, зусім трошачку, але мы бачылі гэта і нам гэта не падалося! А яшчэ над ямай падымася пар! Максім Леанідавіч, такая яма была там не адна. Навокал, колькі мы маглі бачыць па зямлі былі раскіданыя такія плямы нядаўна засыпанай глебы. Але тая была зусім свежая, відаць яе толькі-толькі закапалі.

– Так… што было далей?

– Далей? Нічога. Мы пастаялі там яшчэ хвілін дваццаць, пачакалі, каб сышла большая частка людзей. Яма дыхала яшчэ хвілін пяць – потым гэта скончылася і толькі пар працягваў падымацца над ёй. А потым мы асцярожненька пайшлі – амаль што папаўзлі – да нашага лазу. Мы вельмі спужаліся, а яшчэ нам было страшна, што нас хтосьці заўважыць.

– Не заўважылі, дакладна?

– Не.

Я памаўчаў хвіліну, збіраючыся з думкамі.

– Каму вы яшчэ распавядалі пра гэта?

– Нікому, – Ясік катэгарычна паматаў галавой.

– А ты, Валя?

– Я... таксама... – плакаць дзяўчынка ўжо скончыла, але вусны ў яе ўсё яшчэ дрыжэлі і размаўляць ёй было цяжка.

– Гэта добра. Слухайце мяне. Нікому, чуеце, нікому больш не распавядайце пра тое, што былі за плотам, і тым больш пра тое, што вы там бачылі. Нават сваім бацькам пра гэта не кажыце. Вам зразумела?

Яны заківалі галовамі.

– А самі... самі пастарайцеся пра ўсё забыць, хоць, канешне, гэта будзе досыць складана, і, галоўнае, ніколі больш не хадзіце да таго плота, дамовіліся?

Зноўку энэргічнае ківанне.

– Ідзіце дадому, і памятайце тое, што я вам сказаў – аніводнага слова нікому!

Яны падняліся.

– Максім Леанідавіч... дзякуй вам.

– За што?

– За тое, што выслухалі нас і не сталі лаяцца. Мы вельмі хваляваліся што вы раззлуецеся.

– Мне няма чыннікаў на вас злавацца. Бяжыце да хаты. Заўтра заняткі, як звычайна, а восьмай рана. Да пабачэння.

– Да пабачэння!

Дзеці збеглі, а я ў задуменні пачаў апранацца. Што ж яны бачылі на самой справе? Што было ў гэтых таямнічых ямах, і ці былі ямы наогул, альбо дзеці ўсё прыдумалі з перапуду?

Шмат пытанняў, на якія у мяне не было адказу. Адзінае я ведаў дакладна – вельмі добра дзеці зрабілі, што не сталі

распавядаць пра свае прыгоды нікому больш, апроч мяне. Невядома яшчэ, чым бы скончыліся такія размовы, асабліва з бацькам Валі – маёрам НКУС.

Я зачыніў дзверы школы і паціху пайшоў да хаты. Галава была занятая загадкамі і магчымымі іх вырашэннямі.

Міма мяне праехала машына, абдаўшы цэлым фантанам брудных кропель з-пад колаў. Гэта вывела мяне з трансу. Я падняў галаву і ўжо адкрыў рот, каб не вельмі прыстойна выказацца наконт майстэрства кіроўцы, які забрудзіў мне ўсю вопратку.

...і замоўк на паўслове. Па размытай дарозе ў бок лесу цяжка ехаў чорны грузавік, які і абліў мяне.

З поля наляцеў халодны вецер і раптам я затрэсся.

Але не ад холаду. Ад нечаканага страху.

# Палігон

Я збіраўся нядоўга. На маё шчасце, Тані дома не было – яна выправілася ў госці да дзеда Юрася. Гэта вызваліла мяне ад непрыемных тлумачэнняў. Прынамсі, гэтых тлумачэнняў я не змог бы даць самому сабе, не тое, што камусьці яшчэ.

А сапраўды, навошта мне гэта трэба? Нахалеры я іду да таго лесу, да таго плоту?

Адказаў у мяне не было. Я ведаў толькі тое, што спакою мне дзіцячы аповед не дасць, пакуль я сам не ўбачу ўсё сваімі вачыма і не разбяруся, у чым жа там справа. Між тым, я цудоўна разумеў, што, калі не вырашуся на гэта сёння, наўрад ці ўжо калісьці ў мяне хопіць мужнасці для гэткай разведкі.

Я апрануў цёплы мехавы тулуп, хоць на вуліцы было не асабліва халодна, высокія боты і шчыльныя рукавіцы. У карман сунуў пачак запалак на ўсякі выпадак. Потым падумаў і паклаў туды ж невялікі нож у скураным чахле. Нахалеры мне спатрэбіўся нож я так і не зразумеў, але з ім было троху спакойней на душы.

Я выйшаў з хаты і зачыніў дзверы. Неўзабаве да мяне дайшло, на якое рызыкоўнае мерапрыемства я іду, і я пачаў хвалявацца.

Праўда, хваляванне я задушыў у сабе адразу – калі б я даў яму волю, у мяне б ніколі не хапіла духу здзейсніць задуманае.

Я яшчэ раз падзякаваў небу за тое, што Тані не было дома.

Я выйшаў з-за брамы і пакрочыў паціху па шырокай двухкалейнай сцежцы, якая вяла да лесу. Я не хаваўся – хвалявацца не было чаго – ніякіх падазрэнняў я ні ў кога

выклікаць не мог, прынамсі да тых часоў, пакуль не выйшаў бы за межы вёскі.

Навокал было яшчэ светла – вясна паціху прымала кіраванне прыродай. Яшчэ ляжаў глыбокі снег, але паветра было ўжо іншым – вясновым, прыемна-лагодным.

Я ішоў і з задавальненнем дыхаў. Пах вясны дзіўным чынам супакоіў мяне і схаваў мае страхі, таму я ішоў, нічога не баючыся.

Дарога ішла проста, не збочваючы, да самага апошняга дома ў вёсцы. Потым яна рэзка мяняла напрамак на ўсход, дзе ўзвышаліся высокія дрэвы – першыя вартавыя нашага лесу. Яны высіліся амаль перад самай вёскай, але па-сапраўднаму лес пачынаўся толькі праз дзесяць хвілін пешшу ў бок ад дамоў.

Я дайшоў да павароту і адразу звярнуў з дарогі. Усё, жарты скончыліся, тут ужо лепш быць асцярожным – з'яўленне чалавека на дарозе, якая вядзе толькі да таямнічай брамы, дзе неслі ахову НКУСаўцы, не магло выклікаць нічога больш акрамя непрыемных пытанняў.

Першы ж крок у бок ад дарогі прынес непрыемнасці. Ногі праваліліся па калена ў глыбокія сумёты вясновага снегу, якія паціху пачалі падтайваць, яшчэ, праўда, не настолькі, каб пераўтварыцца ў вадкае месіва. Я пра сябе аблаяў усе прыродныя катаклізмы, але выбраўся і паціху пачаў ісці паралельна сцежцы ў бок брамы, стараючыся не вытыркацца з-за дрэваў, каб не быць заўважаным выпадковым ахоўнікам.

Хвілін праз дзесяць я заглыбіўся ў лес настолькі, што не бачыў ні вёскі, ні нават дарогі. Гэта цудоўна адпавядала маім планам. Зараз трэба было не заблукаць і выйсці акурат да плота.

Апошні з'явіўся перад вачыма яшчэ праз пятнаццаць хвілін падарожжа. Я падышоў да яго, крануў дошкі рукой,

пасля павярнуў і пайшоў у бок ад брамы. Як там сказаў Ясік, за кіламетр? Невядома яшчэ, ці змагу я праціснуцца як-небудзь у лаз, можа, ён сапраўды настолькі вузкі, што пралезці праз яго ў мяне няма аніводнага шанца... Тым не менш, я вырашыў паспрабаваць.

Праз метраў дзвесце я раптам пачуў нейкія гукі. Я рэзка спыніўся і прыслухаўся. Не, мне не магло гэта проста падацца, наперадзе рычаў матор машыны! Што за д'ябал?

Я стаяў так, навастрыўшы вушы яшчэ хвіліну. Потым да мяне данесліся галасы. Немагчыма было разабраць, пра што ідзе гаворка, ды мяне гэта й не цікавіла. Відавочным было тое, што я памыліўся – звярнуў не ў той бок, і зараз я ішоў акурат на ахоўваемую браму, замест таго, каб ісці прэч ад яе!

Я развярнуўся і рвануў назад па сваіх слядах, тымчасова ўспамінаючы самыя непрыемныя словы ў свой адрас. Ну, дурань, ёлуп, ледзьве не трапіў па-дурному ў лапы ахоўнікаў! Дыверасант недароблены, яшчэ б хвіліну, і я б даваў тлумачэнні ўзброеным НКУСаўцам, а ў іх, як вядома, размова доўгай не бывае.

Хвілін праз дзесяць я крышачку супакоіўся. Нарэшце, нічога дрэннага не задрылася, а нават калі б я трапіўся ахове... Сказаў бы што заблукаў у лесе – нічога б яны мне не зрабілі. Напэўна. Паручыцца за свае словы сам перад сабой я, праўда, не мог.

Я прайшоў ужо больш за кіламетр і зноўку занепакоіўся. Са словаў Ясіка, я ўжо павінен быў дайсці да таго самага лазу, а яго ўсё не было й не было. Навокал ўжо фактычна сцямнела, але пакуль я бачыў усё перад сабой. Да таго ж, каб не збіцца са шляху, я адной рукой трымаўся за дошкі плоту.

Нечакана руку пранізаў рэзкі боль. Я ўскрыкнуў і інстынктыўна прыціснуў да сябе далонь. Мая пальчатка засталася пры гэтым вісець на заборы.

Я аглядзеў руку. Яна была добра абадрана, чамусьці адразу нацякло даволі шмат крыві. Адна кропля сарвалася і ўпала ў талы снег. На ім расплылася буйная ярка-пунсовая пляма, добра бачная нават у бедным вячэрнім святле.

Я яшчэ раз аблаяў сябе, зняў з плоту разадраную пальчатку і апрануў на пашкоджаную руку. Пасля гэтага я прыглядзеўся да дошкі, шукаючы прычыну майго ранення.

Яна знайшоўся хутка. Адна дошка была прыбіта неахайна – з яе тырчаў доўгі і шырокі цвік, які і разадраў маю далонь. Я апусціў вочы.

Дошка была адсунута са свайго месца, прыкладна сантыметраў на трыццаць, утвараючы ўнізе, амаль ля самога сумёта той самы, напэўна, лаз, пра які казаў Ясік.

Я задумаўся. Насамрэч, лаз быў настолькі вузкі, што праціснуцца ў яго ў мяне не было аніякай магчымасці. Я нават быў здзіўлены, што дзеці, апранутыя ў зімовыя тулупы, здолелі ў яго пралезці.

У пошуках рашэння я азірнуўся навокал. Снег, дрэвы, снег, дрэвы... Стоп!

У метрах дваццаці ад мяне ляжала вялікая бярозавая галіна, якая, напэўна, адламалася ад дрэва пад цяжарам снежнага покрыва. На ёй амаль не было дробных галінак, а тыя, што былі, я мог з лёгкасцю абламаць рукамі. Рашэнне было знойдзена!

Я ўзяўся за сваю знаходку абедзвюма рукамі і перацягнуў яе да лазу. Тут я пачысціў галіну ад тых дубчыкаў, якія маглі перашкодзіць мне, і ўставіў гэткі рычаг у лаз. Пасля гэтага я ўсім целам налёг на супрацьлеглы канец галіны.

Галіна прагнулася пад маёй вагой, але й дошка забору пачала паціху спаўзаць у бок. Яшчэ! Яшчэ!

І тут галіна зламалася.

Я праляцеў метры паўтары, пасля чаго ляпнуўся гала-

вою акурат у сумёт. Напэўна, з боку выглядала гэта досыць камічна, але мне было не да смеху.

Я падняўся, адплёўваючыся ва ўсе бакі, счышчаючы снег з валасоў і выціраючы вочы. Адчуванні былі досыць непрыемныя.

Праз хвіліны тры зрок вярнуўся да залепленых снегам вачэй, і я аглядзеў вынікі сваей працы. Канешне, магло б быць і лепш, але лаз пашырыўся сантыметраў на дваццаць. Яшчэ невялічкае намаганне і я змагу туды пралезці!

Я зноўку узяўся за тое, што засталося ад майго рычага. Бярозавая галіна паменшылася на паўметры, але ўсё яшчэ была прыдатная для карыстання. Зноўку напружыўшыся, я налёг на яе.

На гэты раз мне пашанцавала трохі больш. Галіна паламалася яшчэ раз, але зараз я не паляцеў у снег, а здолеў спыніцца.

Гэта таго каштавала – зараз лаз стаўся шырокай адтулінай паміж дошкамі, у якую я мог бы праціснуцца, асабліва нават і не напружваючыся!

Цела ламіла ад такіх эксперыментаў над ім, але я быў задаволены вынікам – вось ён шлях у невядомасць!

Я адышоў на некалькі крокаў назад, аглядзеў вынікі маёй працы, даў супакоіцца дыханню.

Самы час было прыняць канчатковае рашэнне. Раптам мне расхацелася лезці ў гэты чорны пралом. У галаве настойліва круцілася думка аб тым, што дзеці ўсё прыдумалі, і нічога звышнатуральнага за гэтым плотам няма.

А яшчэ праз секунду я зразумеў, што мне проста стала страшна. Халера ведае, чаго я больш баяўся, магчымых наступстваў, калі мяне раптам заўважыць ахова НКУС, альбо непасрэдна таго, што хаваў за сабой гэты плот.

Я адвярнуўся ад плоту. Лезці вельмі не хацелася. Я зрабіў крок ў бок вёскі. Адзін, другі.

Потым я рэзка павярнуўся і пакрочыў да лаза. Лёг на снег, падпоўз да непрыемна-чорнай адтуліны ў дошках. Прасунуў галаву, потым плячо... Другое плячо ўпарта не пралазіла ў адтуліну.

– Спакойна. Выдыхнуў, – я шэптам падбадзёрыў сябе. – Рраз!

Плячо праціснулася.

Далей было зусім нескладана. Праз хвіліну я быў ўжо па іншы бок дошак.

Я ўстаў, паатрасаўся, правёў далонню па твары, счысціўшы снег. Адпляваўся. Зараз трэба было вырашыць, куды ісці. Як назло, я забыўся спытацца ў дзяцей, у якім напрамку яны ішлі ад лаза. З аднолькавай паспяховасцю можна было ісці наперад альбо ўздоўж забора – да брамы, ці наадварот – ад яе.

Я пайшоў у бок брамы, увесь час кранаючы пальцамі дошкі забора, каб не згубіць напрамак. Навокал было зусім цёмна. Месяц схаваўся за хмарамі, нават снег, падавалася, перастаў блішчэць за агароджай. Мне зрабілася зусім няўтульна.

Хвілін дзесяць я ішоў, нічога не заўважаючы навокал. Было зусім ціха, нават сумёты пад нагамі рыпелі неяк прыглушана, нібыта не хацелі парушаць трывожнай цішыні.

Потым я зноўку пачуў грукат рухавіка машыны. Я спыніўся і прыглядзеўся ў цемру.

Метрах у пяцідзесяці ад мяне ў адчыненую браму заяжджалі адразу некалькі буйных грузавікоў. Фары ў іх былі ўключаны і я міжволі прыціснуўся да дошак, каб промні святла не слізнулі па мне, адкрыўшы маю прысутнасць.

Грузавікі праехалі браму і рушылі ўглыб тэрыторыі. Я разглядзеў нават дарогу, па ягой яны ехалі. Адзін, два, тры... яшчэ адзін... Чатыры грузавікі – столькі запар я яшчэ

не бачыў, звычайна яны праязджалі па вёсцы па адным – зрэдку па два. Цікава...

Я асцярожна пайшоў за машынамі, хаваючыся за дрэвамі і трымаючыся на досыць вялікай адлегласці ад дарогі. Светлы кажух, які я апрануў перад выхадам, даваў мне адносна добрую маскіроўку ў заснежаным лесе, таму я не асабліва хваляваўся.

Ісці прыйшлося хвілін пятнаццаць, грузавікі адарваліся далёка наперад і адзін раз я ледзьве не спужаўся, што згублю накірунак, але ў наступны момант зноўку ўбачыў чорны кузаў і супакоіўся.

Раптоўна машыны спыніліся. Паміж мной і імі было метраў сто пяцьдзесят і я вырашыў асцярожна прабрацца як мага бліжэй, бо на такой адлегласці нельга было нічога ні ўбачыць, ні пачуць. Потым ужо я вельмі шкадаваў аб гэтым рашэнні, але было позна.

Шматгадовыя елкі добра хавалі мяне сваімі магутнымі стваламі, так, асцярожна перабіраючыся ад аднаго дрэва да другога, я прайшоў метраў сто. Далей гэтак ісці было небяспечна і я, апусціўшыся на снег, папоўз па-пластунску далей.

Я поўз, як мне падавалася, вельмі ціха, хоць, напэўна, на самой справе, гэта было далёка не так.

Метрах у дваццаці да бліжэйшага грузавіка я спыніўся за чарговай елкай і падняў галаву.

Мда. Не прыдумалі нічога Ясік з Валяй.

Акурат за машынамі зямля нібыта разгарнула сваю пашчу буйной, трохі няроўна разрытай траншэяй, памерамі прыкладна два метры на дзесяць. Глыбіні яміны я не бачыў, але, напэўна, зямля была раскапана не менш чым на паўтары метры ўніз.

Відаць, я крыху памыліўся. Пашча была не адна, іх было дзве. Другую я заўважыў не адразу, яна падавалася троху

больш сціплай па памерах за першую і нібыта хавалася за ёй.

Адвалы былі адкіданы роўныміваламі ў бок, напэўна для таго, каб потым было лягчэй закопваць. Улічваючы прамерзласць глебы ў гэты час году, было нескладана ўявіць, колькі працы было прыкладзена, каб выкапаць такія яміны.

Навокал былі бачныя старыя раскопы, закапаныя і закіданыя яловымі галінамі, але, тым не менш, добра заўважныя на фоне белага яшчэ снежнага покрыва.

Побач з грузавікамі стаялі дзве легкавушкі. Чамусьці, яны падаваліся мне вельмі недарэчнымі ў гэтым месцы.

Крыху далей ад машын стаяла чалавек дзесяць у форме афіцэраў НКУС. Яны палілі і аб чымсьці размаўлялі паміж сабой. Я напружыў слых, але здолеў разабраць толькі нязвязаныя абрыўкі іх размовы. Некалькі раз да мяне даляцелі словы “першая партыя” і “Раманаў”. Пару разоў яны пачыналі рагатаць, гучна, уголас. Яны былі гаспадарамі гэтай тэрыторыі, гаспадарамі, якія рабілі тут усё, што заўгодна і нічога не баяліся. Усё тут навокал баялася іх саміх.

Размова цягнулася хвілін пяць-сем. Потым на дарозе паказалася яшчэ адна легкавушка. Яна спынілася побач з першымі дзвума, не пагасіўшы святло фараў. З пасажырскага месца выскачыў яшчэ адзін афіцэр...

Опа. Старыя знаёмыя. Новай дзеючай асобай быў ніхто іншы як старшы лейтэнант Звягінцаў, уласнай персонай. Вельмі цікава...

Пры з’яўленні Звягінцава астатнія пакідалі цыгарэткі ў снег і выцягнуліся перад ім у струнку.

– Вольна. Здароў, хлопцы, – ён падышоў да кожнага асабіста і кожнаму паціснуў руку. Голас у яго быў вельмі гучны, мне было чуваць яго куды лепш, чым чэкістаў, што размаўлялі да ягонага з’яўлення. – Ну што, сёння напружа-

ная ноч, буйная партыя. Заўтра кожнаму з вас я даю дзень адпачынку. Астатняе як звычайна. Боекамплекты праверылі? На ўсіх хапае?

Шэраг нястройна пацвердзіў.

– Выдатна. Прапаную добра папрацаваць і хутчэй скончыць, мне самому ня вельмі хочацца сядзець у гэтым клятым лесе да раніцы. Усё, разысціся.

Афіцэры разбегліся. Два з іх сталі да ямаў і пачалі правяраць боекамплект. Яшчэ шэсць чалавек адышлі да грузавікоў. Рэшта засталася стаяць вакол ямаў. Я заўважыў, што рукі яны не здымалі з рэвальвераў, гатовыя ў любы момант ужыць зброю.

Сінхронна чэкісты адчынілі кузавы грузавікоў, па два чалавекі нырнулі ў кожны з іх, яшчэ па адным засталося звонку.

Я затаіўся, баючыся нават варухнуцца. Нечакана мне стала вельмі страшна. Нельга, канешне, сказаць, што дагэтуль я быў абсалютна спакойны, але зараз мяне ахапіў проста панічны страх. Пакуль яшчэ нічога не здарылася, а мяне ўжо фактычна паралізавала гэтым брыдкім і ліпкім пачуццём.

Раптам з грузавікоў я пачуў гукі нейкай валтузні. Праз імгненне з першай машыны паказаліся чэкісты, пад рукі яны валаклі чалавека. Было бачна, што той супраціўляўся з усіх сілаў, імкнуўся вырвацца, нават паспрабаваў пнуць аднаго з канваіраў нагой. Апошні здолеў адхінуцца і ў сваю чаргу рубануў небараку рэбрам далоні па шыі. Чалавек бязвольна павіс на руках чэкістаў. Яго дацагнулі да ямы, пнулі пад калена. Мужчына ўпаў, але чэкісты працягвалі трымаць яго пад рукі, каб ён застаўся стаяць на каленях.

Толькі ў гэты момант я зразумеў, што мусіць зараз адбыцца. Як пацвярджэнне маіх горшых здагадак чэкіст, які стаяў каля ямы, падняў рэвальвер...

Грукнуў стрэл. Ён гучна пранессяпа начным лесе. Цела небаракі, нібыта падштурхнутае куляй, само звалілася ў яміну. Канваіры адразу ж падаліся назад, да грузавіка.

Ля суседняй ямы адбывалася тое ж самае. Асуджанага – а ці былі гэтыя лудзі асуджаны? – падвалаклі да выканаўцы, ударылі пад калена...

Стрэл.

Стрэл.

Стрэл.

Я сплю? Божа, які страшны сон!!! Божая маці, анёла панскі, пан Езус, дайце мне прачнуцца!!! Зараз, зараз я адкрыю вочы і зразумею, што ляжу ў сваім ложку, дрыжу ад страху, абліваюся халодным потам, але мне ўсё гэта толькі прыснілася ў нейкім нерэальным сне!

Стрэл.

Стрэл.

Я не прачынаўся.

Выканаўцы змяніліся. Крывавая вакханаліся працягвалася. Смертнікі часам крычалі. Чэкісты не рэагавалі на крыкі, не прымушалі сцішыцца. Здавалася, што гэтыя нерэальныя енкі і плач ледзьве не прыносілі ім задавальненне!

Тройчы выкананне спынялася на некалькі хвілін – чэкісты адпачывалі самі і давалі астыць наганам. Зброя расскалялася ледзьве не да чырвані – старыя рэвальверы не вытрымлівалі такіх перагрузак. Некалькі разоў змяняліся выканаўцы, толькі сам Звягінцаў назіраў за выкананнем збоку і не прымаў у ім удзелу.

Мне падавалася, што гэтая бесчалавечная оргія доўжылася ўжо некалькі гадзін, хоць насамрэч прайшло толькі хвілін сорак. Ямы запоўніліся ўжо напалову. Я страціў лік забітым. Колькі ж іх? Дваццаць? Трыццаць? Больш?

Прайшла яшчэ гадзіна. Я заплюшчыў вочы, сціснуў веі з усіх сілаў – не бачыць, не бачыць, не бачыць!!! Далонямі я

закрыў вушы, але гэта не дапамагала зусім – стрэлы і крыкі разрывалі слых і ледзь не саму душу. Маліцца – толькі гэта мне й заставалася – і я маліўся, як умеў.

Раптам усё скончылася. Стрэлаў і плачу больш не было, толькі размаўлялі паміж сабой чэкісты. Звягінцаў гучна аддаваў загады.

З'явіўся бульдозер. Ён пачаў засыпаць забітых зямлёй з адвалу, потым трамбаваць ямы. Усё адбывалася неверагодна павольна, быццам хтосьці з садысцкай упартасцю не жадаў, каб сёння гэты кашмар скончыўся. Чэкісты сядалі па машынах, пустыя грузавікі развярнуліся і паехалі да брамы. З'ехаў і Звягінцаў. Праз паўгадзіны на гэтым жудасным месцы не засталося нікога.

Я трохі пасунуўся. Выпраставў руку, паспрабаваў устаць. Ногі здрадліва адмаўляліся трымаць мяне. Неяк я падняўся на калені і папоўз. Метраў праз дваццаць я паспрабаваў падняцца яшчэ раз. Ледзь не зваліўся, захістаўся ў розныя бакі, схапіўся за нейкае дрэва. Штаны былі мокрыя, ці то ад талага снегу, ці то... Напляваць. Твар таксама быў мокры – яго залівалі слёзы, якія я ніяк не мог спыніць. Бегчы адсюль, бегчы! Далей, далей, далей!!! У галаве не было нічога, толькі тупы боль, які біўся там нібыта звон, што звоніць паніхіду па забітым.

Я зрабіў няўпэнены крок. Ногі, нарэшцэ, зноўку падпарадкоўваліся мне. Яшчэ крок, яшчэ. Я пабег, не разбіраючы дарогі. Дзе быў лаз, я не памятаў, толькі верыў, што даберуся да яго раней, чым мяне схопяць, павалакуць да ямы, прыставяць да галавы наган і спусцяць курок. Напэўна, я вельмі шумеў, ламаў галіны, некалькі разоў падаў – падаў і не заўважаў гэтага.

Да лазу я выйшаў калі ўжо страціў усялякую надзею выбрацца з гэтага пекла. Ён чарнеў зусім так жа, як і не-

калькі гадзін таму, калі я пралазіў сюды, робячы, напэўна, галоўнае глупства ў сваім жыцці.

Я пралез пад дошкамі, разарваўшы тулуп аб нейкі дурны, вылезшы так недарэчна, цвік, падхапіўся, зноўку пабег. Куды? Без розніцы, толькі б далей адсюль.

Са спазненнем я зразумеў, што раблю тую ж памылку, якая ледзь не згубіла мяне мінулым вечарам. Я выбег акурат да брамы, дзе неслі варту НКУСаўцы. Я рэзка спыніўся, нібыта наляцеў на нябачную сцяну. Развярнуўся на сто восемдзесят градусаў і пабег назад, зусім нічога не разумеючы ад страху. На маё шчасце, калі вартавыя штосьці і пачулі, яны не сталі правяраць прычыны шуму ў лесе.

Праз гадзіну я выйшаў да вёскі, знясілены, нічога не разумеючы. Дамы, дамы, чужыя, з цёмнымі вокнамі, цёмныя вуліцы, ані душы навокал.

Па вёсцы, якую я ведаў, як уласныя пяць пальцаў, я блукаў добрых дзве гадзіны.

Нават свой дом пазнаў не адразу. У вакне гарэла святло. Божухна, што павінна думаць Таня?!

Я ўзабраўся па прыступках да дзвярэй, наваліўся на іх усім целам... З жахлівым скрыпам дзверы пад маім цяжарам адчыніліся і я ўпаў на падлогу.

Я плакаў, як не плакаў нават калі быў дзіцёнкам. Таня падхапілася, падбегла да мяне. Яна схапіла мяне пад рукі, усімі сіламі спрабуючы дацягнуць да ложка. У мяне самога сілаў, каб дапамагчы ёй, ужо не засталося.

– Што? Што здарылася?! – жонка крычала, крычала ад страху – на маім твары запеклася кроў – дзесьці ў лесе па мне ўдарыла яловая галіна і рассекла шчаку, але я гэтага не заўважыў. Танін крык я чуў нібыта адкульсьці здалёк, нават зрок я не мог сфакусіраваць на яе твары, у вачах плясалі чырвона-чорныя кругі. – На цябе хтосьці напаў? Божачкі, Максім, што з табой?!

– Я быў у лесе, – толькі і змог вымавіць я. У наступны момант мяне накрыла цемра і я праваліўся ў бяспамяцтва.

Двойчы я расплюшчваў вочы. Таня не адыходзіла ад ложка і не клалася спаць – пільнавала мяне. За адну ноч яна пасталела гадоў на дзесяць. Цікава, а як выглядаў я сам? Толькі з раніцы, калі ледзьве не паўзком я дабраўся да люстэрка, то ўбачыў, што раптам, за некалькі гадзін амаль што цалкам пасівеў. Але раніца прыйшла няхутка.

– Вады! Вады! – стагнаў я, стагнаў і захлынаўся халоднай вадой, якую ты мне давала. Зноў ды зноў я прасіў піць, хоць цудоўна разумеў, што мой арганізм не можа прыняць столькі вадкасці.

– Што ты бачыў? Што? – ты нахілялася і задавала гэтае пытанне, а я толькі матляў галавой і сіпла смяяўся ў адказ – смяяўся нейкім вар'яцкім смехам, непадобным да звычайнага чалавечага смеху. – Што ты бачыў там, Максім?!

– Ворагі! Ворагі! Нішчыць ворагаў! Біць іх! Страляць! – і я зноўку смяяўся. – Забіць іх усіх! Ворагі нашага, нашага народа, ворагі, ворагі! Біць, біць! Залп, яшчэ залп, яшчэ, яшчэ! Страляць іх, біць, біць!!!

Ты біла мяне па шчоках і сама плакала.

– Прачніся! Прачніся, нарэшце! Што ты вярзеш, якія ворагі?!

– Ворагі, ворагі!..

Удар тваёй маленькай далонню па шчацэ, яшчэ адзін, яшчэ.

– Прачніся! Прачніся... – і ты плачаш і не можаш спыніцца, нібыта хочаш сваімі слязамі заліць, затушыць маё вар'яцтва. – Божа, Божа, выратуй і збаві, выратуй і збаві, святы Божа, міласцівы Божа!!

Я зноў страціў прытомнасць.

# Малітва

Раніца прынесла толькі кароткае збаўленне. Сонца, халоднае, вясновае сваімі промнямі нібы кінжаламі раніла мяне, разрывала галаву і сэрца. Я не страчваў больш прытомнасць, але і проста спаць не мог таксама.

Ты сядзела за сталом, абхапіўшы далонямі галаву. Ты не спала ўсю ноч, не спала і плакала. Потым я думаў, што гэтую ноч я перажыў, толькі дзякуючы табе.

Я не мог успомніць нічога з таго, што было ноччу. Не памятаў, што казаў табе, не памятаў, як дабраўся дадому. Ты расказала мне пра гэта толькі праз некалькі дзён, калі сілы зноўку пачалі вяртацца да мяне. Да таго моманту ты маўчала і плакала...

Маё вар'яцтва прайшло так жа нечакана, як і з'явілася. Яно схлынула разам з успамінамі пра гэту ноч, разам з маімі словамі і тваім плачам.

У школу я не пайшоў – я не мог нават самастойна падняцца з ложка. Ты сказала, што справішся адна. І яшчэ ты паабяцала зайсці да старога дзеда Юрася і папрасіць яго паглядзець за мной. Я быў супраць, але ты не хацела нават слухаць мяне. Можа быць так яно і сапраўды было больш правільна – мне не варта было заставацца аднаму.

Сёння я так і не расказаў табе, што ж здарылася са мной у тую ноч. Проста не знайшоў у сябе сілаў на гэта.

Ты сышла, а я ляжаў, усё ўглядаючыся ў балючую цемру, не здольны разляпіць веі – святло прыносіла мне яшчэ больш пакутаў.

Хто вы, тыя па кім так натужліва званіў звон у маёй галаве? Хто вы? Чаму аддалі сваё жыццё? За якія грахі ці

злачынствы? I ці за злачынствы і грахі ўвогуле? Што я бачыў ноччу, Божа, што?! Адказаў не было і не магло быць. Я паціху страчваў пачуццё рэальнасці навакольнага свету – усё ператварылася ў нейкую нелагічную крывавую казку без пачатку і канца.

Некалькі гадзін пакутлівых роздумаў ні да чаго не прывялі – толькі знову выпілі рэшту сілаў і я ў чарговы раз заснуў – ці страціў прытомнасць? – я ўжо не мог зразумець, што са мной адбываецца.

Зноўку вочы я расплюшчыў, калі раздаўся асцярожны стук у вакно. Я не паспеў спалохацца – на двары гучна клікаў мяне ніхто іншы, як стары дзед Юрась.

– Што, сынку, пагана? – ціха запытаўся ён, толькі ўвайшоўшы ў хату.

– Пагана, дзядзька... Дужа пагана. Не ведаю, што з гэтым рабіць. Не магу зразумець, гэта свет з'ехаў з глузду ці я сам звар'яцеў .

– Распавядзі мне ўсё, што ты бачыў. Ты ведаеш, ад мяне можна не хаваць нічога. Распавядзі, Максімка, табе лягчэй стане, а я, можа, падкажу, што рабіць трэба. Табе ж зараз парада трэба, парада і падтрымка, так?

Хвіліну я думаў. З аднаго боку проста да болю ў сэрцы хацелася выгаварыцца каму-небудзь надзейнаму, блізкаму, выплюхнуць усё, што займала галаву, словамі ачысціць душу; з іншага было страшна – нават дзеду Юрасю я баяўся распавесці тайну растрэльнага лесу.

Боль перамог – я ўсё распавёў. Не хаваў нічога, не згубіў ані хвіліны страшнай ночы. Расказаў пра Ясіка з Валяй, пра тое, як прабраўся да плота і знайшоў лаз, як пралез на палігон і што міжволі ўбачыў там. Распавёў пра вяртанне дадому – што памятаў, а памятаў я, як апынулася, няшмат.

Стары не перапыняў – слухаў і ківаў галавою. У пэўны

момант мне падалося, што ў ягоных вачах бліснулі слёзы, хаця, магчыма, мне гэта толькі падалося. Ён доўга маўчаў і пасля таго, як я скончыў, маўчаў, паглыбіўшыся ва ўласныя думкі. Мне заставалася толькі чакаць, калі ён штосьці скажа. Нарэшце я не вытрымаў:

– Дзядзька Юрась, падкажыце хоць штось! Што я бачыў? Што мне рабіць? Як увогуле мне далей жыць?! Кожную хвіліну, кожны момант у маіх вачах ліецца кроў, а ў вушах стаяць стогны! Я не магу так!

Стары паклаў мне на галаву сваю далонь. Дзіўна, але гэта супакоіла мяне, нібы рука дзеда Юрася піла боль з маёй галавы, піла і выпівала да кроплі. Ён гладзіў мае валасы далонню і штосьці шаптаў аднымі вуснамі.

– Ты бачыў тое, што бачыў, сынку, – нарэшце сказаў ён. – Гэта не сон, не начны кашмар, не хвароба і вар'яцтва. Гэта рэальнасць. І ад гэтага нікуды не падзецца, застаецца толькі мірыцца з гэтым. Я не здзіўлены тваім апавяданнем, хлопча, і мне таксама балюча. Яны ствараюць свой свет, у якім няма месца такім як мы, тым, хто яшчэ ўмеюць слухаць сэрцам і думаць галавою. Можа быць тыя, каго ты бачыў, былі вінаватыя таксама толькі ў гэтым. Бог ведае. Бог асудзіць.

Што ж рабіць табе? Бяжы. Бяжы ад гэтых успамінаў, калі зможаш. Бяжы ад іх і беражыся, усё астатняе жыццё беражыся таго, што ты памятаеш. Беражыся непатрэбнага слова, няправільнага позірка, нават лішняй думкі. І маліся, маліся, сынку, гэта дапаможа.

– Я не ўмею, дзядзко.

– Я навучу. На ўсё жыццё запомні малітву, сынку, яна дапаможа, вывядзе і выратуе. Гэта наш, каталіцкі "Ойча наш" – ён не раз ратаваў мяне ад смерці. Хай ён будзе ратаваць і цябе: "Ojcze nasz, któryś jest w niebiesiech, święć się Imię

Twoje, przyjdź królestwo Twoje, bądź wola Twoja, jako w niebie tak i na ziemi, chleba naszego powszedniego daj nam dzisiaj, i odpuść nam nasze winy, jako i my odpuszczamy naszym winowajcom, i nie wwodź nas na pokuszenie, ale nas zbaw ode złego. Amen."

***

Таня вярнулася рана. Яна дабяла сціскала вусны, ўвогуле была ўся збляднелая і відавочна знерваваная.

– Жывы? – Яна прысела на ложак і паклала сваю далонь мне на лоб.

– Жывы, мілая.

Нечакана Таня заплакала.

– Мілы мой, Максімка, каханы мой, куды ж ты залез? Што ты бачыў такога, што так дорага каштуе?

Я моўчкі прыціснуў яе да сябе. Таня хісталася з бока ў бок, абхапіўшы маю шыю рукамі і сціснуўшы яе так, нібыта ўсе д'яблы пекла імкнуліся мяне вырваць з гэтых рук.

– Сёння знову прыходзіў Звягінцаў.

– Што ён казаў? – Мой голас раптам сеў і скроні сціснула страхам.

– Нічога. Ён проста пытаўся, дзе ты, што з табой, чаму не выйшаў на працу. Я сказала, што ты захварэў.

– Правільна сказала.

– Ён... Ён смяяўся!!! Разумееш, Максім, ён смяяўся, нібы д'ябал, сваім страшным смехам, і ў мяне было такое адчуванне, што ён ведае пра нас нешта такое, што цалкам аддае нас пад ягоную ўладу. У мяне параноя? Што гэта, Максім?

Я памаўчаў троху.

– Дзед Юрась заходзіў днём.

– Я прасіла.

– Ведаю. Ты казала, – я кораценька распавёў змест нашай размовы са старым. – Мы жывем ў гэты час не гаспадарамі жыцця, Танечка. Нават не гасцямі. Мы жывем рабамі, бо толькі рабы не маюць ва ўласнасці нават сваё жыццё. Нашыя лёсы не належаць нам, у нас іх скралі, маленькая мая, калі мы яшчэ гэтага не разумелі, а зараз ужо позна штосьці вырашаць – засталося толькі таіцца, таіцца, хоць я пакуль не ведаю, дзеля чаго. Аднойчы будзе такі час, калі пра нашыя лёсы хтосьці ўспомніць, хтосьці пашкадуе – нават не нас саміх – расстраляны народ. Мы гэтага ўжо не ўбачым, але можа толькі дзеля гэтага варта жыць зараз і проста рабіць сваю маленькую справу? З тысяч маленькіх Спраў складаецца вялікая будоўля, будоўля жыцця, якое належыць не партыі, а чалавеку, будоўля народаў, якія бароняць сваё і не шукаюць чужога. Я хачу верыць, малыш, што гэта не толькі прыгожыя словы, і што будучыня ёсць. Я хачу верыць. Хачу верыць. Хачу... Хачу! – я з усіх сілаў стукнуў па ложку кулаком. – Я хачу верыць. Я хачу жыць...

Ты ўсхліпнула. Яшчэ мацней сціснула рукі. І прашаптала толькі два словы:

– Мне страшна.

Больш мы не кранalі гэтай тэмы.

# Ясік

У школу мы пайшлі разам. Апошнім часам такое адбывалася досыць рэдка. Да школьнага будынку мы падышлі за дваццаць хвілін да першага ўроку. Дзяцей яшчэ не было – звычайна яны падыходзілі фактычна да пачатку занятка.

Раніца была прыгожая – цёплая і сонечная. Яна нібыта сама сабой спрыяла добрым думкам і добраму настрою. У мяне нават амаль прайшоў страх апошніх дзён, які не адпускаў мяне ні на хвіліну. Я пасміхаўся і ўвесь час жартаваў. Жыццё зноўку вярталася ў сваю плынь, з якой яго выбілі падзеі трохдзённай даўніны.

У дзверы нечакана пастукалі.

– Уваходзьце, – крыкнула Таня.

Я нават не здзівіўся і не спалохаўся, калі ўбачыў Звягінцава. Апошнім часам ён з'яўляўся ў школе занадта часта – нягледзячы на тое, што Валя даўно ведала дарогу і не было аніякай патрэбы праводзіць яе. Дарэчы, дзяўчынка стаяла за спінай афіцэра, сарамліва пераступаючы з нагі на нагу па-за дзвярамі школьнага будынка.

– Добрага ранку, – са сваёй звычайнай халоднай усмешкай павітаўся лейтэнант.

– І вам добрага ранку, – з лёгкай напружанасцю адказала Таня. Я прамаўчаў. Звягінцаў зрабіў выгляд, быццам не заўважыў гэтага.

– Рады зноўку бачыць вас на працоўным месцы, Максім Леанідавіч. Віншую з хуткім выздараўленнем.

Я выдавіў з сябе нешта, што з некаторай нацяжкай можна было б назваць словамі ўдзячнасці. Лейтэнант знову прапусціў гэта міма вушэй.

– Дарэчы, шаноўны Максім Віктаравіч, а што ж з вамі такое сталася, што вы не змаглі выйсці на працу?

– Я атруціўся, – у мяне не было аніякага жадання завязваць са Звягінцавым доўгую размову, таму я адказваў як мага больш коратка.

– Ммда? Цікава. Чаму ж тады Таццяна Віктараўна сказала, што вы захварэлі на грып?

Таццяна рэзка збялела і адвяла вочы ад НКУСаўца.

Я прымусіў сябе расцягнуць вусны ў натужнай ўсмешцы.

– Ды, ведаеце, спадар Звягінцаў, адно на другое наклалася. Я сам учора не мог дакладна разабраць, што адыграла вырашальную ролю. Прыйшоў да высновы, што і тое і тое вінавата ў роўнай ступені. Мне ўчора-заўчора было настолькі дрэнна, што не мог проста з ложка падняцца. Дзякуй Богу, сёння я ўжо больш-менш у норме, з ног на занятках зваліцца не павінны.

– Ну што ж, тады тым больш віншую з такім хуткім выздараўленнем, – Звягінцаў насмешліва глядзеў на мяне. Канешне, ён мне не верыў ані на грош, але пакуль ў яго не было аніякіх падставаў паказваць гэты недавер. – Дарэчы, я сёння да вас па справе.

Я напружыўся.

– Слухаю вас.

– Наколькі я ведаю, Максім Віктаравіч, маёр Раманаў размаўляў з вамі ў свой час наконт хлопчыка Ясіка Самахвалава, сына мясцовага партыйнага кіраўніка.

– Была такая размова. Штосьці здарылася?

– Ммм, ды як вам сказаць... пакуль шчэ нічога не здарылася, але можа здарыцца ў бліжэйшы час. Мне прыйдзецца сёння забраць малога з сабой.

– На якой такой падставе, лейтэнант?

– Таварыш Савіцкі, на вашым месцы я б размаўляў з афіцэрам НКУС з большай павагай, – у голасе Звягінцава прарэзаўся метал. – Смею вас запэўніць, што ў мяне ёсць для гэтага вельмі важкія чыннікі.

Я нечакана асмялеў.

– Спадар Звягінцаў, нагадаю вам, што мы, як настаўнікі і загадчыкі гэтай навучальнай ўстановы, нясем адказнасць за кожнага з дзяцей, якія знаходзяцца ў сценах школы. Мы не маем права ні з кім адпускаць хлопчыка без наяўнасці адпаведнага дакумента, калі толькі, канешне, яго не прыйдзе забіраць сам бацька, альбо хтосьці са сваякоў. Таму я папрашу вас альбо прадставіць альбо распіску ад спадара Самахвалава, альбо пакінуць школу. Праз пяць хвілін пачынаецца занятак, і мне б вельмі не хацелася каб на ім прысутнічалі людзі, якія не маюць да яго дачынення.

– Максім Леанідавіч, пакіньце ваш настаўніцкі тон для вашых вучняў, я школу скончыў даўно. Вы забыліся, якую арганізацыю я прадстаўляю і якія паўнамоцтвы ёсць у мяне.

– Вашых паўнамоцтваў я не ведаю, таварыш старшы лейтэнант. Я сказаў – без адпаведнай паперы ад спадара Самахвалава я не адпушчу хлопчыка ні з кім.

У размову нечакана ўмяшалася Таня.

– Можа быць вы ўсё ж такі скажыце нам, на якой падставе і куды вы забіраеце хлопчыка?

– Можа быць і скажу, Таццяна Віктараўна, калі, канешне, ваш муж зменіць тон, якім ён са мной размаўляе, – спрэчка відавочна забаўляла чэкіста. Ён зноўку халодна ўсміхнуўся.

У школу паціху падыходзілі дзеці. Яны глядзелі на нас, абсалютна нічога не разумеючы.

– Таварыш Звягінцаў, я прашу вас патлумачыць мне з якой нагоды вы просіце ад мяне таго, з чым вы прыйшлі, –

я перасіліў сябе і панізіў голас. Гэта было выклікана нават не патрабаваннем лейтэнанта, проста я не хацеў на павышаных танах спрачацца пры дзецях.

– Вось гэтак-та куды лепш. А вось, дарэчы, і Ясік. Добрай раніцы, хлопча.

Малы здзіўлена пазглядаў то на мяне, то на лейтэнанта.

– Добрай раніцы.

– Ясік, табе прыйдзецца пайсці са мной. На жаль, заняткі ты сёння прапусціш.

Я не вытрымаў. Схапіўшы Звягінцава за руку я пацягнуў яго да выхаду. Лейтэнант рэзка вырваўся, але пайшоў за мной. Я чуў як Таня за маёй спіной сказала дзецям, каб яны сядалі на месцы і чакалі нас. Потым грукнулі дзверы, і жонка выйшла за намі.

На вуліцы я спыніўся.

– Спадар Звягінцаў, апошні раз я паўтараю вам, што я не адпушчу хлопчыка з вамі без тлумачэння прычын. Калі ласка, альбо растлумачце ўсё, альбо я папрашу вас сысці і не турбаваць нас больш. Мне патрэбная папера ад таварыша Самахвалава з просьбай адпусціць хлопчыка з вамі.

Чэкіст расплыўся ў шырокай усмешцы.

– Папера, кажаце? Ну-ну. Дык вось, таварыш Савіцкі, я не хацеў бы нічога тлумачыць, больш таго, я фактычна не маю на гэта права, але калі вы так настойліва гэтага патрабуеце... Таварыша Самахвалава сёння арыштавалі мае калегі па абвінавачванні ў... ды няма ніякай для вас розніцы, у чым яго вінавацяць, гэта вас зусім не датычыцца. Скажу толькі адно: калі вы не жадаеце сабе праблемаў, вы павінны адпусціць хлопчыка са мной. У адваротным выпадку гэтыя самыя праблемы я вам гарантую. Паверце, Максім Леанідавіч, вы далёка не анёл, я знайду магчымасць зладзіць вам вясёлае жыццё.

Таня спахмурнела.

– Адно пытанне, лейтэнант, няўжо вы думаеце, што вы настолькі ўсемагутны? Што вы можаце нам зрабіць? Нават вашая прыналежнасць да Камісарыяту Унутраных Спраў не дае вам права рабіць усё, што вам хочацца. Я прашу вас ісці адсюль, і не вяртацца без адпаведнай паперы, хай і не ад бацькі Ясіка, дык ад вашага начальства.

– Мне надакучыла гэтая бессэнсоўная спрэчка. Я заняты чалавек, спадарства, і ў мяне сёння яшчэ шмат спраў.

– Забіраць іншых бязвінных? – Таня раптам перайшла на злы шэпт. – Вінаваціць людзей ў тым, што яны не рабілі? Калечыць сем'і і ламаць лёсы?

– Таня!

– Ідзіце прэч, лейтэнант, хлопчыка мы не адпусцім. Шукайце сабе занятак у іншым месцы.

Звягінцаў са злосцю сплюнуў сабе пад ногі.

– Вы, здаецца, не разумееце, Таццяна Віктараўна, з кім і як размаўляеце. Ваш доўгі язык можа сыграць з вамі вельмі злы жарт. Адыдзіце ў бок.

– Не.

Замест адказу чэкіст зрабіў крок у бок класа. Таня стала на ўваходзе і закрыла яго сабой. Звягінцаў схапіў Таню і сілай паспрабаваў зварушыць яе з месца.

– Прыбярыце рукі, лейтэнант! – я працягнуў руку, каб вырваць Таню з лапаў чэкіста.

Той ніяк не адрэагаваў на мой выклік. Рэзкім рухам ён штурхнуў Таню ў бок. Ён яўна разлічваў на тое, што жанчына, калі не ўпадзе на падлогу, то хоць саступіць праход. Але Таню ён яўна недаацэніў. Жонка засталася на месцы.

– Прэч рукі, – скрозь зубы працэдзіла яна. Паколькі лейтэнант працягваў трымаць яе, Таня вызваліла адну руку і нечакана для ўсіх гулка пляснула чэкіста па шчацэ.

Ад здзіўлення той адпусціў рукі. На ягоным твары чырванела пляма памерам з маленькую жаночую далонь. Ён быў яўна шакаваны. Я застыў на месцы.

Звягінцаў асцярожна крануў сябе за шчаку. Потым ён рэзка замахнуўся і ўдарыў Таню ў твар. Мая Таццянка павалілася ня зямлю.

Наступныя падзеі разгортваліся вельмі імкліва.

Я таксама замахнуўся, каб са ўсіх сілаў ударыць падонка, але чэкіст дасведчанай рукой перахапіў мой кулак і заламіў руку так, што ў мяне пацямнела ў вачах. Пасля гэтага ён каленам стукнуў мне па жывату, ад чаго ў мяне адразу перахапіла подых. Я паваліўся побач з Таняй. Звягінцаў моцна два разы грукнуў ботам мне ў раён грудзей.

Я з хрыпам пакаціўся па зямлі. Чэкіст зрабіў крок у мой бок. Я скруціўся ў чаканні яшчэ аднаго ўдара, але яго не было. Лейтэнант завіс нада мной.

– Ужо толькі аднаго таго, што вы зрабілі, мне хапіла б, каб арыштаваць вас па абвінавачанні ў нападзе не афіцэра НКУС. Ведаеце, спадар Савіцкі, што за гэта бывае?

Я прахрыпеў штосьці не вельмі ветлівае, за што атрымаў яшчэ адзін удар пад дых.

– Паляжыце так троху, можа зямля мазгоў дасць хоць троху, – ён яшчэ раз дакрануўся да шчакі. – Гніды, – лейтэнант нахіліўся нада мной. – Я яшчэ нявяду пэўныя даведкі наконт тваёй “хваробы”, морда. А зараз я забяру хлопчыка. Мне б хацелася правесці з вамі дадатковую выхаваўчую працу, шкада толькі, што ў мяне зусім няма часу.

Звягінцаў зайшоў у школу. Я асцярожна падняўся і дапамог устаць Тані. Яна ціха плакала. Мы прыхінуліся да сценкі, каб не зваліцца зноў.

З дзвярэй выйшаў чэкіст з хлопчыкам. Ясік напужана глядзеў на нас і хутка лыпаў вачыма. Раптам ён расплакаўся.

– Я не пайду з вамі! Дзе бацька?

– Тата з'ехаў па працы. Ты пакуль пажывеш з іншымі дзеткамі. Хадзем.

Хлопчык голасна плакаў. Я адвёў вочы. Мы нічога не маглі зрабіць, і ад гэтага было куды больш балюча, чым ад удараў энкавэдэшнага падонка.

Лейтэнант увёў хлопчыка. Малы ўпіраўся і плакаў, але Звягінцаў не звяртаў на гэта аніякай увагі.

Больш мы ніколі не бачылі ні Ясіка, ні ягонага бацьку.

Супакой

Стрэлы гучалі, не спыняючыся, дзень за днём, гадзіна за гадзінай, хвіліна за хвілінай. Ім не было канца, падавалася, быццам яны былі заўсёды, ад пачатку свету, яны былі такой жа звычайнай з'явай, як спевы птушак і вой ветру.

Ніхто іх не заўважаў. Ніхто іх не хацеў заўважаць. Іх не чулі, з імі проста жылі. Іх чуў толькі я, і толькі я ведаў, што яны азначаюць. Я і мая жонка. Ды яшчэ дзед Юрась.

Праз кожны стрэл мяне кідала ў дрыжыкі. Дзе б я не знаходзіўся – дома, на ўроках, у гасцях – я нічога не мог з сабой зрабіць. Ніхто не мог зразумець, у чым прычына такой знерваванасці маладога настаўніка.

Разумеў толькі Звягінцаў. Ён стаў з'яўляцца ў школе куды часцей, чым раней; нічым асабліва не займаючыся, ён прыводзіў Валю і потым назіраў за маімі паводзінамі. Кожны раз, калі я пачынаў заўважна дрыжаць ад стрэлаў, ягоныя вусны расцягваліся ў гідкай усмешцы. У такія моманты ён падаваўся мне д'яблам з тонкімі вуснамі і поўнай адсутнасцю міласэрнасці.

Я цудоўна разумеў, што ён не мог ведаць пра тое, што я быў у лесе, і ў той жа час мяне не пакідала адчуванне, быццам бы ён ведае ўсё, да самых нязначных дробязей. Ведае, толькі не падае пакуль выгляду. Не прыйшоў час? Для чаго?

Гэты было самай натуральнай паранояй, і я нічога не мог з гэтым зрабіць. Мне хацелася прыдушыць лейтэнанта, але я толькі мацней сціскаў кулакі, каб не паказваць, як я яго ненавіджу. Ён жа толькі смяяўся мне ў твар.

– Як вашае сумленне, Максім Леанідавіч? – пытаўся ён. – Не сорамна за тое, што вы паднялі руку на афіцэра НКУС?

Я адказваў нешта незразумелае і адварочваўся ў іншы бок.

– Добра вам, шаноўны настаўнік. Вы-та проста паднялі руку, пры гэтым вы нічога не здолелі зрабіць. А вось вашая жонка ўдарыла афіцэра камісарыята, значыць яна здзейсніла напад на яго. Як вы думаеце, Максім Леанідавіч, што за гэта бывае?

Я наўмысна не адказваў на правакацыю.

– Маўчыце? Ну маўчыце і далей. Маўчанне – знак згоды са следствам. Вам ёсць што хаваць ад следства, Максім Леанідавіч?

– Мне няма чаго хаваць ад следства, таварыш старшы лейтэнант.

– Ды што вы. Паверце, усім ёсць што хаваць ад следства, трэба толькі больш уважліва прыглядзецца. Ніхто не святы, Максім Леанідавіч. За кожным ёсць грахі, і нашая задача – прымусіць кожнага ў іх пакаяцца. За вамі ёсць адносна невялікі грэх – спроба нападу на афіцэра НКУС. Можа быць, ёсць штосьці яшчэ, варта толькі пашукаць. За вашай жонкай грэх больш вялікі – за ёй не спроба, а натуральны напад на мяне. Да пэўнага часу я пра гэта маўчу. Можа быць таму, што ў мяне няма чыннікаў для таго, каб даць рух гэтай справе. Можа быць таму, што проста няма для гэтага жадання. Хто ведае? Запомніце, Максім Леанідавіч, толькі ад вас залежыць, ці панясеце вы аднойчы пакаранне за вашыя праступкі. А можа і не толькі ад вас...

Звычайна я нічога не адказваў гэтаму падонку, і ён, патэрарызаваўшы мяне пэўны час, сцішваўся і сыходзіў па сваіх справах. Але ніякай палёгкі мне гэта не прыносіла.

Я баяўся. Баяўся стрэлаў, баяўся Звягінцава, баяўся сваіх успамінаў, баяўся будучыні... Баяўся ўсяго.

Прайшоў сакавік, за ім амаль прайшоў красавік. Сышоў снег, на зямлі паказалася трава, на дрэвах – маладыя лісткі. Сонца ўзыходзіла і заходзіла, з захаду вецер прыносіў хмары, і яны выпадалі на зямлю дажджамі, якія паілі зямлю і жывую прыроду.

Мы гулялі з Таняй па-за вёскай, далёка ад леса і ягонай тайны, настолькі далёка, каб не чуць стрэлаў. Толькі так я мог хоць трохі супакоіцца.

Быў цёплы вясновы вечар, па полі разліваўся цьмяны пах маладой травы, ён кружыў галаву і праганяў страхі.

Я задумліва глядзеў у неба, на якім загараліся першыя зоры.

– Дзесьці там, за сотні кіламетраў ад нас, не гучаць стрэлы, а дзеці не губляюць бацькоў. Людзі прачынаюцца раніцай пад спевы птушак і пад іх жа засынаюць, не баючыся нічога і нікога. І толькі зоры для іх такія ж, як і для нас. Таня, чаму яны жывуць, а мы выжываем?

– Ніхто не ведае. Можа гэта выпрабаванне на трываласць, на смеласць, на чалавечнасць? Час прайдзе, і не стане звягінцавых і іх падручных. Яны знікнуць, і нашчадкі будуць з праклёнам успамінаць іх імёны. Яны самі гэтага ня ведаюць, але такі час будзе. А мы... нашыя ўчынкі стануць закладам шчасця нашых дзяцей. Ніхто не вінаваты ў тым, што нам выпала жыць у стагоддзе, калі пануюць боль і страх, калі людзі вымушаны хаваць глыбока ўсё самае лепшае, што ёсць у іх душах, каб проста выжыць. Нашыя душы будуць жыць заўсёды, а нашая кроў... яна напоіць

зямлю і прарасце новымі дрэўцамі для тых, хто прыйдзе пасля нас. Нам нельга шкадаваць, нам няма калі жаліцца – мы ня можам ведаць, колькі засталося нам, і ці засталося штосьці ўвогуле.

Я памаўчаў хвіліну.

– Ты б хацела мець дзяцей?

– А ты?

– Я хачу дачку, якая будзе падобная на цябе тварам, духам і розумам. Тваёй мужнасцю. Тваім сэрцам. Я хачу каб яна таксама гуляла пад зорамі, як мы зараз, але не баялася нічога ў свеце. Ці магчыма гэта зараз... Напэўна не. Я не хачу пакінуць сваёй дачушцы цёмную будучыню, якая яе чакае на гэтай зямлі.

Ты зазірнула мне ў вочы. Абвіла рукамі шыю.

– Яна не ўбачыць таго, што бачыў ты. Я веру, што для яе Бог абраў лепшую долю. І нашыя ахвяры гэтаму часу – і ёсць расплата за яе. Мы сваімі рукамі здабываем будучыню для сваіх дзяцей, нават калі вынікі нашай працы незаўважныя і на першы погляд нязначныя. Трэба проста сумленна пражыць жыццё, шчыра аддаваць сябе на карысць сваёй працы і пакінуць пасля сябе тых, хто будзе лепш за нас, тых, хто будзе больш чым мы заслугоўваць спакою і шчасця. Ці не ў гэтым сутнасць любові да Радзімы? Нашая зямля, зямля не савецкая, зямля беларуская, стогне разам з намі і разам з намі плача. Дык можа з нашымі дзяцьмі яна будзе радавацца, а не стагнаць?

Глядзі, на нашым небе з'яўляюцца новыя зоркі . Ці гэта не прадказанне таго, што наперадзе новы дзень і новы лёс? Ты хочаш дачку? Я дам яе табе. Вер мне.

Вакол нас дзьмуў ветразь, гойсаючы ў высокіх травах. Вецер зарываўся ў твае валасы і яны плылі ў ім, як па хвалях. Далёка на ўсходзе загараўся новы дзень. Мы не маглі

Але я ўжо нічога не чуў, я бег да ўпраўлення НКУС, якое месцілася праз дзве вуліцы ад нашага дома. Людзі спалохана глядзелі мне ўслед, але мне было не да іх. Хутчэй, хутчэй... Толькі б сэрца не выскачыла з грудзей, толькі б не ўпасці, не дабегшы – бегаць я ніколі добра не ўмеў і дыхалка ў мяне не адрознівалася асаблівай вытрымкай. Дом, яшчэ дом... Вось ён, патрэбны будынак. Яшчэ сорак метраў... дваццаць... дзесяць...

У дзверы я ўламаўся, не спыняючыся, наўпрост наляцеў на іх локцем. У пакоі адпачывалі два чэкісты, яны адразу падхапіліся і пацягнулі рукі да кабураў, але, заўважыўшы вясковага настаўніка, супакоіліся і зноўку селі, як сядзелі.

Я адшукаў вачыма дзяжурнага. Ён сядзеў убаку ад ухода і, відавочна, да майго ўварвання корпаўся ў нейкіх паперах. Зараз жа ён здзіўлена і дапытліва глядзеў на мяне. Мне падалося, што ў першы момант ён не пазнаў мяне, але праз секунду ён ужо расплыўся цынічнай пахмылкай.

– Ааа, гэта вы, Максім Леанідавіч! Чым магу быць карысным?

– Звягінцаў! Дзе ён? – я з цяжкасцю прахрыпеў пытанне, усё яшчэ бессэнсоўна змагаючыся з дыхалкай.

– Капітан Звягінцаў, вы маеце на ўвазе?

– Як... капітан?! Мне патрэбны старшы лейтэнант... Звягінцаў.

– Ну, у нашым аддзеле Звягінцаў толькі адзін, і ад учорашняга дня ён капітан, так што, мяркую, вы шукаеце менавіта яго. На жаль, зараз яго няма на месцы, ён з'ехаў па працы. Можаце мне сказаць, што вы ад яго хацелі?

– Мая жонка, ён сёння арыштаваў маю жонку! Я хачу ведаць, на якой падставе, і, галоўнае, дзе яна зараз!

– А, Таццяна Віктараўна, калі не памыляюся? Так-так, сёння сапраўды арыштавалі такую. Прашу прабачэння, не

магу вам сказаць прычынаў яе арышту, гэта службовая тайна, вы ж разумееце, – і гэтая курва зноўку агаліла свае жоўтыя зубы ў сваёй крысінай пасмешцы.

– Дзе яна зараз? Ды скончыш ты лыбіцца, нарэшце? Дзе мая жонка?!

– Вашая жонка, шаноўны настаўнік, этапавана па рашэнні пазасудовай тройкі для прыняцця пакарання згодна з артыкулам...Эй! Эй! А ну вярніся!

Куды там. Я зноўку бег, не спыняючыся ні на секунду, але ўжо не адчуваў шалёна лупячага сэрца – яно правалілася кудысьці да пятак ад страху. Тройка? Пакаранне? Таня! Танечка!!!

Побач са сваёй хатай я спыніўся. Этапавалі... Канешне, яе адправілі кудысьці адсюль, але з ёй усё будзе добра, яна вернецца, жывая і здаровая. Этапавалі. Ці не ў лес?!

Я застагнаў ад гэтай думкі. Нeee. Канешне, не. За што? За тую дурную спробу заляпіць далонню Звягінцаву па мордзе? Не можа быць. Немагчыма. Неверагодна. Неверагодна?

Я рэзка рвануў з месца. Думка пра тое, што Таню маглі адвезці ў расстрэльны лес раптам ледзьве не зрабіла з мяне вар'ята.

Зямля магла прыняць каго заўгодна. Расстраляць маглі любога. Майго суседа, бацьку Ясіка, мяне самога. Але ЯЕ?!

Я не бачыў перад сабой нічога, не дзіва, што я не заўважыў буйную галіну, якая валялася пасярод дарогі на выездзе з вёскі. Я зачапіўся за яе ботам і паляцеў у прыдарожны бруд.

– Курва... – я застагнаў, але не ад болю, а ад прыкрасці. Падхапіўся, пабег далей. Мне падавалася, што зараз з майго рота пойдзе крывавая пена, настолькі балюча было дыхаць, але куды больш балюча мне было ад думкі, што я магу спазніцца, не дапамагчы, не ўратаваць.

Лаз, той самы лаз. Я нырнуў пад яго, з галавой зарыўшыся ў бруд, які застаўся ў яме пасля апошняй залевы. Вырваўся з палону на другім баку, адпляваўся. Хутчэй!

У лесе гучалі стрэлы. Яны пачаліся ўжо некалькі дзесяткаў хвілін таму, але заўважыў я іх толькі пасля таго, як трапіў у сам расстрэльны лес. Што, калі я спазніўся? Што, калі яна тут?

Нее. Я вар'ят, самы натуральны вар'ят, яна не магла трапіць сюды, яе адвезлі далёка адсюль, пасадзілі ў турэмны вагон, этапавалі ў іншы раён, іншую вобласць. Хай бы ёй далі пяць, дзесяць, дваццаць год лагеру, але яна павінна быць жывой!

Яна не тут... яна не тут. Не тут!

Я ўпаў на зямлю, папоўз, як змяя. Канешне ж, яна не тут, але я не магу не ўпэўніцца ў гэтым дакладна. Я мушу сам, на свае вочы праверыць гэта, інакш мне ніколі не будзе спакою.

Я спыніўся толькі за дваццаць метраў ад расстрэльнай каманды. Падпаўзці бліжэй было б шаленствам нават для мяне зараз. Мяне й так не заўважылі, толькі дзякуючы таму, што чэкісты былі цалкам занятыя выкананнем.

Я адшукаў вачыма Звягінцава. Гэтая курва, як і ў мінулы раз, не прымала ўдзел у самім расстрэле, ён толькі аддаваў загады, флегматычна назіраючы за працэсам. Ягоныя рукі працíралі элегантны нямецкі вальтэр.

Яма была поўная ўжо амаль напалову. Нават са свайго месца я мог бачыць, што сярод растраляных не было аніводнай жанчыны. У мяне нібыта скала звалілася з плечаў.

Гэтым разам усё было па-іншаму. Я гладзеў, як чэкісты страляюць у патыліцы, назіраў за тым, як яны валакуць чарговага асуджанага да ямы і толькі радаваўся, калі разумеў, што чарговая ахвяра не падобная на маю жонку, на

маю Танечку. Гуманізму няма месца ў сэрцы, якое б'ецца не для ўсіх, а толькі для адной.

Мае вусны лічылі кожнага забітага. Іх колькасць блізілася ўжо да трыццаці чалавек. Па ўсім, хутка партыя павінна была скончыцца, яшчэ чалавек пяць, не больш. Божачкі, Божа, яе няма?

– Усё, таварыш капітан, – старэйшы з групы хутка адрапартаваў Звягінцаву. Ён казаў штосьці яшчэ, але я не чуў ягоных слоў. Яе няма тут! Няма! Яна жывая, яна будзе жыць! Будзе жыць, мая мілая, мая каханая, мая самая даражэнькая!

– Застаўся толькі адзіны кліент, – старшы панізіў голас. – Той самы.

Па маіх вушах нібыта молатам грукнулі халодныя словы Звягінцава.

– Вывадзіце.

У грузавік рынуліся два канваіра. Я закусіў вусны, з-пад зубоў паказалася кроў.

Цябе нават не вывалаклі – выштурхнулі з машыны. Ты білася, білася, як кацяня, на якое навалілася зграя шалёных сабак, нават зараз у цябе засталіся сілы змагацца!

Маё цела адмаўлялася падпарадкавацца мне. Перад вачыма паплылі чырвоныя плямы. Я сплю! Сплю! Гэтага проста не можа быць. Таня!

Капітан павольна пыдышоў да цябе, паглядзеў зверху ўніз, падняў нагу, нібыта з лянотай пнуў у бок. Ты пакацілася па бруднай зямлі, прыціскаючы свае маленькія ручкі да жывата. Ты нават не крычала ўжо, толькі ледзьве чутна ўсхліпвала, але я чуў усё.

Звягінцаў, гэты злы геній, гэты д'ябал, зноўку наблізіўся. Ён схапіў цябе за валасы і пацягнуў да ямы. Ты адбівалася, як магла, ты, маленькая дзяўчынка, змагала-

ся за сваё жыццё, калі я, дарослы мужчына, не мог прымусіць сябе нават зрушыць палец!

Мой позірк спыніўся на тваёй шыі. Там матляўся на тонкім срэбным ланцужку той самы медалік – падарунак дзеда Юрася, "О, Марыя, маліся за нас...".

Раптам ты паглядзела ў мой бок. Вочы, твае самыя прыгожыя ў свеце зялёныя вочы, злавілі мяне пасярод высокай травы і маладых дрэваў, зараз яны неадрыўна сачылі за мной.

Цябе падвалаклі да ямы, рэзкім пінком у нагу прымусілі апусціцца на калені. Ты не заўважала ўзброеных падонкаў вакол цябе, ты глядзела толькі на мяне.

Раптам сілы вярнуліся да майго цела. Я сутаргава паспрабаваў падняцца на ногі, але твой спужаны погляд зноў-ку прыкаваў мяне да зямлі. Ён крычаў мне "Не! Не смей!". І, каб я мог дакладна зразумець ўсё тое, што ты хацела сказаць мне вачыма, ты ледзь бачна кіўнула галавой ў бакі.

– Таццяна Віктараўна, вы ж верыце ў Бога? Памаліцеся яму, я дазваляю вам! І, хоць вы не заслугоўваеце гэтага, я даю вам такую магчымасць. У вас роўна паўхвіліны, – ён падняў "вальтэр" і рэзка ўзвёў курок.

Ты не чула яго. Ты не чула ані слова з таго, што ён казаў – ты толькі глядзела на мяне і моўчкі развітвалася са мной, і твае вочы поўніліся слязамі ад таго, што ўжо нічога нельга было змяніць. Ты плакала і твае слёзы, падаючы на зямлю, вострымі кіпцюрамі рвалі мне душу. Ты шаптала словы, і чэкісты думалі, што ты молішся Богу – ты ж малілася мне, малілася мне і развітвалася са мной, у апошні раз аддаючы мне свой позірк, за які я й закахаўся ў цябе тады, сем гадоў таму , калі і ты, і я былі яшчэ дзецьмі. Хлоп! Твае веі на імгненне самкнуліся, і я застаўся ў іх на секунду, толькі на секунду, каб застацца там на вечныя стагоддзі, над якімі

не пануе ні НКУС, ні паганая савецкая ўлада, ні сама смерць.

– Як твой бог, сука? Ты памалілася яму? Да сустрэчы ТАМ!

– Кахаю, – прашаптала ты аднымі вуснамі і заплюшчыла вочы.

Палец у скураной пальчатцы пацягнуў курок.

Свет заціх, толькі два сэрцы шалёна лупілі ў такт.

А праз секунду адно сэрца замоўкла назаўжды.

І не было ні болю, ні надзеі. У свеце панавала чорная цішыня.

# “TACCIANKA NIE ŻYJE!!![2]”

Дзень. Ноч. Дзень. Ноч. Дзень? Не, здаецца, ноч.

Сэрца тахкала, як мне падавалася, не часцей за ўдар на хвіліну.

Ціха. Да звону ў вушах ціха. Ні стрэлаў, ні галасоў, ні спеву птушак... Нічога. Ноч. Толькі ноч бязгучна размаўляла са мной.

Я разляпіў веі. Першую хвіліну я не бачыў ні халеры, потым акурат перад маім носам з'явіліся лісткі травы і іголкі з елак – спачатку размыта і няўпэўнена, потым усё больш і больш ясна.

Я ляжаў на жываце, уткнуўшыся носам у зямлю. Чакана пахла перагнілай травой і грыбамі.

Напружыўшыся, я здолеў перавярнуцца на спіну. Потым паспрабаваў устаць... і ўпаў. Сілаў не было зусім. Пасля яшчэ адной спробы я падняўся на локцях і папоўз туды, дзе, як мне падавалася, было больш святла.

Чаму вакол нікога няма? Чаму такая цішыня? Перапынак паміж расстрэльнымі партыямі? Напэўна...

Мяккая трава пад пальцамі раптам змянілася халоднай зямлёй. Гэта яшчэ што такое? Зямля? Чаму зямля?

Я падняў галаву і азірнуўся.

Я не крычаў, не. Я толькі плакаў.

Навокал, у метрах дваццаці вакол мяне ўзвышаліся высокія яліны. Сам я стаяў на каленях на паляне. Той самай расстрэльнай паляне, дзе пустымі чорнымі вачыма глядзелі ў неба новыя брацкія магілы, якія яшчэ не паспелі нават трохі абрасці травяным дыванам.

---

[2] Таццянка загінула! (пол.)

Я стаяў на магіле.

На тваёй, kochanie, магіле.

Я бег прэч. Сілаў мне даў страх, ён даў мне нават больш, чым магло змясціцца ў маім хворым целе, ён даў мне столькі, што энэргія наўпрост хвастала навокал, і я несся, куды – не разбіраў сам, толькі далей, далей, не бачыць, не памятаць, не жыць...

Я натыкаўся на дрэвы, я не бачыў іх, біўся аб іх і, не адчуваючы болю і крыві, якая залівала мой твар, бег наперад.

Я падаў, але падрываўся і зноў ляцеў, нібы за мной неслася зграя дэманаў з пекла.

На плот я рэзка наскочыў з разбегу, наўпрост ударыўся ў яго ўсім целам. Адліп, споўз па дошках на зямлю. Падняўся і, хістаючыся, пайшоў уздоўж.

Далёка наперадзе загараўся світанак. Ноч, якая падавалася бясконцай і бязмежнай, блізілася да сканчэння. Я ішоў да сонца, нібы я ішоў да цябе, падаючы і баючыся міргнуць вачыма, нібыта ад гэтага сонца магло знікнуць.

Сонца не знікала. Яно з лянотай цягнула з-за гарызонта свае тонкія промні, і яны абуджалі ўсё на зямлі. Раптам прачнуўся і загаманіў лес. Нечакана зноўку заспявалі птушкі. Недзе далей забрахалі сабакі. Забрахалі сабакі? Забрахалі сабакі!!!

Брэх гучаў дзесьці наперадзе, метрах у двухстах ад мяне. Што за?..

Я занадта позна зразумеў, што іду па ветру. Калі ў мінулыя разы я ішоў у бок ад брамы супраць ветра, сабакі не адчувалі чужога паху. Зараз жа...

Нечакана ў сарака метрах я ўбачыў лаз. Убачыў нібыта ў тумане – зрок адмаўляўся мне падпарадкоўвацца, ногі таксама, але я ўсё роўна ішоў нібыта ў сне туды, дзе чарнела прагаліна на месцы праламаных дошак.

Стрэлу я нават і не пачуў. Куля раструшчыла дрэва на ўзроўні галавы справа ад мяне. Да лазу заставалася яшчэ нейкіх метраў пяць, калі я пачуў крыкі вартаўнікоў і ўбачыў псоў, што імкліва беглі насустрач.

На бліжэйшым кусце яшчэ адна куля зрэзала галінку. Далей так працягвацца не магло.

Я кінуўся на зялю і папоўз на жываце да ратавальнага лазу.

Сабакі былі далёка, НКУСаўцы яшчэ далей, калі я прарваўся праз дошкі забора, парваўшы рэшткі вопраткі і разадраўшы канчаткова рукі.

Я падхапіўся і пабег з усіх сілаў прэч, у бок вёскі, імкнучыся, каб мяне не заўважылі з боку дарогі тыя, хто будзе гнацца за мной на машынах.

Дзесьці далёка ззаду крычалі. Я не разбіраў, што. Брахалі сабакі – па маім следзе ішла пагоня. Не трэба было мець выдатную фантазію, каб зразумець, што са мной было б у тым выпадку, калі б я трапіўся ў рукі чэкістаў.

Кіламетры два я прабег, ні разу не спыніўшыся, не азірнуўшыся, на адным подыху, нават не заўважыўшы гэтага. Вёска ляжала перада мной метрах у пяцістах.

Сонца пачало выпаўзаць з-за гарызонта краёчкам, маленькім серпікам – было гадзінаў пяць, не больш. Здаецца, я адарваўся ад пагоні, але супакойвацца было нельга. Толькі б дабрацца... Куды?

Да старога дзеда Юрася.

Гэтая думка нечакана прыйшла мне ў галаву і падалася цалкам слушнай. Дамоў я не пайшоў бы ў любым выпадку – я б проста звар'яцеў там пасярод пустых сценаў, якія памяталі тваю цеплыню і з усіх бакоў свяціліся ёй. А больш не было аніводнага месца на зямлі, дзе б мяне прынялі, як сябра, як сына, дзе б мяне падтрымалі і абаранілі. Толькі стары Юрась...

Брэх сабакаў зноў нагнаў мяне, калі я ўжо ламіўся ў хату да дзеда. Пагоня дакацілася да вёскі і зараз чэкісты пачыналі абшукваць хаты ў пошуках мяне, як і тады, калі патруль НКУС уварваўся ў нашую хату, шукаючы нейкага шчасліўца, які збег з-пад расстрэльнага рэвальверу.

Я калаціў у дзверы рукамі і нагамі. Падавалася, што прайшла бездань часу, пакуль за дзвярыма я не пачуў глухое шарканне ног старога.

– Што за... – Стары пачаў было сварыцца з-за таго, што яго паднялі досвіткам, але на паўслове яго скарга абарвалася. – Максім? Што з Табой? Што здарылася? Дзе Таня?

– TACCIANKA NIE ŻYJE!!!

– Co... O co ty, kurwa, mowisz?![3] Што ты вярзеш?!

Я не адказаў. Я проста пераваліўся за парог і ўпаў на падлогу да ног старога.

Дзед Юрась падняў мяне так лёгка, нібыта я ўвогуле не важыў нічога – ягоная сіла зусім не зменшылася за доўгія гады пакутлівага жыцця. Стары асцярожна паклаў мяне на свой жорсткі ложак.

– Максім, Максімка, што здарылася?! Сынку, што з Танечкай? Што ўвогуле адбываецца?!

Я глытнуў вады, якую паднёс мне ў келіху дзед.

– Тані больш няма. Дзеду, Танечкі больш няма!! Маёй маленечкай, маёй каханай няма!

Дзед Юрась стаяў перада мной на каленях і гучна плакаў. Бедны стары любіў Таню больш, чым дачку, ён не верыў мне, ён адмаўляўся верыць.

– Хто? Хто забіў?! Хто забіў яе?!

Я адказаў адным толькі словам.

– Звягінцаў.

---

[3] Што... Што ты, курва, вярзеш?! (пол.)

Стары закрычаў. У ягоным крыку было столькі болю і ненавісці, што я падумаў, як ад гэтага жудаснага лямanту павылятае шкло ў вокнах. Дзед Юрась ускочыў на ногі і пабег прэч з пакоя. Ён нават не спыніўся, каб адчыніць дзверы, а наўпрост наляцеў на іх усім целам, і, выбіўшы іх з рамы, выскачыў на двор.

Ён крычаў у ранішняе неба, ён слаў праклёны гэтаму небу, сонцу, Звягінцаву і ўсяму свету.

Стары крычаў і плакаў, і ад гэтай жудаснай вакханаліі навокал прачыналіся спужаныя вяскоўцы, яны выглядвалі ў свае вокны, каб даведацца што здарылася і адкуль нясецца гэты сапраўды нечалавечы крык.

Па ўсёй вуліцы грукалі дзверы, людзі выбягалі з хатаў і бачылі, як стары рве на сабе кашулю.

Вёска гаманіла тысячай галасоў, і, хоць ніхто не разумеў, што ж насамрэч здарылася, усе адчувалі наўпрост разлітыя ў паветры адчай і небяспеку.

Ля хаты старога імкліва збіраўся натоўп, сюды са ўсіх ног бегла каля двухсот чалавек, калі па вуліцы разляцеліся глухія хлапкі вінтовачных стрэлаў. З боку расстрэльнага лесу ў вёску ўварваліся чатыры чорныя варанкі, чалавек дваццаць шэрагоўцаў, узброеных вінтоўкамі Мосіна беглі па дарозе, на павадках заліваліся брэхам штук пяць агромністых сабак. Яшчэ прыкладна дзесяць чэкістаў набліжаліся з боку аддзялення НКУС, у якім я быў мінулым вечарам.

Хату абкружылі з усіх бакоў.

Натоўп адцяснілі стрэламі ў паветра і сабакамі шэрагоўцы, яны ж зладзілі імправізаваную агароджу вакол нашага схоўішча.

Стары з жудасным рычаннем уварваўся ў хату. Ён зачыніў дзверы на замок, рэзкім рухам скінуў мяне з ложка, на якім я сядзеў, імкліва адшвырнуў у бок сам ложак. За-

тым ён схапіў лом і адарваў ад падлогі чатыры дошкі. Пад імі была неглыбокая яма, у якой ляжала штосьці доўгае, загорнутае ў шчыльную тканіну. Пад тканінай я ўбачыў тры вінтоўкі, пра якія Стары распавядаў мне на такія далёкія, як зараз падавалася, Каляды.

У той жа яме ляжала невялікая скрыня з набоямі.

На вуліцы за плотам варанкі раз'ехаліся такім чынам, што кожны з іх утвараў натуральную заслону ад куляў для тых, хто будзе трымаць аблогу.

Дзед Юрась кінуў мне адну вінтоўку. Яна грукнулася аб падлогу, я не здолеў злавіць яе – мае рукі дрыжалі. Я падняў зброю, аглядзеў. Я не ўмеў страляць, але вырашыў рабіць усё тое, што і Стары.

На двары сцішылася – не рычалі рухавікі варанкоў, маўчалі чэкісты, замоўклі вяскоўцы, якіх адагналі метраў на сорак ад хаты, але тыя ўсё роўна назіралі, што ж будзе адбывацца далей.

Цішыня стаяла роўна хвіліну. Потым на двары мы пачулі хуткія і ўпэўненыя крокі.

– Ад імя савецкай улады я загадваю вам адчыніць дзверы і даць супрацоўнікам Камісарыяту арыштаваць злачынцу, – добра знаёмы голас адразу прабраў холадам да самых касцей.

– Тваё імя! – прагрымеў голас Старога.

– Я паўтараю...

– Тваё, курва, імя!!!

– Капітан Камісарыяту Унутраных Спраў Звягінцаў.

Гэтага было дастаткова. Дзед Юрась, канчаткова ашалеўшы ад болю і нянавісці, выбіў руляй вінтоўкі шкло ў вакне і стрэліў у бок чэкіста.

Куля прайшла міма – вочы падвялі Старога на схіле гадоў.

ведаць, што ён нам прынясе. Мы маглі толькі верыць. І мы верылі ў лепшае.

Ранак пачаўся выццём сабак. Сонца ўжо амаль узышло – была шостая гадзіна раніцы. Я прачнуўся ад таго, што ў нашае вакно гучна грукалі. Я падняўся з ложка, адразу за мной падхапілася Таня.

– Што? – яна спужана глядзела на мяне.

Я паціснуў плячыма і выйшаў з пакоя да дзвярэй. За імі хтосьці гучна галасіў. Я не адразу пазнаў голас Звягінцава – настолькі ён быў п'яны. Іншы голас я, падаецца, чуў упершыню.

– Што трэба?

– Дзверы адчыні!

– Спачатку скажыце што вам трэба.

– Ооо, што трэба? Ад цябе, морда нічога, і ад тваёй шаноўнай жонкі нам ні халеры не трэба. Проста я завітаў сказаць, што ваш час скончыўся. Сёння яго арыштавалі, так, арыштавалі! Я сам аддаваў загады пры гэтым!

– Каго арыштавалі? Што вы вярзеце?

– Каго? Ён пытаецца, каго! Ты, морда, пакуль ня ведаеш, але хутка ты будзеш ведаць усё, зусім усё!

– Хадзем, лейтэнант, нам трэба адпачыць, сёння быў дурны дзень. Потым зоймешся імі, – у маналог Звягінцава ўмяшаўся другі голас, судзячы па ўсім, больш цвярозы.

Звягінцаў зарагатаў.

– Адлічвай дні, адлічвай хвіліны, падла. Я вярнуся за вамі ўсімі! Усімі!

Ягоныя воплі былі чутны яшчэ хвілін дзесяць, пакуль спадарожнік уводзіў яго ад нашай хаты.

Ты стаяла побач, і я адчуваў як цябе калоціць ад страху.

# “Кахаю”

Дзверы былі адчыненыя, калі я вярнуўся дадому. Я не здзівіўся – мы зрэдку зачынялі хату, калі хтосьці з нас быў побач з домам, але зараз штосьці насцярожыла мяне яшчэ за некалькі крокаў ад уваходу. Штосьці было не так, як звычайна, нейкая пакінутасць панавала ў двары, і з дома веяла не сямейнай цеплынёй, а пахам разбуранасці і няўтульнасці. Што? Што...

– Таня! Таняяяяяя!

Ты не адклікалася. Я адчуваў нейкім унутраным пачуццём, што цябе няма побач, што ты дзесьці не тут, але працягваў крычаць, адчуваючы як у душы расце занепакоенасць.

– Тааааня!

Шкло. Бітае шкло пад нагамі. Абрус, скінуты са стала, перагорнутая шафа з кнігамі. Разбіты кубак на падлозе, па якой расплылася белая пляма малака. Тваю душу...

– Паненку забралі, Максім Леанідавіч, – я раптам пачуў асцярожны голас за спіной. За дзвярыма стаяла нашая суседка – суханькая бабка, якая заўжды прыносіла нам малако. Яна стаяла, прыціснуўшы тонкія рукі да грудзей, і вачым, поўнымі слёз, глядзела на мяне.

– Хто забраў? Куды?

– Тыя самыя, з Камісарыяту, якія да вас прыходзілі некалькі разоў. Іх было чалавек пяць, з сабакамі. Паненка крычала, што нікуды не пойдзе, але яны ўварваліся, ўсё раскідалі і за рукі вывалаклі Танечку на двор. У іх яшчэ за галоўнага быў той высокі... Зва... Звя... Максім Леанідавіч! Максім Леанідавіч!

Звягінцаў, зразумеўшы, што дарма так адкрыта выйшаў пад вокны дзеда Юрася, паваліўся на зямлю, перакаціўся пад нейкае бервяно і залёг там, вырваўшы з кабуры той самы вальтэр, з якога ён забіў маю Танечку.

– Я даю вам апошні шанец адумацца, – выкрыкнуў ён са свайго сховішча. – У адваротным выпадку я загадаю адкрыць агонь.

Адказам на гэтую прапанову была яшчэ адна куля з вінтоўкі Старога.

Я таксама падняў зброю і выглянуў у вакно.

У гэты самы момант Звягінцаў аддаў загад.

– Па вокнах плі!

Я нават не паспеў націснуць на курок, як рэзкі боль адшвырнуў мяне ад вакна. Плячо было прастрэлена, з яго біла кроў. Было д'ябальскі балюча і прыкра ад таго, што ўсё скончылася ТАК.

Дзед Юрась пасылаў кулю за куляй ў вакно, не выглядваючы з яго, арыентуючыся толькі на інтуіцыю.

Навокал чэкісцкія кулі білі ўсё, што траплялася на іх шляху. Падлога ў момант пакрылася дываном з бітага шкла і керамікі, аскепкі сыпаліся нам на галовы, ад іх не было ратунку.

Бойка цягнулася хвіліны тры. Я спрабаваў хоць неяк сціснуць рану аслабелымі пальцамі. Гэта не давала аніякага плёну – з яе ва ўсе бакі хвастала кроў. Дзед Юрась, здавалася, быў недасягальны для куляў, ён зноў ды зноў падымаў вінтоўку і спускаў курок. Адзін раз мне падалося, быццам я пачуў з вакна крык болю, хоць, можа быць, мой слых мяне падвёў.

Але доўга перастрэлка аднаго супраць сарака цягнуцця не магла. Дзед Юрась, неасцярожна высунуўшыся ў вакно,

каб адшукаць вачыма гніду – Звягінцава, раптам ускрыкнуў, схапіўся за грудзі і аплыў на падлогу.

– Вось... і ўсё, сынку... – ён расцягнуў вусны ў змучанай усмешцы. – Я б... хацеў быць... Богам... каб іх... – ён зайшоўся ў кашлі, з ягонага рта пачала кропаць кроў, але ён сабраўся з сіламі. – Іх... на нашае месца...

Чэкісты працягвалі страляць па вокнах яшчэ прыкладна хвіліну. Потым, нарэшце зразумеўшы, што ў адказ не страляюць, яны таксама скончылі стральбу.

Я ляжаў і чакаў, калі яны ўвойдуць у хату. Увойдуць задаволенымі пераможцамі старога дзеда і звар'яцелага маладога хлопца, які нават вінтоўку не ўмеў трымаць у руках.

Дзверы са скрыпам павольна адчыніліся. Адразу ў хату зазірнулі дзве вінтовачныя рулі. Шэрагоўцам, якія стаялі за дзвярыма, не трэба было ўваходзіць у хату, каб убачыць што абодва абаронцы ляжаць на залітай крывёй падлозе. Ствалы падняліся дагары, каб даць дарогу ЯМУ.

Звягінцаў зайшоў у пакой сваёй звычайнай хадою – хутка і цвёрда. Падышоў да Старога, лёгенька пнуў яго ў бок ботам. Дзед Юрась з апошніх сілаў прыпадняў веі.

– Ну навошта ты ўвязаўся ў гэта, дзед? – з пацучынай усмешкай на твары запытаўся Звягінцаў.

– За паненку... Таню, сука, – і стары дзед схапіў нож, які валяўся на падлозе побач з ім.

Прагрымеў стрэл з вальтэра, ён гучна разнесся па пакоі. Дзед Юрась з разварочаным куляй тварам заваліўся на бок і заціх, выпусціўшы нож, які прызначаўся таму, хто адабраў у старога апошняга дарагога яму чалавека.

Звягінцаў адвярнуўся ад беднага дзеда, паглядзеў у мой бок.

– О! А вось і ты, гніда, – амаль весела сказаў ён. – Ну што, дазмагаўся?

Я сціскаў зубы так, што яны хіба не крышыліся.

– Вінтоўку сюды, – роўным голасам запатрабаваў чэкіст.

Шэраговец працягнуў яму сваю зброю.

Я нават не паспеў здзівіцца, навошта Звягінцаву спатрэбілася вінтоўка, каб забіць мяне, калі ў яго быў вальтэр. Апошнім, што я ўбачыў, было імклівае набліжэнне прыклада.

Свет узарваўся на тысячы рознакаляровых абломкаў.

Больш я не адчуваў нічога.

# Спадчына ад'ютанта генерала Станіслава

Дні ў раённым аддзяленні Камісарыяту нічым не адрозніваліся ад начэй. Тут заўжды было цёмна, пахла сырасцю, крывёй і дымам. А яшчэ тут былі пацукі. Шмат пацукоў – цэлае пацучынае войска маршыравала па падлозе падземных камераў. Пацукі не нападалі на жывых вязняў – яны былі сытыя, бо заўжды маглі пачаставацца тымі, каму было ўжо ўсё роўна.

Допыты цягнуліся бясконца, адзін за адным, змяняліся следчыя, змяняліся ахоўнікі. Нязменным было толькі пачуццё поўнай пустэчы. Так, я не адчуваў абсалютна нічога: ні болю, ні страху, ні жалю. Мяне білі, а я не заўважаў гэтага. Мяне пыталі аб чымсьці, я не чуў пытанняў і маўчаў у адказ, за што атрымліваў чарговую порцыю ўдараў па галаве і жываце. Часам мне падавалася, што я памёр, і мая душа аднекуль зверху назірае за тым, як нястомныя каты зачымсьці працягваюць здзекавацца над мёртвым целам.

Я згубіў лік часу. Для мяне было абсалютнай тайнай, колькі я ўжо тут – дзень, месяц, год альбо стагоддзе. У камерах не было вокнаў, я не бачыў святла, за выключэннем слабога асвятлення настольных лямпаў новых следчых, да якіх мяне раз за разам цягнулі на допыты.

Памятаю, калі я ўпершыню абудзіўся тут, пасля таго страшнага ўдару прыкладам, і мяне прывалаклі на допыт, я папрасіў следчага – маладога хлопца маіх гадоў з абыякавым выразам на твары – паклікаць маёра Раманава. Той падняў галаву ад сваіх папераў і крыху здзіўлена запытаўся:

– Раманава? Маёр Раманаў выбыў ужо два тыдні таму.

– Выбыў? Што гэта значыць?

– Быў зняты з пасады і растраляны па абвінавачанні ў... прынамсі, для вас гэта не мае аніякай розніцы, таварыш Савіцкі Максім Леанідавіч, тысяча дзевяцьсот дзесятага году нараджэння, я не памыляюся?

Увесь час мне задавалі нейкія пытанні, сэнсу якіх я не мог зразумець. Здаецца, мяне вінавацілі ў злачынствах супраць саветаў, шпіянажы, ці чымсьці падобным да таго. Следчыя хацелі каб я падпісаў нейкія паперы, я ж у адказ на гэта толькі адварочваўся і матляў галавой. За гэта мяне білі, але мне было ўсё роўна. Я толькі здзіўляўся, чаму мяне дагэтуль не расстралялі альбо проста не забілі насмерць у камеры.

Мне не давалі спаць, фактычна не давалі есці.

Я не чакаў смерці як вызвалення. Я нічога не чакаў, як нічога не адчуваў. Бог быў там, наверсе, і ён назіраў за ўсім, што са мной адбывалася. Я не хацеў быць Богам. Я б не змог быць такім бессардэчным, якім мусіць быць Бог. Міласэрнасць – тыповая рыса людзей. Міласэрнасць – тыповая рыса анёлаў, але не памагатых Бога, а тых, хто тут, на зямлі, ахвяраваў сабой. Мая Танечка, дзед Юрась, тысячы тых, хто спачыў з куляй у галаве толькі таму, што меў няшчасце нарадзіцца ў час звяроў – менавіта яны былі анёламі. Яны ішлі праз пакуты і паміралі са словамі кахання на вуснах – яны сталі маімі анёламі, яны сталі маёй рэлігіяй. І толькі ім я шаптаў бясконцыя малітвы ў рэдкія моманты, калі мяне, акрываўленага і скалечанага, на кароткі час пакідалі аднаго ў камеры.

Недзе праз тыдзень – ці тысячагоддзе? – мяне ў чарговы раз вывалаклі з камеры, каб адвесці на допыт. Кабінет следчага, у якім я ведаў кожны міліметр падлогі, у якім на кожнай сцяне былі сляды маёй крыві, быў незачынены. За ста-

лом сядзеў хтосьці, каго я яшчэ ні разу не бачыў на допытах. Гэты чалавек, апусціўшы галаву, чытаў нейкія дакументы, якія ляжалі перад ім.

Канваіры пасадзілі мяне на жорсткі стул, старшы з іх адрапартаваў:

– Савіцкага прывялі, таварыш капітан.

Ах вось яно што! Чарговы следчы быў нікім іншым, як самім Звягінцавым. Прывітанне, курва, даўно не бачыліся!

Забойца падняў галаву і з усмешкай паглядзеў на мяне.

– Ну як вашыя справы, Максім Леанідавіч? Чуў, што вы ніяк не жадаеце праявіць разуменне і пасупрацоўнічаць са следствам. Гэта няветліва з вашага боку! Бачыце, нават мяне ад працы адарвалі, каб я з вамі паразмаўляў. Ведаеце, вядзенне следства гэта не мой профіль – я ўсё больш па аператыўных справах, але ў вашым выпадку я згадзіўся папрацаваць з вамі, – ён зрабіў кароткую паўзу, нібыта чакаючы, што я штосьці скажу ў адказ. Я маўчаў. – Я таксама чуў, што вы цікавіліся Раманавым. Я, па-шчырасці, не здзіўлены, Раманаў да вас і вашай жонкі ставіўся вельмі добра, не раз казаў падначаленым, каб дапамагалі вам у выпадку чаго. Увогуле Раманаў быў такі чалавек... занадта мяккі. Гэта яго й згубіла. Ну нельга на такой пасадзе мяккасць праяўляць. Прыйшлося з гэтым змагацца...

– Гэта ты на яго данос напісаў? – раптоўна падаў я голас.

– Не данос, Максім Леанідавіч, а службовую дакладную запіску, з дасканалым апісаннем усіх недахопаў і праступкаў маёра. Што рабіць, час такі – трэба быць на ўсе сто ўпэўненым, што навокал толькі надзейныя людзі. Што рабіць... – паўтарыў ён.

– Табе, курва, узяць твой паганы вальтэр і застраліцца, – параіў я.

Звягінцаў задумліва выцягнуў згаданы пісталет з кабуры і аглядзеў яго. Потым гэтак жа меланхалічна ён запіхнуў яго назад.

– Мне тут казалі, што ты, сука, нібыта не баішся болю і біць цябе не мае аніякага сэнсу. Можа быць, я не буду правяраць, мне ўсё роўна. Хачу, каб ты разумеў – у мяне вельмі няшмат часу, сам ведаеш, палігон чакае, – ён зноўку ўсміхнуўся. – З гэтай нагоды я не буду расцягваць бясспрэчную радасць ад размовы з табой, ты падпішаш пратакол, які павінен быў падпісаць яшчэ тыдзень таму, і мы з табой назаўжды развітаемся. Як табе такі варыянт?

– Паршыва. Твае, капітан, поскудзі за тыдзень так і не змаглі мне растлумачыць сутнасць усіх абвінавачанняў. У НКУС заўжды такіх тупарылых набіраюць ці гэта толькі мне такія трапляліся? – я закашляўся.

Капітан схапіў мяне за валасы і прыпячатаў галавой да сталешніцы. Па шэраму металу расплылася цёмна-чырвоная пляма. Звягінцаў схапіў са стала дакументы, якія ён вывучаў да майго з'яўлення, і падсунуў мне пад нос.

– Распавяду табе адну цікавую гісторыю. Наколькі я ведаю, ты ўсюды казаў, што не ведаеш свайго бацьку, табе пра яго ніколі не распавядалі і сам ён памёр яшчэ да твайго нараджэння. Гэтым казкам верылі, праверыць усё роўна не было аніякай магчымасці, да таго ж нікога не цікавілі бацькі нікому не патрэбнага маладога вясковага настаўніка. Ды вось толькі недарэчнасць якая, некалькі месяцаў таму я ўдзельнічаў у арышце аднаго старога дзеда, якога вінавацілі ў антысавецкай дзейнасці і ўдзеле ва ўзброенай барацьбе супраць савецкай улады. Стары хрыч пры затрыманні пусціў сабе кулю ў галаву. Не магу сказаць, што я яму за гэта не ўдзячны – ён вызваліў нас ад цэлага шэрагу працэсуальных працэдураў. Але справа не ў гэтым. У яго-

най хаце мы знайшлі досыць цікавыя дакументы і фотаздымкі. Паглядзі-ка сюды, – і ён ткнуў пальцам у нейкую паперу.

Я прагледзеў дакумент. Наколькі я зразумеў, гэта было штосьці накшталт узнагароднага ліста. Дзясятым у спісе ўзнагароджаных стаяла прозвішча... Савіцкага Леаніда Мікалаевіча!

Звягінцаў глядзеў на маё здзіўленне з яўным задавальненнем.

– Той самы дзед быў асабістым ад'ютанатам вядомай гніды, якую ягоныя шаўкі звалі генералам Станіславам Булак-Балаховічам. Генерал, гэта ж трэба!.. – капітан гагатнуў. – Цэлы шэраг дакументаў гэтага злычынцы захаваўся ў схроне, які дзед зладзіў наўпрост у сваёй хаце. А зараз глянь-ка сюды, – і Звягінцаў падштурхнуў да мяне жоўты фотаздымак. На ім я ўбачыў шмат людзей у вайсковай форме, якія абкружылі маладога мужчыну з чорнымі вусамі, георгіеўскім крыжом і яшчэ нейкімі ўзнагародамі, якія я не пазнаў. Звягінцаў ткнуў пальцам у самы кут фотаздымка, на аднаго з вайскоўцаў, які стаяў асобна. – Паглядзі! Не пазнаеш?

Я пазнаваў. З фотаздымка на мяне глядзеў... нібыта я сам!

Толькі праз хвіліну я зразумеў, што разглядваю свайго бацьку, якому на фотаздымку было прыкладна столькі ж гадоў, колькі і мне зараз. Дык вось, якім ты быў, тата...

Я падняў позірк на капітана.

– Ну і што? Гэта яшчэ не дае вам падставы для нейкіх абвінавачанняў мяне. Што з таго, што мой бацька, пра якога я на самой справе нічога...

– Маўчаць! – Звягінцаў жорстка абарваў мяне. – Пашчу будзеш адкрываць калі я дазволю. Гэта, канешне, не пад-

става, хоць, часам, саджаюць і за меншае. Ну, на хвілінку ўявім сабе, што ты сапраўды нічога не ведаў пра свайго бацьку, а не хлусіў пра сваё "няведанне" ўсё жыццё. Уявім сабе такую магчымасць. Твой вырадак-бацька гэта не падстава для арышту, гэта толькі абцяжарваючы фактар. Фармальна падставай для арышту былі твае стасункі з тым самым старым, з якім вы разам са зброяй у руках аказвалі супраціўленне аператыўнікам камісарыяту. Ён даўно быў у нас пад падарэннем за свае яўна прапольскія настроі і непрыкрытыя паклёпы ў бок савецкай улады. Мы рыхтаваліся арыштаваць яго па абвінавачанні ў шпіянажы, але падзеі адбываліся занадта хутка, і ён загінуў раней, чым быў арыштаваны. Мы цудоўна ведаем, што вы з жонкай досыць часта бывалі ў яго, і ён меў на вас вялікі ўплыў. Антысавецкія размовы, польская мова, якую ён зачымсьці навязваў вам, схіленне да рэлігіі, тым больш да польскага каталіцтва... Сам разумееш, што мы не маглі дазволіць, каб дзяцей савецкіх грамадзянаў вучыў чалавек з такімі поглядамі і настроямі. Калі ўскрылася інфармацыя наконт твайго бацькі гэта яшчэ больш узмацніла падазрэнні.

– Ты сам сказаў, што сяброўства са старым Юрасём гэта толькі фармальны чыннік. А рэальны? – ціха запытаўся я.

– Рэальны? Што ж, былі і рэальныя чыннікі. Думаю, што я магу табе пра іх распавесці.

Па-першае: ты і твая жонка мелі досыць вялікі ўплыў на вяскоўцаў, у вас быў высокі аўтарытэт, гэта мы павінны былі кантраляваць. Да таго ж вас падтрымліваў Раманаў, – Звягінцаў зноўку расцягнуў вусны, – а я ненавідзеў як Раманава, якога я ж і прыбраў, так і ўсіх, каму той аказваў пратэкцыю.

Па-другое, думаеш я забыўся на той дзень, калі твая сука-жонка пасмела ўдарыць мяне, а ты яшчэ й спрабаваў

ёй у гэтам дапамагчы? Фармальна, гэта ўжо артыкул аб нападзе на супрацоўніка НКУС. Але тады вы яшчэ былі пад абаронай Раманава і я фактычна нічога не мог зрабіць.

Ну і, нарэшце, апошняе. Думаеш, я не ведаў, што ты прабраўся на спецпалігон камісарыяту і назіраў за выкананнем прысудаў? Цябе заўважыў шэраговец, але ён аказаўся разумным хлопцам і не стаў падымаць трывогу, а аба ўсім распавёў спачатку мне. Я вырашыў нічога не рабіць да пэўнага часу і паглядзець, як ты станеш сябе паводзіць. Як высветлілася, я не памыліўся. Ты задаволены адказам?

– У мяне толькі адно пытанне. Чаму ты растраляў першай Таню?

– Оо, цікавае пытанне! Я зрабіў гэта па некалькіх прычынах. Перш за ўсё, тваю жонку я ненавідзеў куды больш за цябе. Ненавідзеў, і, прызнаюся, нават трохі баяўся. Яна была куды больш моцная духам, чым ты, яна не баялася мяне і яна не пераносіла на дух камісарыят і савецкую ўладу ўвогуле. Таму я вырашыў пазбавіцца ў першую чаргу ад яе. Ёй выставілі тое ж абвінавачанне, што й табе – шпіянаж на карысць Польшчы, і ў той жа дзень надзвычайная тройка вынесла смяротны прысуд.

Але гэта яшчэ не ўсё. Я цудоўна ведаў, што ты не зможаш заставацца ўбаку, і прыйдзеш зноўку на палігон. Такім чынам, я хацеў паглядзець, чым жа ўрэшце рэшт скончыцца гэтая камедыя, да таго ж я жадаў даць табе дайграць сваю ролю да самага канца. Ты цудоўна дайграў яе, віншую. Драматызм быў на ўзроўні, колькі гледачоў, якія сваімі вачыма ўбачылі, што настаўнік іх дзяцей насамрэч злачынца, якія на свае вочы ўпэўніліся ў тым, што нельга станавіцца пасярод дарогі камісарыяту – лепш фіналу не прыдумаць. Застаўся толькі апошні акорд – твой подпіс пад пратаколам допыту. Па шчырасці, я б абышоўся і без яго, але ён

будзе сімвалам маёй поўнай перамогі, перамогі, якую я рыхтаваў некалькі месяцаў. Папера перад табой.

Я паглядзеў на аркушы белай паперы, якія ляжалі перада мной. Яны былі пакрыты тэкстам, набраным на машынцы. Я паспрабаваў чытаць. "Я, Савіцкі Максім Леанідавіч, паведамляю следчым Народнага Камісарыяту Унутраных Спраў пра тое, што цягам апошніх месяцаў я займаўся дзейнасцю, накіраванай на збор і перадачу інфармацыі... у змове з агентам польскай выведкі... мая жонка, Савіцкая Таццяна Віктараўна...здрада...шпіянаж..."

Я нечакана ўзгадаў іконку-медалік на тваёй, мілая, шыі. "О, Марыя...".

Я ўспомніў дзеда Юрася, які зрабіў табе гэты падарунак. Я бачыў, як мы з табой ляжалі пасярод жытняга поля, і ты дыхала мне ў вуха, дыхала і пасміхалася, а твае зялёныя вочы кружылі мне галаву. Твае дзіўныя, нерэальна глыбокія і немагчыма прыгожыя вочы нібыта казалі мне "Мы будзем жыць вечна! Мы заўжды будзем побач! Мы будзем шчаслівыя разам!".

Раптам я зноўку вярнуўся ў кабінет Камісарыяту. За маёй спіной ўсё гэтак жа стаяў Звягінцаў, перада мной гэтак жа ляжалі паперы, якія я мусіў падпісаць.

Я адсунуў пратакол ад сябе на іншы бок стала.

– Ну і як гэта разумець? – спакойна запытаўся капітан.

– Падавішся ты маім апошнім акордам, сука. Колькі б ты мяне не біў, колькі б не ламаў касцей і не зрываў скуры з мяса, я нічога не падпішу. Якая мне розніца, калі ты ўсё роўна загадаеш расстраляць мяне. Можа быць там, наверсе, я зноў буду з маёй Таццянкай. Хто ведае, можа быць аднойчы мы вернемся на зямлю, вернемся, каб адпомсціць табе і такім, як ты, вернемся не нямоглымі душамі і не слабымі істотамі, якія не маюць ніякай улады над табой. Маг-

чыма гэта толькі пустыя мары, але я веру ў тое, што так і будзе. Так чаго ж ты цягнеш, даставай свой вальтэр, забі мяне, як забіў яе, слабую дзяўчынку, якая насамрэч была ў тысячу разоў мацнейшая за цябе. Забі, бо ты ўсё роўна не дачакаешся ад мяне подпісу.

Звягінцаў сапраўды дастаў вальтэр. Але ён не стаў страляць. Ён толькі размахнуўся і ўдарыў мяне па галаве. Я зноўку праваліўся ў цемру...

Калі праз дзве гадзіны я расплюшчыў вочы, капітан сядзеў насупраць мяне і з нязменнай усмешкай разглядаў паперы, якія я адмовіўся падпісаць.

– Добрай раніцы, Максім Леанідавіч! Паглядзі-ка сюды, – і ён зноўку сунуў мне пратакол пад нос. Я не верыў сваім вачам, мой подпіс стаяў пад дакументам. – Цікава, праўда? Ну вось што перашкаджала мне адразу самому паставіць за цябе твой подпіс? Узор у мяне быў, а разбірацца рашуча ніхто не будзе, гэта я гарантую. Мог бы не марнаваць некалькі гадзін, – ён зарагатаў. – Ты ведаеш, я ж хацеў табе аказаць адну паслугу. Калі б ты падпісаў паперу сам, ты б сапраўды атрымаў па-хуценькаму кулю ў патыліцу. Хто ведае, а раптам ТАМ, ты б сапраўды сустрэў сваю суку, а? – Ён зноўку зайшоўся рогатам. – А так... ты не пажадаў супрацоўнічаць, гэта заўжды караецца вельмі жорстка. Шмат хто лічыць, што самае страшнае пакаранне, якое можа прызначыць Камісарыят гэта растрэл. Глупства.

У мяне тут ёсць два аркушы. На іх два варыянты прысудаў для цябе. Абодва яны могуць быць правамоцнымі пасля таго, як я пастаўлю свой подпіс пад любым з іх. Такім чынам... – ён выцягнуў адзін аркуш. – Першы прысуд: "Савіцкаму Максіму Леанідавічу прызначыць пакаранне ў выглядзе расстрэлу". Другі прысуд...так, так, а вось, тое што трэба: "...прызначыць пакаранне ў выглядзе пажыццёвага зняво-

лення ў сістэме папраўчых лагероў Савецкага Саюза, без права амністыі, без права ліставання, без права...". Тут яшчэ шмат без якога права, прасцей для цябе будзе зразумець, што ад гэтага моманту ў цябе няма права ні на што абсалютна. Такім чынам, што ж мне абраць... – Ён тэатралізавана задумаўся. – Мяркую, што такога лёгкага пакарання як расстрэл ты не заслужыў, – ён парваў першы аркуш. Пад другім жа ён паставіў свой подпіс і адклаў яго ў свой планшэт.

– Ссука... Сука! Сука!!! – Я не мог стрымаць сябе. Гэты д'ябал прадумаў усё, ён не дапусціў аніводнай памылкі.

– Падабаецца? Што ж, цябе чакае жыццё, поўнае ўспамінаў пра тваю даражэнькую жонку і яе цудоўныя зялёныя вочкі. Ты думаў, што хоць напрыканцы перамог мяне, адмовіўшыся ставіць свой подпіс пад пратаколам. На самой жа справе ты перайграў самога сябе. У цябе будзе шмат часу, каб падумаць над сваімі памылкамі, шмат часу, каб слаць на самога сябе ўсе магчымыя праклёны. Доўгіх гадоў жыцця вам, Максім Леанідавіч!

Я нечалавечымі высілкамі напружваў рукі, нібыта імкнуўся парваць аковы, якімі яны былі сцягнуты. Я плакаў і спрабаваў дацягнуцца да Звягінцава, шалёна стукаючы ў паветра скаванымі рукамі.

– Канвойны, – з нецярпеннем паклікаў капітан.

У пакой зайшоў шэраговец. Ён трохі занепакоена назіраў за мной.

– Забярыце гэтую скаціну. Пакуль што ў камеру, заўтра я перашлю загад на ягонае этапаванне.

Мяне падхапілі пад рукі і пацягнулі прэч.

Камера сустрэла мяне сырым подыхам смерці і халоднымі кратамі. На падлозе гэтак жа, як і некалькі гадзін таму, была мая кроў, ніхто нават не паспрабаваў напружыцца, каб змыць яе.

Мяне кінулі ў далёкі кут камеры. Халодная падлога прыняла мяне пахам магілы, тым больш нясцерпным ад таго, што пасля размовы са Звягінцавым я ўпершыю пачаў жадаць такой недасяжнай для мяне зараз смерці.

– О, мая каханая Танечка, – прашаптаў я. – Я буду з табой! Абавязкова буду! Буду...

# Эпілог

Вагон быў халодны і сыры. Як і ў камеры, дзе я сядзеў апошнія два тыдні, тут было проста дахалеры пацукоў. Але ў адрозненне ад тых, турэмных, гэтыя былі галоднымі. І яны далёка не заўсёды выказвалі жаданне чакаць, пакуль вязень аддасць Богу душу.

Нам не казалі, куды ідзе этап. Мы не павінны былі гэтага ведаць. Адгэтуль мы не павінны былі ведаць нічога. Мы былі нікім, і імя нам было ніхто. Адзінае, што мы ведалі – мы больш не людзі. Нам нельга было размаўляць, нельга было скардзіцца, нельга прасіць.

У вагоне нас такіх было чалавек семдзесят. Як мне шапнуў адзін з вязняў, нам яшчэ пашанцавала – чэкісты нярэдка перавозілі у такіх вагонах па дзвесце – дзвесце пяцьдзесят чалавек.

Але мне было усё роўна. Для мяне навокал не было больш нікога – толькі душы пакутнікаў, яшчэ не мёртвых, але ўжо й не жывых.

А яшчэ са мной побач былі мае анёлы. Ты, мая мілая, і дзед Юрась, вы кожны вечар былі са мной, вы шапталі мне ласкавыя словы, вы суцяшалі мяне. Толькі вы былі рэальнымі, усё ж астатняе, што я бачыў навокал: сцены вагона, канвойных з вінтоўкамі, вязняў – яны былі прывіднымі, ілюзорнымі, ненатуральнымі. Я нібыта бачыў гэта ўсё ў сне, і, як і ў сне, спакойна назіраў, нібыта ведаючы, што сон рана ці позна скончыцца, я расплюшчу вочы і мне будуць зычыць добрай раніцы мае родныя, мае дарагія, мае светлыя. І хоць сон будзе доўжыцца шмат страшных гадоў, я не хваляваўся. Нарэшце, гэта толькі сон.

Усё ж такі Звягінцаў не перамог. Ён хацеў каб я пражыў доўгае жыццё, поўнае пакутлівай рэальнасці і балючых успамінаў. Ён пралічыўся толькі ў адным – больш не было жыцця. Было толькі існаванне, быў толькі сон, а без жыцця пакуты не маюць аніякага сэнсу – іх нельга адчуваць, над імі немагчыма плакаць. І я ўсміхаўся начамі, калі мяне ніхто не бачыў, усміхаўся ад адной гэтай думкі, што хоць у чымсьці я перамог д'ябла.

Нішто не вечна. Нават улада цемры, якая панавала над маёй зямлёй калісьці павінна была скончыцца, памерці ў страшнай агоніі, агоніі, якую яна сама заслужыла перад гісторыяй і мільёнамі бязвінных забітых. Я бачыў яе скон, бачыў і смяяўся з яе.

Я бачыў наперадзе доўгія дзесяцігоддзі, бачыў гэтак жа ясна, нібыта ўжо пражыў іх і ведаў, што чакае маю краіну. Я не баяўся нічога. Я толькі чакаў.

Ноч хавала мяне ад насцярожаных позіркаў канвойных. Ты зноўку была са мной, твая душа не пакідала мяне ні на хвіліну. Нават уначы ты глядзела сваімі цудоўнымі вачыма на мяне, больш мне нічога не было патрэбна, каб дыхаць далей.

Ты толькі чакай, толькі вер, мілая мая, каханая Танечка. Хутка мы будзем разам. Я абяцаю.

Сплять вороги твої, знуджені працею,
Нас не сполоха їх сміх...
Чи ж нам, окривдженим долею клятою,
Й хвиля кохання – за гріх?[4]

*Кастрычнік 2009 – чэрвень 2010*

[4] Міхал Пятровіч Старыцкі, "Виклик", 1870

# ПРАВА ДАРАВАЦЬ

*Усе падзеі, апісаныя ў наступных двух тэкстах, цалкам прыдуманыя, супадзенні імёнаў, месцаў, часу выпадковае. Усе магчымыя асацыяцыі застаюцца на сумленні чытача.*

*Прысвячаецца бананавым выбарам*
*у бананавых краінах.*

Як цёпла было ў маі... Свет быў такім лагодным, у ім не было анічога, акрамя шчасця, літаральна разлітага ў вясновым паветры, шчасця простага, бязглуздага, недарэчнага і нечаканага, якім поўніўся кожны сонечны праменьчык.

Яна не любіла слова "травень". Ведала, што правільна казаць так, але ўпарта казала "май". Напэўна, нават яна сама не магла растлумачыць сутнасць сваёй звычкі.

Гэта быў яе любімы месяц. Яна нібыта прачыналася ад сну разам з зялёнымі дрэвамі, разам з імі радавалася жыццю і наваколлю і цягнулася, цягнулася наверх, да яснага сонейка, якое наталяла яе сваім боскім сонечным эліксірам. Яна не засынала ўвосень разам з прыродай. Але кожную вясну і кожны травень атрымлівалася так, нібыта яе жыццё пачыналася зноўку – чыстай старонкай, новымі памкненнямі і натхненнем, кожны раз яшчэ больш моцным і яскравым, чым год таму.

Яна мела шмат сяброў. Такое насамрэч Сонечнае Кацянятка не магло не збіраць вакол сябе людзей, якія таксама прагнулі дацягнуцца да сонца ці хаця б падставіць яму сваю галаву і лашчыцца, лашчыцца да яго, размаўляючы з сусветам на мове шчаслівых усмешак ад вуха да вуха. Яна магла навучыць гэтаму людзей. І яна вучыла.

Часам яе бачылі сумнай. Вельмі рэдка, хутчэй выпадкова, людзі заўважалі рэдкія ноткі суму, якія адлюстроўваліся на яе твары, калі яна заставалася адна і лічыла сябе схаванай ад вачэй. І ніхто не ведаў, што за блюз грае зараз у яе душы.

Між іншым, яна любіла блюз, слухала яго заўжды толькі калі была адна – часцей за ўсё ў слухаўках, уваткнутых у

старэнькі плэер “Jagga”. Гэта музыка была для яе нечым абсалютна інтымным, чымсьці, што трэба пераражываць сам-насам з сабой, і ні з кім не дзяліцца пачутай асалодай. Ні з кім, акрамя самых дарагіх. А такіх, якія сталіся для яе насамрэч часткай уласнай душы, было няшмат.

Дакладней, яна сама магла назваць толькі дваіх.

Першым быў ціхі і непрыкметны хлопец – Данік, Данііл. Ён жыў заўжды сваім жыццём і ніколі не пускаў нікога корпацца ў душы. Яму падавалася, што варта толькі на імгненне адчыніць дзверы ў яе, і яна адразу пераўтворыцца ў прахадны двор, дзе кожны хоча пакінуць след ад брудных ботаў. Можа быць, калісьці хто-небудзь здолеў бы пераўпэўніць яго ў адваротным, ды толькі ён ніколі не спрачаўся ні з кім на гэтую тэму. Не хацеў спрачацца. А людзі й не настойвалі. Людзям толькі зрэдку бывае цікава, што адбываецца ў душах тых, хто не імкнецца адкрыць таямніцы свайго сэрца кожнаму сустрэчнаму. Што ж, такая чалавечая натура. Хто ведае, ці не было б менш болю, калі б усё сталася інакш? Правільна, ніхто...

Ён не пісаў вершаў. Не быў сэрцам гулкіх кампаніяў. Ён толькі быў ідэальным сховішчам чужых таямніц. Любы псіхолаг пазайздросціў бы таму эфекту, які выклікала шчырая споведзь у гэтага чалавека. Ён мог гадзінамі слухаць кагосьці, хто п’яны ці цвярозы плакаўся яму ў рукаў, і, нават калі ён не казаў ані слова – ні суцяшальнага, ні, наадварот, асуджальнага – чалавеку станавілася куды лягчэй несці свой цяжар далей. Такі чалавек ведаў – больш ён не адзін, і, самае галоўнае, ягоная таямніца была схаваная куды больш надзейна, чым магло гарантаваць любое сховішча ў свеце. Напэўна, у гэтым і было прызначэнне хлопца – слухаць іншых. Слухаць, і без усялякага дазволу ад Бога і ад чалавека, адпускаць ім грахі.

Сам жа ён спавядаўся толькі аднойчы – нашаму Сонечнаму Кацянятку, і з таго часу паміж імі і ўсталявалася нябачная чужому воку сувязь, якая мусіла суправаджаць іх усё жыццё, ідучых поруч альбо аддзеленых адзін ад аднаго тысячамі кіламетраў. Больш блізкіх людзей у Даніка не было. Сям'я развалілася даўно і назаўжды, а сябры... сябры гэта тыя, хто хоча цябе зразумець. Хацела толькі яна. І ён быў за гэта ўдзячны.

Другім блізкім чалавекам была яе сястра Дыяна – старэйшая за Кяцянятка на паўтары гады, яна жыла зусім іншым жыццём, іншымі людзьмі, іншымі надзеямі і жаданнямі. Тым не менш, яна не ўяўляла свайго жыцця без сястры, яе сонечнай усмешкі і прагі да жыцця.

Менавіта Дыяна прымусіла Кацянятка ўслед за сабой з'ехаць з роднага дому ў горадзе В. дзеля навучання ў М. Дыяна нават дамаглася, каб яе сястру падсялілі ў інтэрнаце ў яе блок – апекаваць Кацянятка яна лічыла сваім прамым абавязкам.

Сапраўды, Дыяна хацела падавацца больш дарослай і сур'ёзнай, чым яно, магчыма, было насамрэч. Часам складвалася такое ўражанне, што яна ненавідзіць свае дваццаць два гады і марыць аб тым, каб ёй адразу споўнілася сорак – толькі дзеля таго, каб яе слова было больш упловым і значным для іншых.

Сонечнае Кацянатка не напружвала такое апекаванне. Яе цалкам задавальняла жыццё. Ні ў якім разе нельга сказаць, што яна была бесклапотнай істотай ў ружовых акулярах, не, проста яна жыла па прынцыпе “кожны жыве, як яму дазваляе сумленне”. Іншых такая занадта сур'ёзная сястра раздражняла б, а Кацянятка любіла яе настолькі, наколькі гэта ўвогуле было магчыма.

У свеце не было амаль ніводнага чалавека, за якога б

Дыяна аддала сваё жыццё. Яна была прагматыкам, які перадусім бачыць толькі ўчынкі і іх наступствы. Чаму "амаль"? Ды таму, што адзіным выключэннем з правілаў была яе сястра – маленькі чалавечак, з агромністай душой і сэрцам, адкрытым кожнаму.

Дыяна таксама мела шмат сяброў, яле яе сябры былі з той катэгорыі людзей, якія страцяць сваю актуальнасць пасля таго, як жыццё развядзе з імі ў розныя бакі. Яна прадчувала гэта, але не баялася такога развіцця падзей. Яна мела сваё ўласнае Сонечнае Кацянятка, і ніхто ў жыцці больш не мог пахваліцца такім.

Іх дзень пачынаўся заўжды аднолькава – яны ўтраіх збіраліся на кухні ў блоку Дыяны і Кацяняткі і пілі зялёную гарбату. Гэткім эпітэтам, прынамсі, яны называлі не тое, што прадаецца з такой назвай у крамах – травы Кацянятка збірала сама: святаяннік, ліпа, чабор, лісткі суніцы, штосьці яшчэ, што надавала збору своеасаблівы церпкі пах... Кацянятка нікому не давярала рабіць гарбату, нават Дыяне – гэта была толькі яе справа і яна любіла яе.

Час нібыта літасціва ахоўваў іх. Кожны дзень цягнуўся цэлую вечнасць, але гэта не толькі не напружвала, а наадварот усцешвала. Яны жылі ў шчасці самі з сабой, а да турботаў ставіліся, як і мае быць – з іроніяй і верай у лепшае.

Кацянатка любіла горад М. Нават родны В. быў для яе не такім прыгожым і светлым, як сталіца некалі вялікай краіны. Яна любіла тут літаральна ўсё – завулкі старога гораду, праспекты, па якіх нават уначы хадзілі сотні й тысячы людзей, велічную плошчу Якуба К. (Інкуба? Сукуба? – гэтак яны смяяліся з Дыянай кожны раз, калі механічны голас у метро абвяшчаў гэты прыпынак). З усіх яе сяброў толькі Данік не разумеў гэтай апантанасці. Ён не любіў, калі вакол таўкліся розныя людзі, а каменныя джунглі наўпрост

прыціскалі яго да зямлі. Ён быў чалавекам прасторы і вольнага ветру, якога так бракавала гарадам. Толькі раз за жыццё ён адчуў сябе абсалютна шчаслівым – калі, прачнуўшыся досвіткам, стаяў на каленях на беразе вялікай ракі на Захадзе і маліўся ёй. Даніку падавалася, што само паветра наталяе ягонае цела і ягоную душу чымсьці такім, што недасяжна для іншых, чымсьці, што раз і назаўжды ўзносіць яго над усімі, хто аніразу ў жыцці не адчуваў нічога падобнага.

Сонечнае Кацянятка не магла стрываць у жыцці толькі адной рэчы – калі камусьці побач з ёй было балюча – балюча целам ці душой – гэта было ўжо не так істотна. Нават калі яна не магла дапамагчы справай, яна шчыра і ад сэрца імкнулася дапамагчы словам – і, о цуд! – яе слова сапраўды ратавала душы. Яна хацела жыць так, каб навокал усім падавалася, што ёй самой ніколі не бывае балюча, толькі дзеля таго, каб іншыя думалі, што калі б яны не звярнуліся да яе па падтрымку і дапамогу, іхні зварот ніколі не станецца несвоечасовым.

Людзі памыляліся, нават ёй часам было балюча. Раз-пораз знаходзіліся такія, у каго атрымлівалася параніць гэтае святое, хоць і маленькае сардэчка, а часам здаралася так, што балюча біла само жыццё, нібыта выпрабоўвючы на стойкасць, мужнасць і... святасць.

Кацянятка сумленна здавала ўсе іспыты на трываласць, ані словам, ані поглядам не даючы іншым зразумець, што нават ёй бывае цяжка. Для іншых цяжка ёй не было ніколі. Яна лічыла, што не мела права на ўласны боль. Занадта шмат было чужога болю.

Маленькай дзяўчынцы, якую сябры між сабой называлі Сонечным Кацяняткам ішоў дваццаць першы год.

Яна заўжды верыла ў тое, што злых людзей не бывае,

бываюць толькі прадузятыя і эгаістычныя адзнакі. Напэўна яна будзе верыць у тое праз усё жыццё, нягледзячы на ўсё, што сталася з ёй той халоднай ноччу. Хіба ж не за гэтую святую наіўнасць яе любілі сябры? Пра ўсіх не магу сказаць, але тыя два, якіх я апісаў вышэй, плакалі па-за дзьвярыма бальнічнай палаты, пасля таго, як яна сказала, што не вінаваціць аніводнага ў свеце чалавека, ў тым што здарылася, і што трэба дараваць усё. Гэтыя двое не разумелі яе, і яны прагнулі аднаго – помсты за той боль, які перажыла Кацянятка. Іх можна было зразумець. Яны былі ўсяго толькі людзьмі. Яна ж была святой. Так лічылі яны. І, напэўна, яны мелі рацыю ў сваіх поглядах. Але дараваць разам з ёй у іх не атрымлівалася. Ды яны й не імкнуліся да гэтай святасці.

Яны збіраліся нядоўга. Як заўжды, усе ўтраіх – Кацянятка, Данік і Дыяна. Галоўнае было цёпла апрануцца, ніхто не ведаў, калі для іх скончыцца гэтая ноч.

Да апошняга моманту не маглі вырашыць, ці трэба ўрэшце ім ісці. Спрачаліся да хрыпаты – такога не было ніколі. Дацягнулі да таго, што, здавалася, можна было ўжо й заставацца дома. Але яны пайшлі.

Страшная памылка, чорная іронія лёсу – спазненне сталася трагедыяй. Прыйшоўшы паловай гадзіны раней, яны б вырваліся, як вырваліся тысячы іншых. А зараз было позна.

Бегчы не было куды. Навокал яна магла бачыць толькі роўныя сценкі з Чорных, якія сабой ўтваралі адмысловыя калідоры – каб не даць анікому вырвацца і пазбегнуць раскрытай пашчы зялёнага МАЗу. Людзі цягнуліся па гэтых калідорах – крок управа, крок улева і ахвяра адразу атрымлівала дрынам па галаве. Цікавая асаблівасць, яны білі толькі па галовах, куды радзей па спіне альбо руках. Нават

дзяўчын, нават старых, паваленых на акрываўлены снег, пінали нагамі, імкнучыся трапіць у галаву.

Чалавек дзвесце, сярод якіх былі Кацянятка, Данік і Дыяна, яшчэ трымаліся. Іх заціснулі паміж сценкамі нейкіх будынкаў, і абодва выхады раптоўна аказаліся перакрытыя металічнымі шчытамі. Кожны разумеў, што ратавання не будзе, і яны рыхтаваліся. Невядома да чаго, але кожны настройваў сябе толькі на тое, каб не паказаць страху – гэтым Чорным, сваім сябрам, і, галоўнае, самім сабе.

Наперад, бліжэй да шчытоў, ірвануліся хлопцы – найбольш мужныя, найбольш сумленныя, яны штурхалі дзяўчын, разам з імі заціснутых у капкане, у цэнтр, дзе было больш бяспечна, самі падстаўляючыся пад першыя ўдары. Данік схапіў Дыяну і Кацянятка і прыціснуў іх да цаглянай сцяны будынка. Ён таксама хацеў пайсці туды, наперад, але дзяўчаты схапілі яго і з усіх сілаў прыціснулі да сябе.

Кацянятка адчувала, нібыта ў паветры падвесілі магутную струну, і зараз яе расцягвалі з абодвух бакоў магутнымі абцугамі, рызыкуючы парваць. І струна дзвінела, гучала нейкай незямной, да неверагоднасці прыгожай і, у той жа час, страшнай нотай, якую не даводзілася чуць раней і наўрад ці давядзецца пачуць яшчэ калі-небудзь.

Гэтая музыка гучала ўсяго некалькі кароткіх імгненняў. А потым струна парвалася.

Клін Чорных уварваўся ў натоўп мірных людзей, як гарачы нож у масла. З абодвух бакоў Кацянятка пачула крыкі, страшныя крыкі людзей, якія раптам зразумелі, што зараз іх будуць забіваць. Яна не бачыла, што адбываецца там – не хапала росту. Затое ўсё бачыў Данік.

Хлопцы – самыя адчайныя, са сціснутымі кулакамі спрабавалі кідацца на роўныя металічныя шыхты. Аніводзін з іх не здолеў прабіцца. Раз-пораз з шыхта вырывалася рука

са шчытом, і той – агромістая, важкая металічная пласціна – апускаўся з налёту на галаву смелага, адразу разбіваючы твар ў чырвонае месіва. Людзі падалі, многія нават без крыкаў – гублялі прытомнасць, яшчэ падаючы, але нават пасля гэтага іх білі далей – нагамі, дрынамі, збіваючы і калечачы. Тыя, хто ўпалі, адразу знікалі за чорнымі шэрагамі, шыхт няўмольна крочыў наперад, па новыя ахвяры.

Данік прыціснуў дзяўчат да сцяны, наўпрост сваім целам, а потым раскінуў рукі, каб хоць троху абараніць іх. Аніякага сэнсу ў гэтым ўжо не было, але ён не мог рабіць інакшай.

Першы ўдар прайшоў наводмаш, і хлопец нават не ўпаў. Але тут жа ён атрымаў ботам пад калена і сагнуўся ад болю. Зверху на яго наваліліся Чорныя, падымаючы і і апускаючы магутныя рукі са сціснутымі ў далонях дрынамі.

Кацянятка крычала. Яна спрабавала закрыць Даніка ад удараў, працягваючы свае рукі наперад, над хлопцам і адразу некалькі дубінак перабілі іх, паламаўшы танюткія косткі.

Дыяна з усіх сілаў цягнула Кацянятка назад, да сябе, але было ўжо позна. Яе падхапілі было пад рукі, калі ў яе жывот уляцела нага ў цяжкім баявым боце. На кароткае імгненне Дыяна паспела зазірнуць у вочы таго, хто біў. Нават праз шкло ягонага шлема яна ўбачыла ў іх вар'яцкі агонь жаднага ды крыві драпежніка, але не гэта больш за ўсё ўразіла яе. За шклом хаваўся твар не проста маладога хлопца – гэты шчанюк на выгляд быў маладзейшы за тую, каго ён біў!

Такога ўдару не вытрымалі нават магутныя чорныя рукі, якія трымалі дзяўчынку. Яна зноўку ўпала на снег, перакуліўшыся і заціхшы з распластанымі рукамі, нібыта жадаючы абняць родную зямлю, шчодра палітую маладой крывёй.

А ў наступны момант яе цела зноўку апынулася пад градам бязлітасных udараў звяроў, якія нават не разумелі, што іхняя ахвяра ўжо не толькі не супраціўляецца, але, беспрытомная альбо наогул забітая, не робіць захадаў, каб абараніць сябе.

Білі па ўсім целе, палкамі і нагамі. Біў той самы хлопец і яшчэ адзін, хто падбег да яго з разваленага сталёвага шыхта. Гэтая вакханалія ўсё ніяк не сканчалася, і Дыяна, якую цягнулі ў МАЗ пад рукі, абарочвалася назад і не магла спыніць цяжкі плач, які рваўся з яе грудзей, і які заліваў яе вочы слязамі настолькі, што яна ўжо, часам, пераставала бачыць сваю сястру.

Ужо потым, у бальніцы, куды скалечанае дзіцятка прывезлі пасля бясконцых катаванняў, далёкая ад палітыкі маладая доктарка, кінуўшы на Кацянятка толькі адзін позірк, павярнулася да Чорнага.

– Вашы білі?

– Мае, – з незразумелым гонарам у голасе адказаў ён.

– Мразі, – прашаптала дзяўчына, і рэзка адвярнулася ад яго.

– Ты што сказала, сука? – зароў Чорны і схапіў яе за плячо.

Дзяўчына павярнулася на абцасах і падкрэслена спакойным голасам, гледзячы ў твар Чорнаму, адчаканіла:

– Я сказала што хачу толькі аднаго – каб такія, як вы, дохлі, павольна захлынаючыся сваёй крывёй, ці што ў вас там замест яе, дохлі гадзінамі, цяжка; і я, калі раптам буду побач, не толькі не дапамагу вам, але буду з вялікім задавальненнем назіраць за тым, упершыню парушыўшы клятву Гіпакрата. Але я ані хвіліны не пашкадую аб тым, таму што яна – для людзей, а вашае імя – мразі, і толькі што я пра гэта ўжо сказала.

Яны вырвалася і, падняўшы, галаву хутка пайшла за каталкай, на якой санітары везлі Кацянятка на аперацыю, пакінуўшы Чорнага ярыцца на ўваходзе.

***

Данік не дараваў ніколі. Як і Дыяна. Яны ненавідзелі Чорных, яны хацелі забіваць іх сваімі рукамі. А людзі навокал не разумелі гэтай жорсткасці. Людзі, якіх там не было, казалі ў твар высокія і прыгожыя словы пра гуманізм і пра тое, што кожны мае права на памылку.

Часам Данік зрываўся і крычаў на іх. Якое права мелі гэтыя гуманісты казаць пра дараванне, калі яны самі не бачылі, як тыя, Чорныя, лілі кроў, без жалю, без літасці, без ценю шкадавання ў вачах, схаваных за небіткім шклом? Якое права яны мелі дараваць за чужых людзей, за якіх яны не адчулі і ценю таго болю, які маглі б адчуць за сваіх блізкіх? Дараваць мела права Сонечнае Кацянятка. І яна даравала. Даніку падавалася, што, калі яна заплюшчвае вочы, вакол яе галавы ажывае белае святло, боскае і святое, нябачнае для іншых. Гэта было не больш чым падманам зроку, але хлопец нездарма гатовы быў стаяць перад ёй на каленях, маліцца ёй і прасіць прабачэння за тое, што не ўратаваў, не выцягнуў з-пад гумавых палак.

Ён не мог больш глядзець у тэлескрыню. Не тое, каб ён і раней часта рабіў гэта, але пасля ракавай ночы яго проста ванітавала ад усяго, што ён бачыў там. Нават шматлікія відэафайлы ў сеціве, якія распаўсюджваліся незалежнымі блогерамі, выклікалі ў яго толькі нянавісць да ўсяго навакольнага.

Аднойчы ён знайшоў запіс, на якім ужо былыя лідэры, з тых, за кім пайшлі пад дубіны невінаватыя людзі, спра-

чаліся аб тым, што руху “патрэбная новая нацыянальная ідэя”. Данік толькі на імгненне затрымаўся, каб перайсці на іншы сайт і не слухаць гэтага трызнення, якое сядзела ўжо нават не ў пячонках, а дзесьці ў горле, калі штось прымусіла яго спыніцца. У кадры з’явіўся адзін з самых маладых выступоўцаў. Ён не стаў прамаўляць доўга і прыгожа. Ён памаўчаў некалькі секундаў, гледзячы на сівыя шавелюры сваіх апанентаў, потым стомлена прыгладзіў свае ўласныя валасы, па якіх сівізна прайшлася толькі за апошнія дні, пакрыўшы высакародным срэбрам яго некалі саламяныя скроні.

– Новая нацыянальная ідэя, кажыце? У чым жа яна? Можа быць у нас саміх, тых, хто так і не падняў за сабой абяцаных мільёнаў? У міфічным краху эканомікі, якія мы прадказвалі апошнія дзесяць гадоў ледзь не кожны месяц? Альбо ў тым самым новым Каліноўскім, на якога так чакаюць нашыя “змагары”? – Ён зноўку замоўк на паўхвіліны, з нечаканай для яго злосцю углядаючыся ў пачырванелыя ад гэткага выпаду твары тых, хто сядзеў побач з ім. – Вам сказаць, нарэшце, дзе яна, тая нацыянальная ідэя?! Вы, панове – як у прынцыпе і я – не маеце да яе ніякага спрычынення, як бы вам таго не хацелася, і не чырванейце вы ў сваім справядлівым гневе. Новая нацыянальная ідэя ў разбітых на дзесяткі аскепкаў руках той самай дваццацігадовай дзяўчынкі, якая адна каштуе больш, чым мы ўсе тут разам узятыя. Новая нацыянальная ідэя ў гумавых дрынах, якія разбівалі яе цела, ператвараючы яго ў суцэльную крывавую масу, цела маладой прыгожай дзяўчынкі, якая па НАШЫМ, панове, закліку прыйшла туды.

Вы добра ведаеце мяне, панове, я міралюбівы чалавек. Але маё бачанне таго, што вы сабраліся тут абмяркоўваць, толькі ў тым, каб адправіць на ўранавыя руднікі падонкаў,

якія не палічылі ніжэйшым за сябе падняць сваю брудную валасатую лапу нечалавека на гэтае безабароннае спужанае цельца, у якім ад страху калацілася маленькае сардэчка, насмрэч большае за сэрцы ўсіх нас.

***

Дзе быў той край, за якім скончалася грамадства і пачыналася клетка з жывёламі, бруднымі і магутнымі гарыламі, якім эвалюцыя ўклала ў рукі палку не дзеля таго, каб стаць праз працу чалавекам, а наадварот – каб скаціцца назад па лесвіцы ў цемру дацывілізаваных стагоддзяў?

Яна не ведала гэтага краю. Не ведаў і ніхто. Усе ведалі толькі адное – ён быў пяройдзены. Не было грамадства, засталася толькі грамадзянская вайна. У гэтай вайне не магло быць пераможцаў. Яна б скончылася падзеннем усяго, што было здабыта ў мірных баталіях. Грамадзянская вайна ніколі не пачынаецца пакуль яшчэ ёсць грамадства – яна немагчымая. Але кропку заўжды ставіць кроў.

Кропку ставіла кроў маленькай дзяўчынкі, чыстай і светлай.

Дзе скончаўся гэты шлях? Дзе пачынаўся новы дзень? Сонечнае Кацянятка не ведала гэтага. Яна толькі хацела жыць далей, хацела, як ніколі дагэтуль.

Людзі жылі, каб помсціць, альбо, захутаўшыся ў коўдру з галавой, забыцца й не бачыць нічога.

І толькі яна жыла, каб дараваць.

Яна мела на гэта права.

І яна жыла.

*3–7 студзеня 2011 г.*

# ЛЕБЕДЗІ
# ПАМІРАЮЦЬ РАЗАМ

## Бананавыя ўводзіны

Жыла-была ў свеце адна бананавая рэспубліка. Назавем яе... ну, напрыклад, рэспубліка N. Сэнсу ўзгадваць яе сапраўдную назву няма аніякага – такіх бананавых на нашым свеце нават сёння процьма.

Дарэчы цікава, чаму бананавыя рэспублікі называюць менавіта так? Ёсць цэлы стос поглядаў на гэтае пытанне, мне ж падаецца найбольш правільным адзін – такую назву гэтыя краіны заслужылі з-за таго, што ў іх няма абсалютна анічога. Калі не ўлічваць, канешне ж, бананаў. Ці, прынамсі, іх мясцовага аналага.

Акрамя гэтага паўднёвага фрукта, звычайна, ёсць яшчэ некалькі рэчаў, якія яднаюць бананавыя рэспублікі.

Перш за ўсё гэта свой адмысловы бананавы прэзідэнт. О, гэта цуд з цудаў – напаўпісьменны правадыр свайго племені, які раздае набліжаным і проста вернападданым (альбо, што вельмі характэрна ў такіх выпадках, вернападдаТым) ўсе магчымыя прывілеі на крадзёж таго, што сам Цар скрасці не можа проста фізічна – рук не хапае. Адпаведна, вернападдан(т)ыя і набліжаныя гатовы за свайго куміра грызці глоткі ўсім астатнім, тым, хто прэзідэнта не шануе, не любіць і публічна пра яго зласловіць. Звычайна такіх невернападданых (альбо, што таксама характэрна, яшчэ не паддаТых) у любой краіне бананавага кшталту можнаназбіраць крыху больш за палову насельніцтва. З экранаў дзяржаўнага ТБ і газетных палос іх называюць грэблівым словам "апазыцыя", альбо проста "меншасць" (дзякуй Богу што не сэксуальная!), і заклікаюць, у залежнасці ад палітычных абставінаў, альбо давіць танкамі, альбо наадварот – прыслухоўвацца да іх пункту гледжання, канешне ж, не

забываючы карыстацца пры гэтым пунктам гледжання канстытуцыйнай "большасці". Адметная асаблівасць – такі прэзідэнт амаль заўжды люты гамафоб, і, напэўна, з-за гэтага ва ўсіх інтэрв'ю кажа, што "нахіліць яго ніхто не зможа". Фройд шчаслівы.

Гэтак жа, як і бананавы прэзідэнт, для любой бананавай рэспублікі характэрна бананавае падзяленне на тых, каму добра, і тых, каму не вельмі. А, зусім забыўся, ёсць яшчэ тыя, каму пофіг. У самым поўным і натуральным сэнсе гэтага слова. Такіх звычайна больш за ўсё, хоць усюды бываюць свае выключэнні. Першыя, каго ўсё задавальняе, гатовы на руках насіць свайго княжага паўбога і хорам чытаць яму малітвы за клопаты аб краіне, стабільнасць і неверагодныя заробкі ў тры бананавыя звязкі на месяц. Не будзем зараз разглядаць унутраную структуру гэтай групоўкі – гэта занадта нудна і складана, тым больш што апавяданне зусім не пра гэта. Адзначым толькі, што, як і ўсюды, тут ёсць і разумныя людзі, якія проста зарабляюць грошы на ўсіх астатніх не вельмі разумных, ёсць і свае мясцовыя пенсіянеры й пенсіянеркі, якім бы толькі не здарылася вайны з суседнім племенем (ды хай усіх там заб'юць, абы Тумба-Юмба не напала), ёсць прапойцы-алкашы, ёсць проста звычайныя людзі, якія не хочуць бачыць і чуць нічога, таму што баяцца, альбо проста таму што думаць – гэта сумны занятак, да таго ж ад яго з'яўляюцца зморшчыны.

Другая група насельніцтва – тая самая "меншасць", якую трэба давіць танкамі. Ад першай групы яна сваім складам адрозніваецца не вельмі моцна, хоць пэўныя разыходжанні, безумоўна, ёсць. Перш за ўсё, тут куды менш людзей пенсійнага ўзросту. Гэтая група адрозніваецца досыць вялікім адсоткам інтэлігенцыі і студэнтаў. Яе ўдзельнікі лічаць сябе сапраўднымі патрыётамі (хоць на справе гэта

часта бывае проста біццём сябе пяткай у грудзі), і намагаюцца са скуры вылезці, каб толькі скінуць крывава-бананавы рэжым на карысць свайго вялікага народа. Ва ўсім астатнім гэтая група падобная на першую – дахалеры разумных і беспрынцыпных бізнэсоўцаў, якія рубяць грошы на ўсіх і процьма простых людзей – алкаголікаў і нармалёвых.

Тыя, каму пофіг, ўтвараюць сабой групоўку адсоткаў ў трыццаць ад агульнай колькасці грамадства. О, гэтыя людзі вартыя захаплення! Яны жывуць, робяць выгляд, што працуюць, імкнуцца адпачываць на поўную катушку, а на ўсе пытанні і правакацыйныя закіды хорам адказваюць: "НАМ ПОФІГ!". Ім можна толькі пазайздросціць – столькі нервовых клетак яны берагуць за жыццё, што жывуць, напэўна, гадоў на пятнаццаць больш за астатніх. Хоць, насамрэч, ніхто адпаведных даследаванняў не праводзіў.

Акрамя гэтага ёсць яшчэ некалькі агульных рысаў ў бананавых рэспублік: напрыклад, поўная адсутнасць нармальных адносінаў з цывілізаванымі краінамі і сяброўства выключна з такімі ж бананавымі плямёнамі; нерэальны дэфіцыт таго, што яны прызвычаіліся называць дзяржбюджэтам, бананавыя валюты, якія прыдатныя толькі для таго, каб у іх бананы закручваць, і проста паталагічныя спробы знайсці сабе "вялікага брата" сярод краінаў, якія недалёка адышлі ў маральна-палітычным плане, але маюць пэўную колькасць войскаў, танкаў, авіацыі і артылерыі, каб прэтэндаваць на ролю рэгіянальнага правадыра ў бананавым свеце.

Краіна, пра якую пойдзе гаворка, мела толькі адно сур'ёзнае адрозненне ад рэспублік такога кшталту – у яе не было нават бананаў ў дзяржаўнай скарбонцы. Апошнія, што яшчэ заставаліся пару месяцаў таму, струшчылі тлустыя дзеці рэспубліканскіх дэпутатаў.

Большасць бананавых рэспублік знаходзіцца... здагадай-

цеся з трох разоў, дзе? Правільна, там дзе бананы растуць – Афрыка, Паўднёвая Амерыка... тым не менш, гэтымі рэгіёнамі лакалізацыя такіх краін не абмяжоўваецца. Яны ёсць і на Усходзе – у арабскім свеце і Азіі; больш за тое, яны нават, часам, – вельмі рэдка – трапляюцца ў геаграфічнай Еўропе! Здзіўленыя? Не? Ну і правільна. Гэта не намёк, дарэчы, вы не падумайце. І думак такіх нават не было.

Але ж вернемся да нашай краіны. Яна была населеная ніякімі не афрыканцамі і не лацінасамі. Нават не арабамі ці азіятамі. Абсалютную большасць яе жыхароў складалі нармальныя такія сабе славяне. Не лепш і не горш за іншых. З адным толькі адрозненнем ад астатніх славянаў – калі, напрыклад, пра гарачых сербаў, якія прызвычаіліся на любую абразу хапацца за аўтамат, казалі, што ў іх кроў з чырвонага віна і перцу, то пра кроў гэтых можна было пачуць, што яна са скіслага малака альбо наўпрост з чаркі і шкваркі. Гэты народ прадстаўляў бы сабой найлепшае ўвасабленне запавета пра другую шчаку, калі б толькі паводзіў сябе так з-за празмернай набожнасці, а не папросту з-за агульнай абыякавасці абсалютна да ўсяго, нават да людзей, якія прыходзілі гэты народ рабаваць і забіваць. Прадстаўнікі гэтага народу з годнасцю называлі такую рысу свайго нацыянальнага характару высокім словам “талерантнасць”, усе астатнія народы – пафігізмам, ідыятызмам, альбо банальным няўменнем даць адпор крыўдніку. Вельмі часта яны ўвогуле нічога не казалі пра гэтую краіну, а проста імкнуліся выцягнуць з яе хоць нейкі профіт для сябе. Пры гэтым, зразумела, меркаванні і інтарэсы яе жыхароў нікога не хвалявалі. З чаго б хвалявацца – талерасты ж. Верагодна, прадбачлівы Франклін аднойчы выказаўся менавіта пра гэты народ.[5]

[5] Маецца на ўвазе выказванне Бенджаміна Франкліна “Хто ахвяруе свабодай дзеля бяспекі, не варты ані свабоды, ані бяспекі”

Усё тут было як след – і ненахіляемы прэзідэнт, і яго вернападдан(Т)ыя, і пафігісты, і “меншасць”, ну й, вядома, танкі, каб гэтую меншасць давіць у выпадку чаго. Былі пенсіянеркі і тлустыя наменклатуршчыкі, якім бы ўласную маці прадаць, абы нічога не змянілася; была бананавая валюта і бананавая дзірка ад бубліка ў бюджэце.

Больш не было ні халеры. Усё прадалі за бананы. Але й тыя хутка пажэрлі. Дэпутацкім дзецям трэба ж штосьці есці. Не карміць іх у рэшце рэшт бацькоўскімі лобстэрамі і каньякамі!

Людзі жылі розныя. І разумныя, і не вельмі. Як усюды. Толькі што баяліся амаль усе, за рэдкім выключэннем. Чаго баяліся, нават не ўсе маглі растлумачыць – ці то падвышэння коштаў на бензін і хлеб, ці то вайны з Тумба-Юмбай і іншапланецянамі, ці то адмены канцэртаў сваіх улюбёных музыкаў. Большая частка, праўда, баялася выключна свайго ўрада, таго самага, які для народа і з народа. Беднаму народу было страшна глядзець на чарговую тлустую падлу на тэлеэкране, глядзець і разумець, што гэтая дзяржаўная дупа для яго і з яго. “Адкуль?” – пытаў сам сябе народ і глядзеў у люстэрка. Тое з абсалютным пастаянствам паказвала схуднелага чалавечка ў зморшчынах, ну ніяк не падобнага да тых, каго чалавечак бачыў ў тэлескрыні. Заставалася толькі здзіўляцца, як гэтае маленькае і худое магло спарадзіць тое агромістае і тлустае.

Пару разоў на год (і, нязменна, яшчэ адзін раз на пяцігодку – пад выбары) адносна невялікая частка грамадства знаходзіла ў сабе сілы не баяцца невядома чаго хоць на некалькі гадзін. Тады яны выходзілі на вуліцы і выказвалі сваё катэгарычнае “фе” дупам на экране. Гэта ўсё сканчалася заўжды аднолькава – бананавы прэзідэнт кідаў на смелых бананавы спецназ і бананавую армію. Першыя мелі

выгляд тухлых бананаў – чорных і непрыдатных для нармалёвага выкарыстання па прызначэнні, другія ж былі як недаспелыя бананы – зялёныя і выглядам і ўзростам.

Як вынік, смелых з года ў год станавілася ўсё меней – хтосьці паміраў, хтосьці пачынаў баяцца больш, чым раней. Адно было нязменным – пасля выбараў бананавага кіраўніка дзяржавы на плошчах сыходзіліся тысячы чалавек, якім бананавае жыццё было як костка ў горле. Пасля гэтага ўсё заставалася, як раней, толькі што ў турмах чамусьці рэзка пачынала не хапаць вольных месцаў з-за штучна падвышанага попыту кліентаў.

Усё заўжды было стабільна – грошай стабільна не было, народ стабільна піў з гора, іншадумцы стабільна сядзелі па камерах, а бананавыя лідэры стабільна вылі ў этэры пра стабільны рост унутраных валавых бананаў на душу насельніцтва.

Можа быць штосьці аднойчы б і змянілася ў жыцці краіны, ды толькі, на жаль, яе народ не меў ані мужнасці лезці пад паліцэйскія палкі за свае правы і сваю будучыню, ані жадання поўзаць пад кулямі бананавай гвардыі, якой бананавы прэзідэнт, ні секунды не думаючы, аддаў бы загад страляць па сваім горача любімым народзе ў выніку хоць мінімальнай небяспекі для сваёй бананавай улады.

Кроў была не з таго, што патрэбна.

І жылі ўсе, як у страшным бананавым сне.

Але сны маюць тэндэнцыю рана ці позна скончацца. Нават бананавыя. Нават страшныя.

Толькі ніхто вам не дасць гарантыі, што за страшным бананавым сном не прыйдзе жудасная і зусім не бананавая рэальнасць.

Але ж пра ўсё па парадку...

***

Яны ненавідзелі бананы проста арганічна. І краіна, дзе яны жылі, была тут ні пры чым. Растлумачыць прычын сваёй нелюбові да гэтага фрукта яны, напэўна, не маглі б і самі. Проста так склалася. Бывае, што адсутнасць любові да чагонебудзь складана растлумачыць аб'ектыўнымі чыннікамі. Ну вось уявіце сабе сітуацыю: вам кажуць, каб вы ішлі абедаць, а вы адказваеце, што не хочаце есці. Пасля гэтага вам звычайна задаюць наўпрост геніяльнае пытанне: "чаму?". І фармальнай логікай нельга растлумачыць, чым кіруецца чалавек, які задае такое пытанне. Самым лагічным адказам на яго заўжды будзе "таму што". І справа тут не ў тым, што вы не хочаце размаўляць з гэтым чалавекам, проста вам сапраўды не хочацца есці толькі таму, што не хочацца есці! Ну бывае такі стан у чалавечага арганізма, і нічога з ім не зробіш.

Прыкладна тое самае было і з нашымі героямі. Бананы яны не любілі, як гэта ні абсурдна гучыць, толькі таму што не любілі. І кропка.

Андрэю ішоў дваццаць сёмы год. У свой час ён скончыў педагагічны ўніверсітэт і чатыры гады працаваў у звычайнай школе настаўнікам англійскай мовы.

Праца на карысць айчыннай адукацыі была для яго досыць дзіўнай, хоць і цікавай. Ён любіў да забыцця час заняткаў, і ўсёй душою ненавідзеў перапынкі між імі. Такое незвычайнае стаўленне было лёгка растлумачыць. Андрэй па-майстарску ўмеў зацікавіць дзяцей нават такім сумным для многіх прадметам, як замежная мова. Ён меў сапраўдны талент арганізацыі занятку, якім, між іншым, быў абавязаны хутчэй Боскаму дару, чым універсітэцкай адукацыі. Методыку выкладання ён ненавідзеў, яшчэ калі быў сту-

дэнтам. “Стаяць трэба тут, а не тут!”. “Указка трымаецца толькі ў гэтай руцэ!”. “Вы павінны весці занятак строга ў адпаведнасці з планам-канспектам!”. Людзі, якія выпускалі гэтыя метадычныя рэкамендацыі, кожны год здзіўляліся, што ўзровень падрыхтоўкі сярэдняга абітурыента падае ўсё ніжэй і ніжэй; яны ніяк не маглі зразумець, што прычына ў іх саміх, іх кансерватыўнасці і састарэласці ўсяго таго, чым яны прымушалі займацца маладых настаўнікаў.

Андрэй, як мог, супраціўляўся гэтаму. Ён ламаў звыклыя структуры заняткаў, адыходзіў ад праграмы, праводзіў гульні на англійскай мове і... нязменна атрымліваў вынік. Ягоныя вучні заўжды выходзілі са школы з куды мацнейшымі ведамі, чым іхнія аднагодкі, якія вучыліся ў іншых настаўнікаў.

Андрэя любілі дзеці. Андрэя ненавідзела адміністрацыя і іншыя настаўнікі. Не дзіва, ён парушаў усё, што толькі мог парушыць настаўнік, і пры гэтым меў найлепшыя вынікі. Яму зайздросцілі, з ім лаяліся, яму пагражалі звальненнем...

Дарэчы, апошнія пагрозы сыпаліся на яго нават не з-за славутага свавольства, а з нагоды поглядаў. За словам Андрэй ніколі не лез у кішэню, і на любым сходзе, не саромеючыся, выказваў усё, што ён думае з нагоды новых шалёных выбрыкаў мінадукацыі, шызафрэнічнай з’явы пад назвай “ідэалагічнае выхаванне навучэнцаў” ці проста загада павесіць партрэт бананавага кіраўніка племені ў кабінеце.

Андрэй шмат паліў. У яго не было жадання кідаць амаль ніколі. Толькі вясной яму было брыдка браць цыгарэту ў рукі. Шкада было перабіваць вясновае паветра тытунёвым дымам. Андрэй дыхаў і захлынаўся палітрай пахаў вясны, нічога ў свеце не было больш цудоўнага, больш шчырага, больш шчаслівага.

Кожны раз ён чакаў вясну як вызваленне. Зіма была для яго праклёнам невядома за якія грахі. Пачынаючы з лютага, ён не мог пражыць ані хвіліны, каб не падумаць пра тое, што жыць у гэтых снягох больш немагчыма, страшна, наўпрост фізічна балюча, і да дрыжыкаў у нагах хацелася вясны.

А вясна-сцерва дражнілася, то саргравала цеплынёй сваіх далоняў, то хавалася на іншым баку планеты, забіваючы апошняе жаданне жыць.

Прынамсі, жадаць жыць, жывучы тут, было з кожным годам усё складаней і складаней. Краіна, з адным з самых высокіх паказчыкаў па самагубствах у свеце, спрыяла дэпрэсіям. І ўсё тут было невыносна – ад душных начэй бананавай дэмакратыі да праклятых гурбаў бясконцых зім. Трымала толькі адно – тут быў дом.

Тут быў дом, тут былі сябры, паўзабытыя лясныя сцежкі, па якіх ён блукаў кожнае лета, было роднае неба і незабыўнае блакітнае возера, у якім па начох зоры блішчалі яшчэ мацней, чым на небе. Нарэшце, тут была ЯНА.

Больш нічога не было. Ён ненавідзеў халодныя скляпенні праспектаў свайго горада, ненавідзеў бананавага прэзідэнта і кожнага, хто шчыра альбо найграна пяяў яму хвалебныя песні, ненавідзеў тых, каму было ўсё роўна, ненавідзеў нават і тых, хто заяўляў аб сваёй нязгодзе – за тое, што яны рабілі гэта ціхім шэптам, калі трэба было, не баючыся паліцыі, крычаць пра гэта на ўсіх плошчах. Яму нясцерпным было само паветра гэтай краіны, дзе няма ніякай надзеі на будучыню. Ратавалі цыгарэты. І толькі вясна прыносіла няўлоўны, але да забыцця шчаслівы пах пераменаў; менавіта таму вясной ён паліў куды менш, каб не згубіць аніводнага адцення вясны ў варожым паветры.

Андрэй ведаў, як змяніць свет. У адрозненне ад мільёнаў іншых, якія таксама ўпэўнены ў сваёй кампетэнтнасці

па гэтым пытанні, ён сапраўды пачынаў заўжды з сябе. Сваім прыкладам вучыць смеласці выказванняў, учынкаў і, найперш, думак – такім быў шлях. Рабіць тое, што лічыш патрэбным, казаць тое, што думаеш – а забараніць думаць можа толькі чалавек сам сабе. Больш думаць не забароніць ніхто – нават самы крывавы дыктатар у свеце. Тым, каму падаецца, што ў іх краіне нельга нават думаць пра пэўныя рэчы, ніяк не ўдаецца ўцяміць, што рабамі іх не робіць ніхто, акрамя саміх сабе.

Быць слабым – значыць прайграваць усім, хто навокал. Прайграваць жыццю. Андрэй не мог сабе гэтага дазволіць. Прайграць значыла памерці. Можна было працаваць за капейкі, калі праца не закранала пачуцця ўласнага гонару – але даць заткнуць сабе рот нельга дазволіць нават самому д'яблу.

Усё жыццё палаць. Палаць да скону – так ён хацеў жыць. І палітыка была не пры чым. Насамрэч, Андрэй не асабліва цікавіўся палітыкай. Ёй цікавяцца толькі малагадовыя барацьбіты з сістэмамі – неістотна якімі. Сапраўдныя людзі цікавяцца жыццём. А ў ім ёсць усе адказы.

Жыццё няспынна выпрабоўвала на трываласць. Жыццё рабілася невыносным у бананавай псеўдакраіне, і больш за ўсё не хацелася яму скарыцца, альбо ад яго збегчы туды, дзе лягчэй. Андрэй верыў, што здольны пражыць, дзе заўгодна ў свеце; пражыць калі нават не сваімі ведамі – то моцнымі рукамі. Працы не бывае толькі для тых, хто не хоча яе шукаць. Альбо грэбуе пэцкаць рукі бруднай працай. Гэты чалавек не грэбаваў. Трэба пражыць – працуй. Інакш падохні. Такі закон жыцця. Ён аднолькавы ўсюды – і ў бананавых рэспубліках, і ў самых заможных краінах свету. Толькі, у адрозненне ад апошніх, у першых, нават не баючыся працы, рызыкуеш паклеіць ласты. Таму што твой бананавы прэзідэнт таксама не грэбуе працай, каб грамадзянін,

не дай Бог, не зарабіў больш таго, колькі яму хопіць, каб не падохнуць з голаду. Праўда, калі ад бруда прац, за якія браліся людзі кшталту Андрэя, пэцкаліся рукі, то ад спраў бананавых прэзідэнтаў пэцкалася душа. Плямы на ёй нельга было адмыць потым, прынамсі, пакуль ніхто не здолеў – хіба толькі Госпад на Страшным Судзе змые іх з душаў бананавых лідэраў. Таму што плямы на іх былі ад чалавечай крыві. Кроў адмываецца паршыва. Гэта вядома ўсім.

Андрэй не хацеў бегчы. Ён ненавідзеў людзей, якія жылі тут нібыта скот – у чаканні, калі павядуць забіваць на мяса – ён ненавідзеў іх, таму што ў іх не было права дыхаць гэтым паветрам вясны – НЕ ЗАСЛУЖЫЛІ! Думаеш – дыхаць гэта проста так, і нікому за гэта не трэба плаціць? Трэба. Жыццю. Родным. Сваёй зямлі. Інакш кожны подых – скрадзены.

Паветра толькі тады наталяе смагу, калі ты ведаеш, што заслужыў яго. Што ты ні на секунду не схіліўся перад жыццём і псамі, якія лічаць, што кіруюць на тваёй зямлі кожнай травінкай і кожным чалавекам – КІРУЮЦЬ ТАБОЙ!!!

Андрэй ні разу не схіліўся. Цяжка было – было не аднойчы. Ён усміхаўся, хоць яму хацелася лямантаваць. Ён сціскаў зубы і закусваў вусны так, што з-пад іх была бачная кроў, але ніхто не прымусіў яго сказаць тое, што ён не лічыў патрэбным альбо наадварот – стрываць правільныя словы, хай рэзкія, такія, ад якіх кожны, хто прызвычаіўся жыць з панскім ботам у дупе, у момант бялеў, як смерць.

Ён жыў тут усё жыццё. Паміраць таксама хацелася тут, хоць ён не думаў пра гэта. Паміраць было рана. Яшчэ не было дачкі, аб якой марыў, не было дрэва, пасаджанага па сваёй волі, а не на прымусовых суботніках (на якіх ён, дарэчы, аніразу не быў – нехер), нарэшце, не было краіны, у якой хацелася б памерці. Была толькі такая, дзе хочацца падохнуць. А гэта, пагадзіцеся, розныя рэчы.

Яны былі непадобныя адзін да аднаго. Насця была зусім іншай. Ціхая дзяўчынка – такой яна была ўсё жыццё, тоненькая трысцінaчка, якая баялася ўсяго на свеце, і ўжо за гэта ён кахаў яе. Інакш было немагчыма.

Яна ніколі не рабіла чагосьці, што магло б выклікаць у кагосьці незадавальненне. Напэўна, гэта няправільна, але яна хацела быць добрай для ўсіх. Імкнулася да гэтага, не разумеючы, што ўсім быць добрай нельга. Для кагосьці абавязкова атрымаецца быць дрэннай. Кожнай мразі ў свеце такія анёлы, як костка ў горле. Яны – сапраўднае жывое святло, а поскудзі не любяць святла.

Насця кахала Андрэя так, як толькі можа кахаць адзін чалавек другога. Мне як сапраўднаму цыніку падавалася, што такое каханне бывае толькі ў прыгожых, але дурнаватых фільмах – у жыцці ўсё інакш. Не ведаю, можа гэта насамрэч так, і я маю рацыю, але гэтыя людзі былі адзіным ідэальным выключэннем, якое я ўвогуле сустракаў. Так кахаць, як кахалі яны, нельга. Не дазволена Богам. Няма такога ліміту, колькі дасталася ім. Можа, прырода скрала для іх частку пачуццяў у іншых людзей, але гэта было таго вартым, бо такое злачынства ўваскрашала хоць на момант зніклую веру ў людзей.

Гэтая дзяўчынка з вялікімі карымі вачыма прагнула веры ў дабро, калі самым частым адказам на пытанне “як так можна?” на бананавых вуліцах было “пайшла нахуй”. Яна хацела не здавацца, як не здаваўся муж. Ёй было балюча, але яна так хацела, каб гэтыя людзі зноў сталі людзьмі, а не бананавым статкам. Ды толькі статку не трэба гэтых высілкаў. І нават, калі на дзесяць баранаў застанецца адзін кавалак хлеба, бараны будуць біцца за яго, а не супраць пастуха, што пажэр усё астатняе.

Злачыннасць на дзяржаўным узроўні – вось такі status

quo для бананавай краіны. Звычайнай злачыннасці няма месца ў такой краіне – і насамрэч нічога дрэннага ў такім становішчы не было б, калі б дзяржава не вынішчала бандытызм законам і па-за ім не дзеля таго, каб у краіне жылося спакойна, а каб наўпрост заняць ягонае месца. Бананавая краіна – гэта калі ты пужаешся не злачынца ў завулку, а “шафы” ў чорнай форме. Ён гаспадар на вуліцах. Законы пісаліся не дзеля яго. Законы для халопаў, а ён пан. Панам няма чаго баяцца. Пан можа забіць халопа – і яму за гэта не будзе нічога – цар адмажа.

Статак баяўся паноў. Чорных абыходзілі на вуліцах тыя, хто так ці йнакш сутыкаўся з імі ў жыцці – сутыкаўся больш-менш сур’ёзна, а не проста на ўзроўні “спытацца, як прайсці на патрэбную вуліцу”. Не абыходзілі толькі дзяржаўныя пяюны гімнаў пагоставай стабільнасці бананавай краіны. Але й тыя час ад часу пачыналі разумець, хто ў іх краіне прадстаўляе сабой сапраўдную арганізаваную злачыннасць.

Насця таксама баялася іх. Ёй вельмі не хацелася лічыць сабе часткай статку, але яна цудоўна разумела становішча. Колькі б розуму ў цябе не было, пакуль ты жуеш траву разам з усімі і баішся падняць галаву – ты такі ж баран, як і астатнія. Размовы шэптам на кухні гэта ўсё роўна што мычанне ў стойлах. Людзі робяць учынкі, а не шэпчуцца. Героі робяць учынкі. Статак жуе.

Нават у статка заўжды ёсць шанец стаць народам. У кожным асобным выпадку для гэтага патрэбныя свае перадумовы, свой штуршок. Але гэтаму статку, здаецца, прачнуцца было проста не наканавана. Што б не здарылася, людзі толькі глыбей уцісківалі галовы ў плечы, чакаючы наступнага ўдару ад цара, удару, які станецца яшчэ мацнейшым за папярэдні.

Ад гэтага было брыдка, было балюча, хацелася наўпрост ванітаваць. Жыць без прасвета было немагчыма. Але ўсе жылі. Праз "не магу".

Андрусь і Наста таксама жылі так. А што заставалася рабіць? Маладому настаўніку англійскай мовы і маладой доктарцы – нават з абвостаным пачуццём справядлівасці, з абвостраным прагненнем да новага світанку.

Заставалася толькі чакаць, калі пеўні праспяваюць пачатак новага дня. Чакаць закліку да новага жыцця і новай надзеі.

Абсалютная большасць насельніцтва бананавых краінаў лічыць, што асабіста ім не трэба нічога рабіць для пераменаў. Што прыйдуць добрыя героі-дзядзечкі, якія сваёй крывёю здабудуць лепшай долі для іх. Ім не ўцяміць, што героі не з'яўляюцца з нябыту ў патрэбны момант, каб выратаваць усіх – героі гэта простыя людзі, якія толькі робяць тое, што не ідзе насуперак сумленню, што яны лічаць правільным. Героі гэта чальцы статку, якія аднойчы паднялі галовы і дыхнулі паветрам, а не гноем. Я не ведаю герояў, якія адмыслова іrваліся памерці за тых, хто чакае гэтага, адмаўляючыся самім ударыць пальцам палец.

Бананавыя грамадзяне дзесяцігоддзямі жылі ў статках і лічылі, што аднойчы прыйдзе герой, які зробіць добра за адзін дзень. Нікому не хацелася ўсведамляць, што працэс пераходу ад бананавай дыктатуры да сапраўднага грамадства займае не адзін год цяжкай працы кожнага жыхара краіны, не адзін год пакутаў і беднаты. Інакш не бывае. Бананавых дыктатараў скідаюць не дзеля таго, каб жыць шчасліва самім. Іх скідаюць, каб шчасліва жылі дзеці.

Гэтыя два чалавекі, пра якіх ідзе мой аповед, проста сумленна рабілі сваю працу і хацелі, як лепш. Як лепш усім, а не толькі ім самім. Гэта было нязвыкла астатнім. Астатнія

жылі для сябе – на крайні выпадак для тых, хто быў зусім побач. Для ўсіх жыць не хацеў ніхто. Гэта можна зразумець, насамрэч, але да пэўнага часу.

Кідацца на барыкады з загадзя вядомым вынікам стаў бы толькі псіхічна неўраўнаважаны. Андрэй з Насцяй былі гатовы да любога развіцця падзей. Яны ведалі, што, магчыма, прыйдзецца ахвяраваць усім. У іх была толькі адна ўмова – яны хацелі, каб быў хоць адзін шанец на тое, што ахвяра не будзе дарэмнай. Такіх шанцаў не было.

Людзі нараджаліся і паміралі. Яны спяшаліся на працу і з працы і ім не было аніякай справы да таго, што яны маглі б змяніць. Ім не хацелася штосьці змяняць. Гісторыя ведае няшмат выпадкаў, калі статак паўставаў супраць пастухоў. Гэты статак быў узорным.

Як я ўжо казаў, Андрэю было дваццаць шэсць. Ён быў ростам крыху больш за сярэдні, чорнанавалосы, з правільнымі рысамі твару. На ягоных вуснах заўжды была ўсмешка, увогуле ягонае аблічча наўпрост патыхала добразычлівасцю да тых, хто не меў намеру стаць пасярод ягонай дарогі. Адно толькі халодны бляск шэрых вачэй даваў зразумець што гэты чалавек можа прайсці праз многія рэчы і не зламацца. Але гэта заўважалі не адразу.

Насценьцы ішоў дваццаць пяты год. Яна была на галаву ніжэй за Андрэя і ўвогуле стварала ўражанне ціхай дзяўчынкі, у чымсьці наіўнай, дзесьці баязлівай, але да апошняй клетачкі цела, да апошняга міліметру душы шчырай і адданай тым, каго любіла. Самая маленькая хлусня была для яе злачынствам – нават не перад людзьмі – перад сабой. Яна хацела мець душу чыстай, без аніводнай плямы. У яе не было прагнення быць святой – святымі адных людзей робяць іншыя, яна ж толькі хацела, каб сумленне не грызла па начох.

Яна мела доўгія саламяныя валасы – абсалютна натуральнага колеру – ніколі яна не фарбавала іх і не жадала, гэтая прыгажосць не мела патрэбы ўдасканалення – яна была абсалютнай.

І яшчэ ў яе былі карыя вочы. Калісь даўно Андрэй не мог сабе нават уявіць, што будзе кахаць дзяўчыну з карымі вачыма. Ён не любіў гэты колер, і ніколі ў яго не выклікалі сімпатыі дзяўчыны з карымі вачыма. Да таго моманту, пакуль ён не сустрэў яе, і ў той жа самы момант перастаў разумець, як можна гэтыя вочы не кахаць.

Сталіца жыла сваім звычайным жыццём. Людзі бегалі, мітусіліся і нельга было заўважыць заканамернасцяў у гэтым броўнаўскім руху. Адно было незвычайным – нервовасць, падвешаная ў паветры. Пятніца атрымалася нейкай змазанай, не такой, як звычайна. Кожнаму хацелася хутчэй вызваліцца з працы, і, не затрымліваючыся ў горадзе, дабрацца дамоў.

На гэта былі свае прычыны. Нядзеля была павінна стаць днём чарговых бананавых выбараў. Само слова “выбары” тут неадэкватнае абставінам, але, прынамсі, гэтае дзейства называлася так. Ненахіляемы вождзь у чарговы раз выходзіў на татамі супраць здраднікаў, агентаў Захаду (і Усходу таксама) і проста беспрынцыпных інтрыганаў ад палітыкі. Так сваіх супернікаў называў сам бананавы ўладар і ягоныя халуі. І правільна, навылязала ўсялякіх тут – зубы точаць на маёмасць правадыра. У нармалёвых краінах за такое ўвогуле з’ядаць з вантробамі прынята на адмысловых святах кшталту папуаскіх Дажынак, шкада толькі што налёт цывілізацыі перашкаджае – суседзі не зразумеюць, якія ўжо паспелі з пальмы злезці.

Запраданцаў і здраднікаў гэтым разам было ажно цэлыя тры штукі. Пристойным грамадзянам ніяк не было ўцяміць,

адкуль бяруцца гэтыя пацукі, якім хапае смеласці (альбо не хапае мазгоў) ісці супраць самага разумнага, самага смелага і самага справядлівага прэзідэнта ў свеце; тыя ж, каму прыстойнасці не хапала, рыхтаваліся выходзіць на вуліцы, каб падтрымаць кандыдатаў, за якіх яны насмрэч аддалі свой голас. Цікава нават было прасачыць накірункі руху першых і другіх: прыстойныя, прагаласаваўшы, і тут жа, не адыходзячы ад касы, адзначыўшы сваё волевыяўленне танным, з нагоды выбараў, гарэліўсам, спяшаліся залегчы ў хаце. Непрыстойныя ж рухаліся адваротным шляхам – падалей ад дому – у цэнтр, да сваіх, якіх у такі дзень бывае на вуліцах у тысячу разоў больш, чым звычайна.

Але ўсё гэта павінна было быць толькі праз дзень. Пакуль усе спяшаліся па хатах – абмеркаваць, падрыхтавацца ці проста больш надзейна залегчы на дно.

– Каву будзеш? – Андрэй прайшоўся па кухні, адчыніў фортку, выцягнуў цыгарэту. Запаліў, высунуўся ў вакно па пояс.

– Не хачу, – ціха адгукнулася Насця.

– Злуешся? Дарэмна. Злавацца потым будзеш, калі я ў нядзелю ноччу з сябрамі завісну, замест таго, каб да цябе вярнуцца. А калі будзеш зараз злавацца, бачыць Бог, так і зраблю.

Насця змучана ўсміхнулася.

– Не першы ж раз, ведаеш, чым гэта ўсё сканчаецца.

– Цудоўна ведаю. Таму і іду. Ты хочаш, каб яно да другога прышэсця так сканчался?

– Усё роўна ўсё застанецца, як было. А мне страшна.

– Думаеш, мне не страшна? – Андрэй узяў зэдлік, падсеў да яе. – Яшчэ як страшна. А інакш не магу. Хай усё застанецца, як раней. Мне таксама не верыцца, што мы штосьці зменім, так, наўпрост выйшаўшы. Цудоўных сцэ-

нароў з серыі "само паваліцца" ў жыцці не бывае. Толькі ў блакітных апазіцыйных мроях. Але я хачу толькі паказаць, што мне не страшна, хоць насамрэч я баюся. І паказаць я хачу нават не ім, гэтым чорным папуасам з палкамі і без мазгоў – найперш сабе. Гэта як аўтатрэнінг, разумееш? Я хачу каб аднойчы я сам перастаў верыць, што баюся іх.

Ён запусціў руку ў яе валасы.

– Нічога не будзе. Не хвалюйся. Нас будзе шмат, як-небудзь здолеем адзін аднога абараніць.

– Ад каго? Ды калі яны на самой справе захочуць, вас пазабіваюць там на гэтых вуліцах!

– Нас? Не ведаю як нас, але я буду жыць вечна. Ты што, не ведала? Я гэта запланаваў ужо занадта даўно, каб раптам змяняць мае планы.

– Я баюся...

– Я таксама. Ад гэтага нікуды не збяжыш. Але трэба хаця б спрабаваць з гэтым штосьці зрабіць. Інакш, за якой халерай было нараджацца, каб пражыць кожную хвіліну, нечага баючыся? Гэта як-небудзь без мяне.

– Я хачу пайсці з табой.

– А вось гэта выключана.

– Але...

– Насця, не. Мы з табой ужо размаўлялі на гэтую тэму.

– А што мне рабіць? Сядзець у чаканні, што ты не вернешся?

– Навошта? Можаш мне за гэты час вячэру зрабіць. Вярнуся позна і галодны.

– Ведаеш, у такія моманты твае жарты зусім не смешныя.

– Гэта гледзячы, як увогуле да жыцця ставіцца. Не бяры ў галаву, скажы сабе, што ўсё будзе добра. Усё насамрэч будзе добра.

– Я не магу сабе казаць такія рэчы. Я сабе не веру. Надта добра ведаю.

Андрэй падняўся.

– Ну што мне яшчэ табе сказаць, каб ты мне паверыла і супакоілася? Перажывалі і не такое. Памятаеш, пяць год таму, калі на мінулых выбарах усіх пачалі браць, а я з сябрамі выслізнуў, калі, здавалася, ужо не атрымаецца зваліць? Я ўдачлівы сукін сын. Апошні раз пытаюся, каву будзеш?

– Палова на дзявятую вечара, якая кава?

– Нуу... мне дык, напрыклад, ніколі гэта спаць не перашкаджае.

– Пакуль.

– Я ж кажу, я збіраюся жыць вечна. І ніхто мне не ўказ тут.

– А я?

– Што ты?

– Я буду жыць вечна?

– А хто перашкодзіць?

– Яны.

– Яны? Як табе можа перашкодзіць тупая малпа, якая за ўсё жыццё з класікі чытала толькі буквар і "тую, тонкую, па карыстанні ПМ[6]"?

– Тады Бог.

– Бог? Я Бог. Ты Бог. Кожны з нас Бог у сваім жыцці. Я не веру ў лёс. Лёс гэта тое, што ты пабоўтала ножкай у паветры. Кожнае імгненне жыцця ты робіш сама, і ніхто яго для цябе не напісаў, ніколі й не напіша. А калі знойдзецца хтосьці, хто захоча гэта зрабіць... Ну, значыць, трэба вяртацца да пункту з малпай, бо больш ні ў каго не хопіць мазгоў планаваць чужое жыццё.

---

[6] ПМ – пісталет Макарава

– Давай скончым гэтую тэму...

– Чаму?

– Я не хачу хваляваццa, пакуль яшчэ нічога не пачалося. Ты заўтра не працуеш?

– Не. А што, павінен? Субота ж.

– Суботы-суботамі... У мяне, напрыклад, заўтра дзяжурства.

– Опа, прыехалі. А чаму толькі зараз сказала?

– Таму што сама толькі сёння даведалася. Гэта ж нашая бананавая бальніца, можна падумаць, не ведаеш, як гэта ў нас звычайна адбываецца.

– Вось табе яшчэ адна прычына ісці.

– Хопіць, калі ласка! Праблемаў можна назбіраць тысячы, дакладнага шляху іх вырашэння адно няма.

– Блытаеш хвост з галавой. Шляхі вырашэння ёсць заўсёды, але яны патрабуюць смеласці не адной тысячы чалавек, а галоўнае – жадання штосьці вырашаць. Такога жадання я і пад мікраскопам пакуль не бачу – калі камусьці падабаецца жэрці лайно – ды, калі ласка, я, напэўна, адмоўлюся. І тое, што я буду ў меншасці, гэта ўжо не мая праблема.

– А чыя? Іх? Праблема гэта тое, што хвалюе – а яны, здаецца, не хвалююцца ані кроплі.

– Калі маньяк забівае чалавека – і яго гэта не хвалюе, скажаш, што праблемы ў яго няма? З ім усё добра? Калі дурань жыве ў лякарні, клеіць картонавыя каробачкі і атрымлівае кожны дзень свае лекі, яго гэта задавальняе, ён ад гэтага перастае быць дурнем? Не смяшы мяне.

– Мне надакучыла, – Насця зрабіла выгляд, быццам разглядае свае пазногці.

– Ты злуешся.

– Не злуюся.

– Ага, так заўжды й бывае. “Я не злуюся, я проста вельмі-вельмі засмучана”.

– Я пайду спаць, прабач.

– Дакладна злуешся...

– Дабранач.

Насця паднялася, акуратна паставіла зэдлік пад стол. Выйшла і зачыніла за сабой дзверы. Не азірнулася.

Андрэй зноўку запаліў.

Яны ніколі не сварыліся. Нават такія сітуацыі здараліся разы тры, не больш. Але ад гэтага было яшчэ больш непрыемна.

За вакном панавала цёплая вясновая ноч. Ліхтары на вуліцах не гарэлі – бананавая краіна эканоміла зусім не бананавыя даляры на замежную электрычнасць. А што там, цемра – сябра моладзі. Нефіг яшчэ ўначы вуліцы асвятляць, ноччу спаць трэба. Нават калі няма каменданцкага часу.

Цыгарэта павольна цьмела ў пальцах. Андрэй пакруціў яе, аглядеў з розных бакоў, нібыта хацеў прачытаць на ёй некую параду, як быць далей. Парады не было. Надпіс “Camel. Natural flavour” на нейкі арыгінальны запавет ніяк не цягнуў. Андрэй з нейкай прыкрасцю выкінуў абпалак, потым рэзка зачыніў шыбу.

Нічога не хацелася. Дакладней не так – хацелася чагосьці з серыі альбо канфетку, альбо вены парэзаць. Такі стан Андрэй не любіў больш за ўсё. Нявызначанасць прыгнятала.

...Праз паўгадзіны ён увайшоў у пакой. Насця не спала – ён адчуваў гэта. Для іх было немагчыма падмануць адзін аднаго – нават у гэтым. І хоць яна ляжала, адвярнуўшыся да сценкі з заплюшчанымі вачыма, ён ведаў, яна проста не мае жадання з ім размаўляць.

Андрэй ціха распрануўся, лёг побач. Паклаў руку на яе

плячо. Яна ўздрыгнула, але не павярнулася, як то рабіла звычайна. Андрэй адчуваў сябе вінаватым.

...Насця заснула праз гадзіну. Яна так і не павярнулася да яго, не сказала ані слова. А ён ляжаў, зарыўшыся носам у яе валасы і яму было крыўдна з чагосьці, чаго ён сам не мог зразумець.

Ён так і не спаў да самай раніцы. У галаву лезлі нейкія недарэчныя ўспаміны, і ён адганяў іх прэч, але яны не жадалі адыходзіць.

І толькі а пятай раніцы ён, нарэшце, здолеў праваліцца ў сон, ціха шэпчучы ёй на вуха як калыханку сваю любімую песню...

So
Sleep, sugar, let your dreams flood in,
Like waves of sweet fire, you're safe within
Sleep, sweetie, let your floods come rushing in,
And carry you over to a new morning.[7]

У суботу яны амаль не бачыліся. Андрэй прачнуўся толькі а трэцяй гадзіне, калі яна ўжо збіралася ў бальніцу. Яны вяла перакінуліся парай словаў, потым Насця без асаблівай пяшчоты пацалавала яго ў шчаку і выслізнула за дзверы. Ён застаўся адзін. Сумна пахадзіў па кватэры, выйшаў у краму. Там доўга блукаў сярод прылаўкаў, нарэшце паклаў у кошык дзясятак яек і салодкую булку. Расплаціўся, выйшаў на прыступкі.

Настрою не было зусім. Была толькі нейкая прыгнечанасць, скаванасць.

---

[7] Poets Of The Fall – Sleep

Андрэй дайшоў да кватэры, у нейкім самнамбулічным стане адчыніў дзверы, паставіў імбрык.

Залез у інтэрнэт, праглядзеў апошнія навіны. Псеўдапалітыкай былі забітыя ўсе стужкі. Гэта надакучвала ўжо даўно, але іншага не было.

Дзесьці на сценцы ціха цікаў гадзіннік. Ад гэтага звычайна супакойваючага гуку зараз дзесьці глыбока пачала нараджацца нервовасць.

Без аніякага сэнсу Андрэй пахадзіў па кватэры. Трывога не знікала. Трывога беспадстаўная, абсалютна недарэчная, але нейкая вельмі цяжкая і нервозная.

Андрэй штосьці напружана абдумваў. Трывожнае прадчуванне вымагала зрабіць штосьці важнае, што лепш не адкладваць.

Ён сеў за стол, адчыніў сваю шуфляду. Там у яго ляжалі асабістыя рэчы – старыя лісты ад далёкіх сяброў, нейкія фотакарткі яшчэ з дзяцінства, сувеніры, якія рука не падымалася выкінуць – усе дробязі, якія выклікалі ў сэрцы настальгічнае замілаванне. Сюды не лазіла нават Насця – ведала, што ён гэтага не любіць.

Некалькі хвілін ён аглядаў сваё багацце, пільна ўглядваўся ў фотаздымкі, нават перачытаў некалькі лістоў. Потым падцягнуў да сябе аркуш паперы і асадку, крыху падумаў, пачаў штосьці хутка пісаць. Яшчэ праз дзесяць хвілін ён склаў аркуш, запячатаў яго з трох бакоў стэплерам – як гэта звычайна робяць, калі хочуць пакласці ў паперу грошы. Надпісаў, паклаў яго ў шуфляду.

Дзень павольна стаў вечарам. Вечар хутка стаў ноччу. Спакой так і не вярнуўся. Напэўна для яго спакой стаў сінонімам да Насці. Без яе ніякага спакою не было ніколі. Проста сёння трывога была чамусьці мацнейшай...

***

Андрэй выйшаў з дома рана. Насцю затрымлівалі ў бальніцы. Яна штосьці тлумачыла па тэлефоне, але ён, зноўку невыспаўшыся, зразумеў толькі, што яна будзе дома не раней за трэцюю гадзіну дня. Па яе голасе нельга было зразумець, ці злуецца яна яшчэ дагэтуль – у ім не было нічога, акрамя стомы.

Прайшоўся да будынку школы, дзе быў арганізаваны пункт для галасавання, ўспомніў, што забыўся дома пашпарт. Давялося вяртацца. Пашпарт назло не жадаў знайсціся. Нарэшце Андрэй выкапаў яго з-пад завалу кніг.

Вярнуўся да школы. Паставіў свой роспіс ў ведамасці, потым абсалютна нічога не варты крыжык у бюлютэні, склаў паперу, укінуў яе ў скрыню для галасавання. Чальцы выбарчай камісіі глядзелі на яго насцярожана – ці гэта толькі падавалася? У іх была такая праца – забяспечыць правільныя выбары нягледзячы на тое, чаго жадалі выбарцы.

Андрэй хутчэй выйшаў з будынку, на прыступках якога радасна квасілі мясцовыя сінюжкі. Для іх гэта было святам таннага бухла і нічым больш. Андрэю тут хацелася ванітаваць.

Ён запаліў цыгарэту. Усю раніцу ён стрымліваў сябе, каб не паліць – для яго адзінай смачнай цыгарэтай была першая, выпаленая за дзень – астатнія паліліся ўжо не для смаку, а хутчэй па звычцы. Першая ж давала наўпрост фізічнае задавальненне, як першы глыток вады пасля працяглай смагі.

Ішла толькі пятая гадзіна. Дамоў ён не збіраўся вяртацца – не хацеў каб Насця хвалявалася. У горадзе пакуль таксама рабіць не было чаго – занадта рана, да таго ж можна было трапіцца ў лапы чарговага патруля, якіх на вуліцах у гэты дзень была процьма, трапіцца ні за што, а, як кажуць, “па

падазрэнні". Затрымлівалі ўсіх, хто выклікаў недавер, хто хоць мінімальна, сваім выглядам, даваў падставы меркаваць, што выйдзе сёння ўвечары на вуліцы – выйдзе, увальецца ў натоўп і разам з дзясяткамі тысяч такіх жа стане патрабаваць нават не змены ўлады, а справядлівасці і свайго права на жыццё сярод нармалёвых людзей, а не сярод клоўнаў.

Андрэй ішоў вуліцамі горада, а навокал квітнела вясна. Напэўна, гэта было галоўнай памылкай бананавага дыктатара – прызначыць выбары на вясну. Справа нават не ў тым, што вясна наталяла нават у самых баязлівых сэрцах прагу да пераменаў – не, такія метафізічныя пытанні лепш увогуле не прымаць да разгляду, калі размова ідзе пра тое, што тэарэтычна магло скончыцца крывёю. Памылка была ў тым, што вясною не халодна стаяць на плошчах нават уначы, і людзі рыхтаваліся заставацца на адну ноч, на дзве – урэшце на столькі начэй, колькі хопіць, каб дамагчыся хоць нечага. Людзям было не ўцяміць, што стаяннямі справы не вырашаюцца. Не, можа дзесьці там, у еўрапейскіх дэмакратычных краінах, дзе ўрады змяняюцца раз на паўгады, гэтыя метады і працуюць – бананавым дыктатарам стаянні былі роўна пабаку. Яны маглі забіваць пратэстоўцаў, маглі кідаць тых у турмы, а маглі наўпрост не заўважаць.

Стаяць было нельга. Трэба было дзейнічаць. Для дзеянняў не хапала ні смеласці, ні людзей (найперш мужных мужчын), ні сродкаў.

Андрэй адно ішоў туды. Насамрэч, каб даказаць самому сабе, што не баіцца. Нельга баяцца, нават калі цябе забіваюць – самае страшнае гэта даць волю страху. Нават дзікі сабака не нападзе на цябе да таго моманту, пакуль ты не даш яму зразумець, што баішся яго. Чаму? Ды толькі таму што ён сам баіцца цябе, твой жа страх дае яму зразумець, што ён мацнейшы, і што ён заб'е цябе, калі захоча.

Андрэю хацелася проста паспець. Паспець пражыць не дарма. Альбо хоць пражыць, не паспеўшы састарыцца настолькі, каб скарыцца часу, знешнім абставінам і сваім слабасцям, якія б прымусілі яго адмовіцца ад сваёй прынцыповасці ў поглядах на жыццё. Іншым падавалася гэта максімалізмам – іншых для Андрэя не існавала, для яго існавалі толькі тыя, хто не агаляў дупы аніразу. Напэўна, у такой сітуацыі слова "максімалізм" справядлівае толькі для тых, хто навучыўся прадавацца сам і прадаваць сваё сумленне – не істотна, прадаваць бананаваму прэзідэнту альбо наўпрост свайму ўласнаму страху. У бананавых дзяржавах не магло быць паўмераў. Біць так біць – а адценні чорнага і белага хай шукаюць там, дзе ёсць сапраўднае грамадства і сапраўдныя выбары.

Бананавы папуас – кіраўнік племені насамрэч баяўся свайго народа. Ён цудоўна разумеў, што народ ненавідзіць яго, ненавідзіць люта, да болю ў сціскаемых кулаках, але ўдарыць баіцца. Бананавы прэзідэнт быў, як той дзікі шалёны сабака – ён карыстаўся гэтым страхам і біў першым – біў бязлітасна, моцна і з разлікам, калі не забіць адразу, дык заткнуць рот на гады.

Андрэю не падабалася баяцца, але страх не заткнеш пальцам. Ён ішоў крок за крокам, кіламетр за кіламетрам, ён паліў цыгарэту за цыгарэтай, неўзабаве дабіў пачаты яшчэ ўчора пачак, забег у краму, набыў новы. Пасядзеў на прыпынку, паглядзеў на людзей. Паспрабаваў здагадацца, хто з іх вечарам прыйдзе туды, на праспект. Кінуў гэтую справу. Здагадацца было адно немагчыма.

Раптам страшна расхацелася ісці. Адчуванне было такое, нібы твой сабака цягне цябе за штаніну, брэша і бы плача: "не хадзі". Андрэй не верыў у прыкметы. Ён ішоў. Ішоў, хоць кожны крок даваўся ўсё цяжэй.

У цэнтры ён быў а палове на восьмую. Выбарчыя ўчасткі зачыніліся паўгадзіны таму, і зараз вуліцы сціхлі ў цяжкім чаканні. Выпадковыя мінакі спяшаліся хутчэй знікнуць, а на маленькіх вулачках, непрыкметных з праспектаў, ужо расцягваліся машыны з бананавым спецназам. Салдаты, нягледзячы на сваю бананаваць, былі насамрэч страшнымі. Для іх не існавала межаў у паводзінах, і калі цар скажа "забі", ягоная верная малпа ўчэпіцца ў глотку і заб'е. Для яе не было законаў. Для яе быў толькі цар.

На чарговым скрыжаванні Андрэй спыніўся. Перад ім стаяў стары сябар, Міхал, з якім яны вучыліся яшчэ ва ўніверсітэце. Яны не бачыліся ўжо досыць даўно, але, напэўна, сённяшняя сустрэча адбылася не проста так. Патрэбным людзям не трэба папярэдне дамаўляцца аб сустрэчы – жыццё само звядзе іх, калі спатрэбіцца.

– Прывітанне.

– Ну, здароў. Як?

– Жывы паціху. Нічога не чутна?

Чутна было шмат. І пра тое, што адбывалася на выбарчых участках пасля закрыцця, і пра тое, як дзесьці там, наперадзе, збіраліся ўжо тысячы й дзесяткі тысячаў чалавек, і пра дробныя сутычкі з міліцыяй, якія раз-пораз адбываліся ў натоўпах. Большасць з іх была зладжана п'янымі, верагодней за ўсё правакатарамі. Іх скручвалі, выводзілі з натоўпа, па магчымасці здавалі міліцыі. Міліцыянты не праяўлялі асаблівага жадання тых забіраць (вядома ж, свае), але прыходзілася, каб не правакаваць датэрмінова натоўп да жорсткасці.

Яны ішлі наперад, паціху ўліваючыся ў людскія плыні, якія сцягваліся наперад, да галоўнай плошчы вялікага гораду.

Чалавечае мора, якое яны ўбачылі там, не паддавалася

ніякаму апісанню. Міхась з Андрэем здолелі прасачыцца ў самы цэнтр натоўпа, якому,здавалася, няма канца.

Што было далей, я пакуль ня ведаў.

Але сляды двух дарослых мужчын у віры тысяч свабодных чалавек губляліся нават для мяне.

На бананавую зямлю апускаўся вечар, ён ахінуў сабой ўсё, і ў яго цемры я ўжо не бачыў ані праменьчыка святла...

***

Ён не прыйшоў увечары. Не прыйшоў раніцай. Ягоны тэлефон не працаваў.

Яна не спала ноч. А ранкам пайшла ў міліцыю. Там ёй сказалі, што не заводзяць справу, пакуль з моманту знікнення чалавека не пройдзе тры дні. Яна аблаяла дзяжурнага міліцыянта, чаго з ёй раней не здаралася ніколі, аблаяла і выйшла, хлопнуўшы дзвярамі.

Ні для каго не было тайнай, што ўвечары трыццаць тысячаў мірных дэманстрантаў літаральна за дваццаць хвілін раскалашмаціла некалькі палкоў спецназу і ўнутраных войск, што шмат хто з пацярпелых зараз у бальніцах, што ў турмах не хапае месцаў для затрыманых. Яе саму выклікалі на службу, але яна кінула слухаўку пасля таго, як галоўны доктар сказаў, як яму пофігу, што яе муж не прыйшоў дадому, тым больш што ён "гатовы спрачацца, таксама зараз у турме".

Насця тэлефанавала ўсюды, куды маглі прывозіць пацярпелых. Усюды ёй казалі, што такога сярод паступіўшых ноччу няма. Потым яна кінула гэтую марную справу і паехала да ізалятараў, куды звозілі ўсіх, каго ўзялі ўчора. Там яна прабадзялася да самага вечара. Яго не было нідзе.

Насценька прыйшла дадому, ледзьве зняла лёгкую кур-

тачку, у якой праездзіла ўвесь дзень, пасля чаго апусцілася на калені і заплакала, як не плакала з тых часоў, калі была дзіцем.

Андрэй знік, не пакінуўшы абсалютна ніякіх звестак. Не было нікога, хто б мог сказаць, што здарылася з ім, чаго зараз чакаць ёй і дзе шукаць яго.

Сітуацыя была патавай. Яна не ведала, што ёй рабіць, не ведала, куды ісці, яна была ў натуральным адчаі.

Маленькая дзяўчынка, якая апошнія гады пачувала сябе абароненай ад усяго ў свеце ягонай спіной, зараз была абсалютна адна.

На кухні Насця накропала сабе валяр'янкі, выпіла, потым, праз паўгадзіны, паўтарыла тое самае. Не дапамагала. Не дапамагала і не магло дапамагчы.

Яна так і плакала да раніцы і не магла з сабой нічога зрабіць.

А дзясятай яна паднялася і зноўку пайшла па ізалятарах. За ноч спісы папоўніліся на некалькі дзясяткаў чалавек, але яго сярод іх, канешне ж, не было.

Гэта нагадвала страшны сон. Яна не магла зразумеець, што ўвогуле адбываецца навокал, не магла зразумець, чаму аніяк не атрымліваецца прачнуцца.

Андрэя шукалі сябры. Днямі яны ездзілі па ўсіх магчымых інстанцыях, пыталі ўсіх, каго можна, сядзелі з ёй дома па начох. Яна баялася заставацца адной ноччу. І не магла спаць. Ішлі суткі за суткамі, але ў яе не атрымлівалася заснуць нават на хвіліну. І з гэтым нічога не маглі зрабіць.

На ўсе запыты адказвалі, што такога не бачылі, такога не прывозілі, такога не ведаем. Ідзіце нахер. Без вас працы хапае.

Насціны валасы, падавалася, на вачах сівелі. Гэты быў толькі падман зроку, але за некалькі дзён пошукаў без сну

яна пераўтварылася з незвычайнай прыгажуні ў бабулю з глыбокімі зморшчынамі пад вачыма.

Ёй казалі, што няма сэнсу так хвалявацца, што, напэўна, ён зараз таксама ў ізалятары, а ягонага прозвішча няма ў спісах толькі таму, што аніякіх афіцыйных звестак ад міліцыі няма і імёны затрыманых збіраюць выключна праваабаронцы, у якіх, канешне ж, не было і не магло быць дакладнай інфармацыі. Яна слухала гэта і яе сэрца замірала. Божа, як ёй хацелася таму верыць! Яна верыла думкамі, але прымусіць верыць сэрца не атрымлівалася. Сэрца не верыла і аблівалася крывёй. Напэўна, калі б яе сэрца было чалавекам, а не адной толькі яго часткай, яно б спілася ад безнадзейнасці.

Заўтра пераўтварылася ў бясконцае сёння, якое назаўжды застыла на адным месцы, і пракляты час не рухаўся з месца, рухаліся толькі стрэлкі гадзінніка.

Навокал адбывалася суцэльнае пекла. Людзей, якія трапілі ў лякарні, пакрысе выпісвалі, і адразу ж іх забіралі чорныя бананавыя людзі. Да тых, хто так ці йнакш мог стацца недабранадзейным, прыходзілі ўначы. Некаторым шанцавала – у іх толькі рабілі жорсткіяператрусы, забіралі ўсё, што толькі маглі: грошы, аргтэхніку, карэспандэнцыю, нават кампутары, якімі карысталіся выключна дзеці; іншых жа забіралі саміх, забіралі і звозілі ў турмы, чэкісцкія сховішчы, і ад іх таксама днямі не было аніякіх навінаў. Але яны так ці йнакш знаходзіліся, хай збітыя, скалечаныя шалёнымі вырадкамі бананавага папуаса, але ЗНАХОДЗІЛІСЯ!

Яго не было. Прайшоў дзень, другі, трэці. Прайшоў тыдзень. Прайшло дзесяць дзён, а яна ўсё не ведала, што з ім, і паціху вар'яцела.

За ўвесь гэты час яна заснула толькі два разы – і тое на тры гадзіны. У снах ёй падавалася, што раптам ён вярнуў-

ся дадому – жывы і здаровы, у снах ён смяяўся і падымаў яе на рукі. І яна таксама смяялася разам з ім, а потым плакала ад шчасця, што ўсё, нарэшце, скончылася. Яна расцірала слёзы па шчоках і саромелася гэтых слёзаў, а ён асцярожна і пяшчотна цалаваў яе ў закрытыя вочы.

Потым яна прачыналася, і кожны раз думала, што лепш бы заснуць назаўжды, таму што цёмны пакой і нявызначанасць былі больш страшнымі за смерць. Яна прачыналася і таксама плакала – толькі ад страху, а не ад шчасця.

На дзесяты дзень яна скончыла хадзіць па турмах – за яе гэта рабілі сябры. Але не рабіла гэтага не з-за таго, што згубіла веру нават у думках – яна наўпрост не магла выйсці за дзверы сваёй кватэры. Яна толькі стаяла на каленях перад сваёй іконкай Маці Боскай Чанстахоўскай, малілася і рыдала, не ў сілах скончыць свой енк ані на хвіліну.

Ежу ёй гатавала сяброўка, якая жыла гэтыя дні ў іх кватэры, яна ж кожны вечар прымушала яе легчы паспаць, і Насця сапраўды клалася ў ложак, але не для таго, каб заснуць, а толькі, каб сяброўка пакінула яе адну. Насця не хацела бачыць нікога. Яна была бязмежна ўдзячнай сябрам за ўсё тое, што яны рабілі, за паходы па бальніцах і ізалятарах, за тое, што яны ледзь не гвалтоўна кармілі яе і ўкладвалі спаць, за тое, што давалі ёй магчымасць хоць з кімсьці паразмаўляць, але яна проста не магла ні з кім бачыцца. Ёй хацелася ўбачыць толькі аднаго чалавека, і гэтай магчымасці ў яе не было.

Вясна скончылася і засталася дзесьці там, у далёкім мінулым. І хоць насамрэч за вакном быў толькі травень, але яна ненавідзела яго. Для яе не было вясны. Для яе не было дня. Былі толькі халодныя ночы, калі яна не спала і плакала, а больш нічога й не заставалася.

Ішоў чатырнаццаты дзень.

Насця схуднела да стану прывіду, якога не кармілі апошнія гадоў пяцьсот.

За вакном весела спявала нейкая птушка, а Насці хацелася злавіць яе і задушыць. Яна закрывала вокны, але птушыныя спевы адно прабіваліся праз іх, і Насця закрывала з усіх сілаў рукамі вушы.

У дзверы званілі настойліва ўжо пяць хвілін. Сяброўка баялася адчыніць, ведаючы, што адбываецца навокал, але, нарэшце, яна не вытрымала.

За дзьвярыма стаяў парослы чорным шчаціннем Міша. Ягоныя вочы палалі вар'яцкім вагнём, сам ён выглядаў досыць дзіўна – для чалавека, які б паглядзеў на яго на вуліцы. Гадзіну таму Міхась выйшаў з турэмнай камеры, і, не заходзячы дадому, адразу накіраваўся сюды.

– Дзе Насця?

– Як ты... Што з Андрэем?

– Насця!! НАААСЦЯ!!!!

– Мішка!!

Міхась ледзьве не вынес дзверы ў пакой.

– Мішка... даражэнькі, мілы, дзе ён?! Дзе Андрэй??!

Замест адказу хлопец апусціўся на калені і пачаў плакаць.

– Міша! Мішка, не маўчы! Што з ім?!

Насця ўсё адмаўлялася разумець, а ён глядзеў у яе вочы, плакаў і толькі матляў галавой. Яго наўпрост душыў страшны енк і ён не мог сказаць ані слова.

А яна раптам зразумела ўсё.

У адзін момант знік страх. У адзін момант знік адчай. У адзін момант знік боль. Знікла абсалютна ўсё, і тое, што засталося было куды страшней за страх, адчай, боль і фізічную стому. Засталася абсалютная пустэча. Свет скончыўся, скруціўся ў маленькі шарык, а потым разарваўся,

як выбухае новы сусвет. І ў гэты момант два тыдні вар'яцкага страху падаліся Насце ледзьве не лепшым з таго, што можа быць у жыцці, таму што страшней за гэтую пустэчу ў свеце не магло быць нічога. І ніколі гэтага не зразумее чалавек, які не апускаўся ў гэтае Нішто.

І яна не крычала, не плакала. Плач падаваўся ледзь не смешнай рэакцыяй на тое, што здарылася.

Плакаў толькі Міхась, які перажыў гэта два тыдні таму – і толькі зараз ён мог плакаць, толькі зараз да яго вярнулася магчымасць адчуваць як звычайны чалавек і як звычайны чалавек перажываць. Яна не магла.

Яна не чула, як яе трасуць за плячо, як ёй крычаць і хлопаюць па шчоках, жадаючы прывесці ў свядомасць. Ёй не трэба было свядомасці.

Потым, на кухні, Міхась скрозь слёзы распавядаў, як іх разарваў ашалелы ад страху натоўп, але яны да апошняга не гублялі адзін аднаго, як ляцелі на людзей зацягнутыя ў чорнае звяры, як яны валілі ўсіх на зямлю і білі палкамі і нагамі, як ламалі косці і выбівалі зубы. Ім непатрэбныя былі ані вадамёты, ані гумовыя кулі, і, тым больш, кулі сапраўдныя – кожны з гэтых нелюдзяў быў сапраўднай машынай для забойства, а перад імі былі безабаронныя людзі, якія ніяк не маглі ўцяміць, што іх будуць забіваць, і што адзіны паратунак – біць у адказ, ніякіх хрысціянскіх сопляў пра другую шчаку.

Міхась казаў, як на яго навалiліся зверху і некалькі разоў далі нагой па рэбрах, але яму, можна сказаць, пашанцавала, яго так і пакінулі валяцца на зямлі, збітага і закаванага; як ён бачыў, што наперадзе, метрах у дзесяці, на зямлю павалілі Андрэя, а ён усё супраціўляўся, удала грукнуўшы аднаму спецназаўцу па калене, ад чаго той ледзьве не ўпаў. І потым, нават на зямлі, пад градам удараў, Анд-

рэй спрабаваў дацягнуцца рукамі да палкі, каб вырваць яе з рук бананавай поскудзі, а яго ўсё білі і білі – па тулаве, па руках, але больш за ўсё па галаве, пакуль ён не сціх, страціўшы прытомнасць. Але й потым страшнае катаванне не скончылася, і некалькі наступных хвілін трое ашалелых ад злосці і паху свежай крыві чорных лупілі непрытомнае цела, ажно пакуль вакол ягонай галавы не расцяклася вялікая лужына крыві.

Першы лебедзь адышоў, закляваны чорнымі каршунамі. Народжаны, каб кахаць, а не біцца, ён усё ж такі напрыканцы выбраў бойку і заціх без аніводнага шанца на перамогу.

Ён хацеў жыць вечна. Ён будзе жыць вечна. Але ўжо далёка ад гэтай паскуднай зямлі. Ягонае месца было ў любімым небе.

***

Ліст у шуфлядзе Насця знайшла праз дзень. Ён чакаў на яе, каб аддаць цеплыню каханага сэрца хоць у няроўнай вязі незразумелага почырка.

“Прывітанне, мая маленькая! Я шчыра веру, што ты ніколі не прачытаеш гэты ліст, што я прыду дадому ў нядзелю (на крайні выпадак не ў нядзелю, а праз некалькі дзён, калі мяне ўсё ж такі прымуць бананавыя макакі:=)), скамячу гэтую паперку і выкіну яе з чыстым сумленнем у сметніцу. Але я не выключаю і таго варыянта, што са мной штосьці можа здарыцца – у нашай краіне ад гэтага ніхто не абаронены, ты ж ведаеш. А ў мяне зараз нейкае дурное прадчуванне. Ды халера з ім, я не веру прадчуванням, як не веру ва ўсю гэтую лухту пра прарочыя сны, прадказанні будучыні і гэтак далей. Усё канешне ж будзе добра! І ўсё ж...

Мы марылі мары пра тое, што аднойчы ўсё зменіцца – мы не будзем баяцца і ненавідзець людзей ва ўладзе, не будзем хадзіць пад дамоклавым мячом звальнення па ідэалагічных чынніках, будзем адчуваць сябе на сваёй зямлі гаспадарамі, а не ваеннапалоннымі, якім загадана адно маўчаць і працаваць на карысць бананавай краіны, дзе няма нават бананаў.

Мы марылі, марылі, марныя марылі мары, во, якую канструкцыю выдаў! Аж самому спадабалася.

Але што там канструкцыі... Адно разумеем мы абодва: гэтыя мары – нішто. Ім ніколі не збыцца, пакуль мы шэпчамся на кухнях, і нам сорамна за тое, што мы больш ні на што не здольныя – толькі шаптацца, таму што мы, на хвілiначку, баімся!! Чаго? Болю? Смерці? Турмаў? Боль можна трываць. Нават турму можна перажыць. А што тычыцца смерці... Мы ж робім гэта не для сябе – для дзяцей, не істотна, сваіх ці чужых. А больш за адзін раз яны ўсё роўна забіць няздольныя. Ні халеры, курвы, не ўмеюць...

Прывітанне ім ад мяне, дарэчы, калі што. Вельмі спадзяюся за ўсё з імі разлічыцца, хоць нават па той бок дажджоў. Я-та дачакаюся. Галоўнае, каб яны дачакаліся.

У любым выпадку, я больш за ўсё зараз жадаю, каб ты ніколі не прачытала гэты ліст, гэты баязлівы ліст, за які мне сорамна, сорамна за тое, што я паддаўся сваму страху, а страху паддавацца нельга ні ў якім выпадку. Што са мной можа здарыцца? Ды нічога! Ніколі і нічога. Яшчэ не хапала, каб я дазволіў з сабой штосьці зрабіць. А за ліст мне адно сорамна...

Я калісьці казаў табе, што хачу мець ад цябе дзяцей. Хачу. Вельмі хачу. Я наўпрост зараз бачу, як я апранаю ў дзіцячы садок нашу дачку, як я гуляю ў футбол з нашым сынам, а ты злёгку злуешся на нас, што мы так позна затрымліваемся на вуліцы, і вячэра даўно састыла.

Толькі ці не падаецца табе, што нараджаць дзяцей зараз у нашай краіне – гэта здзек над імі, над іх будучыняй, над іхнімі лёсамі? Пакуль мы не можам сказаць, што нашыя дзеці будуць шчаслівымі тут, можа мы нават не маем права іх нараджаць? А дзеці не могуць быць шчаслівымі ў канцэнтрацыйным лагеры. Мы ж зараз у ім і жывем. Толькі што парадкавы нумар на плячы не выбіваюць, а так адно – начальнік лагеру тупая макака, і на вышках з кулямётамі макакі сядзяць, якім абы іголкі пад пазногці заганяць тым, хто галаву падняў.

Я вярнуся ўвечары. Вярнуся і парву гэты аркуш нафіг, каб ты ніколі не ўбачыла яго. Я не хачу, каб ты гэта чытала. Але не пакінуць яго я не мог.

Памятаеш, я сказаў, што планую жыць вечна? Я і планую. І ніхто мне не перашкодзіць. І ты будзеш вечна жыць са мной. Ніхто – ні Бог, ні бананавыя малпы нам не ўказ. Хай падавяцца сваімі турэмнымі правіламі і свінячымі законамі. Мы не памрэм ніколі. А яны хутка. Мы яшчэ пасмяемся.

На ўсялякі выпадак, калі усё ж такі здарыцца так, што гэты ліст трапіць у тваe рукі – прашу, не крыўдуй на мяне, і чакай, колькі б не прыйшлося чакаць. Хоць усё жыццё. Мы будзем разам,назло ўсім.

Кахаю цябе больш за жыццё, больш за ўсё, што ў мяне ёсць.

Хутка вярнуся. І парву ліст.

PS. Мая маленькая, ты плачаш? Не трэба! Перажывалі ўсё – будзе сорамна не перажыць штосьці яшчэ. Ну, вытры-ка слёзкі! І памятай – мы будзем жыць вечна."

Яна выйшла на вуліцу толькі праз месяц. Выйшла адна, уначы, пакуль сяброўка спала. Між цёмных дамоў яна шукала цень тых дзён, калі ўсё было па-ранейшаму. Калі ўсе

былі жывыя і адносна шчаслівыя. Тут, сярод да болю і з дзяцінства знаёмых шэрых сценаў, таго ценю не было магчымасці знайсці нават пад мікраскопам, але яна адно углядалася ў аднолькавыя будаўнічыя блокі.

Яна так і не плакала больш. Не магла – вочы не нараджалі слёз. Слёзы – гэта следства эмоцый. Эмоцый яна больш не мела. Аніякіх. Ніколі

Яна вярталася у пад'езд а трэцяй ночы. Машынальна набрала код на дзвярах, паднялася па кароткай лесвіцы да ліфта, націснула кнопку выкліку...

Яна нават не спужалася, калі на яе ззаду навалілася нейкая туша, прыціснуўшы да сцяны і заткнуўшы агромністай лапай рот.

– Ціха, сука, маўчаць, – яе развярнулі тварам назад да лесвіцы, і яна ўбачыла што там стаяць яшчэ тры чалавекі, падобныя адзін на аднаго, усе сярэдняга росту, каржакаватыя, але нават з нейкім налётам інтэлігентнасці на тварах. Памерамі і фізічнай моцай вылучаўся толькі той, хто трымаў яе за рукі.

– Мы разумеем, што ты даведалася пра тое, што сталася з тваім мужам. Можаш нам не верыць, але нам шкада, што так сталася – у нас не было плану кагосьці забіваць; каб не некалькі тупарылых дэбілаў, якіх навучылі толькі палкамі махаць, усё б абышлося. Але што сталася, то сталася. Мы разумеем, што зараз марна спрабаваць з табой аб чымсьці дамовіцца. Больш за ўсё мы не жадаем, каб гэтая інфармацыя трапіла да нейкіх трэціх асобаў. Хоць гэтаму быдлу паходу ўсё роўна – хоць іх саміх забіваць вядзі – і слова не скажуць. Даў Бог народ – дзякуй яму за тое, пасвіць вельмі зручна. І ўсё ж...

Ты жыць хочаш? Маладая ж зусім яшчэ, не можаш не хацець, не бывае такога.

Насця не хацела. Альбо правільней сказаць, для яе не было аніякай розніцы – жыць ці паміраць, яна ўжо больш за месяц была недзе пасярэдзіне між смерцю і жыццём і іншага ўжо не ўяўляла. Але яна цудоўна разумела, чаго ад яе хочуць. Забыць. Маўчаць. Усё жыццё маўчаць. Дамаўляцца з ёй насамрэч не было аніякага сэнсу – заставалася альбо забіць таксама, альбо проста прыстрашыць смерцю. Цудоўны план. Не было ўлічана толькі адно – яна больш не баялася смерці. Але яна прагнула іншага. Зусім іншага...

– Хачу, – аднымі вуснамі ледзве чутна прашаптала яна.

– Вось і цудоўна. Ад гэтага моманту твой муж знік без вестак. Яго не было на плошчы тады, месяц таму, ён проста выйшаў з дому і не вярнуўся. Гэтак ты будзеш казаць усім. Казаць да таго моманту, пакуль сама ў гэта не паверыш. Інакш... ты сама разумееш, што будзе інакш. Мы маглі б забіць цябе проста тут, і ніхто б не падумаў, што гэта не работа чарговага мясцовага маньяка. Але мы не звяры. Нам не хочацца крыві дзеля крыві. Жыві.

Яны зніклі гэтак жа хутка, як і з'явіліся. Насця паднялася на свой сёмы паверх, асцярожна адчыніла дзверы ў кватэру, ціхенька, каб не абудзіць сяброўку, прайшла ў свой пакой, зачынілася ў ім.

Упершыню за апошні месяц яна дакладна ведала, куды трэба ісці, што і навошта трэба рабіць. Не каб жыць далей, не. Каб нарэшце скончылася гэта адчайная цемра. Хоць для яе.

Яна хутка пісала ўсё, што лічыла патрэбным на асобных аркушах паперы. Пісаць трэба было шмат, але ў яе наперадзе была цэлая ноч і цэлы ранак – яе сяброўка прачыналася позна, а галоўнае было паспець да таго моманту, як яна прачнецца.

Чатыры абсалютна аднолькавыя лісты былі ўкладзены

ў вялікія канверты, якія засталіся дома яшчэ ад часоў захаплення посткросінгам. Туды ж Насця паклала па некалькі фотаздымкаў з Андрэем. Потым канверты былі залепленыя і на кожным з іх напісаны адрас адной з чатырох буйных незалежных газет.

Затым Насця напісала яшчэ адзін ліст – сяброўцы. У ім яна прасіла, не адкладваючы, самой аднесці канверты па адрасах, якія былі на іх напісаныя. Насця дзякавала за ўсё, што сябры рабілі для яе і прасіла прабачэння. За што – яна не пісала. Проста хацела, каб яе прабачылі за ўсё, што яна зрабіла, і, галоўнае, за тое, што зробіць.

Гадзіннік паказваў палову на восьмую раніцы, адзінаццатае чэрвеня дзве тысячы адзінаццатага году. Панядзелак.

Насця апранула доўгую белую сукенку, чымсьці падобную да вясельнай. У гэтым строі яна нагадвала прыгажуню-князёўну з часоў Кіеўскай Русі. Толькі надта схуднелую. Нават у самыя галодныя гады славянскія князёўны не былі такімі схуднелымі.

Насцю гэта не турбавала.

Яна ўзяла мабільны тэлефон, набрала нумар, Павіталася з кімсьці, потым ціха сказала некалькі словаў і націснула на адбой. Трэба было ісці.

Агромістая плошча віравала людзьмі, якія спяшался на працу. Людзі працягвалі жыць, працягвалі пасля таго, што адбылося месяц таму, і яны жылі, нібыта нічога й не здарылася, нібыта не было шалёнай бойкі, не было болю і крыві, не было вар'яцкіх вачэй нелюдзяў, якія білі простых хлопцаў і дзяўчат, білі старых і дзяцей.

Ды што там! Большасці з тых, хто зараз ішоў па гэтай плошчы, сутыкаўся з сабе падобнымі, нерваваўся з-за спазнення, тады, паўтары месяцы таму тут не было. Хутчэй за ўсё гэтыя людзі ў душы падтрымлівалі тых, хто знайшоў у

сабе мужнасць выйсці на вуліцы. Верагодна, што некаторыя з іх у сваім сяброўскім коле абураліся тым, што здарылася, можа нават яны насілі перадачы ў турмы для затрыманых і сустракалі з бальніцаў пацярпелых. Але яны маўчалі – і былі тым злачынцамі. Калі ты бачыш злачынства і маўчыш – ты становішся саўдзельнікам яго. Яны не адкрылі рта, каб пратэставаць супраць тых, хто парушаў адвечныя законы дзяржавы і самога жыцця – яны самі насілі на сваёй душы таўро злачынства супраць чалавечай асобы. Яны маглі адмаўляць гэта, але адно заставаліся вінаватымі ў тым, што адбывалася з іх маўклівай згоды. Ім не хацелася адчуваць сябе злачынцамі, але дзесьці там, наверсе, я веру, аднойчы з іх спытаюць за ўсё – за маўчанне, за шэпт на кухнях... за баязлівасць. Іх шанцам выкупіць гэтыя грахі было толькі прызнанне сябе вінаватымі – прынанне і спробы справай, а не шэптам, выправіць свае злачынствы.

А пакуль што яны проста спяшаліся кудысьці па гэтай плошчы, дзе павольным крокам ішла неверагодна прыгожая дзяўчына ў белай сукенцы да зямлі і з вялікай торбай ў руках.

Было бачна, што торба вельмі цяжкая, і дзяўчына несла яе з перапынкамі, праз кожныя пяцьдзесят метраў спыняючыся для адпачынку, але ніхто не падышоў дапамагчы. Штосьці было ў гэтым незвычайнае, што пужала і прымушала людзей падсвядома разыходзіцца ў бакі.

Яе мэтай быў цэнтр агромістай плошчы, дзе на высокім пастаменце стаяў помнік вядомаму паэту гэтай краіны. Не істотна што гэта быў за паэт. Яшчэ больш не істотна, у яко й краіне адбывалася гэтая гісторыя. Істотна адно – краіна была бананавай, з малпай на троне і малпамі вакол трона. Плюс з незлічонай колькасцю малпафобаў і малпафілаў замест нармалёвых грамадзян.

Тут, толькі тут, у краіне бананавай дыктатуры магло здарыцца штосьці падобнае – незвычайная чалавечая трагедыя на фоне звычайных бананавых будняў, у якіх жывуць дзясяткі такіх краін.

Ішла дзявятая гадзіна раніцы, калі Насця нарэшце дайшла да помніка. Тут яна прысела на халодны камень і глыбока ўдыхнула летняе паветра. Яно кружыла галаву і суцяшала яе сэрца.

Сярод тысяч людзей, якія не былі побач з яе мужам, якія не прыйшлі яму на дапамогу, якія беглі прэч з плошчы, альбо ўвогуле не прыйшлі на яе, яна ўпершыню зразумела, наколькі насамрэч засталася самотнай.

Тут жа яна плакала ў першы раз за апошні месяц, плакала і ненавідзела тых, хто смеў кідаць на яе няўхвальныя альбо спачувальныя позіркі.

І ёй было ўсё роўна, што будзе далей. Яна ўжо зрабіла тое, што мусіла зрабіць. Заставалася толькі адна справа.

Насця паднялася на ногі, падхапіла сваю торбу і ўзышла з ёй па прыступках на гранітны пастамент помніка. На выходных гэтае месца было папулярным сярод турыстаў і дзяцей, але была раніца панядзелка, і дзяўчына ў белай сукенцы стаяла адна, ўзвышаючыся над бястварым натоўпам, што варушыўся пад ёй. Раз-пораз людзі глядзелі на яе з нейкім здзіўленнем, але тут жа адводзілі вочы ўбок.

Яна стаяла, накіраваўшы позірк у неба, на якім не было аніводнага воблака. Дзесьці там быў ён, несмяротны, як і марыў. Больш ні аб чым яна не думала.

Торба адчынілася адным імклівым рухам. У ёй знаходзілася вялікая пластыкавая бутля на шэсць літраў, у якой даверху была наліта нейкая празрыстая жаўтаватая вадкасць.

Сэрца грукала з нерэальнай хуткасцю, яно наўпрост імкнулася выскачыць з грудзей. Яно, здавалася, толькі яно

разумела, што зараз мусіць адбыцца – сама Насця не адчувала аніякага хвалявання. Яна не адчувала нічога. Толькі нянавісць, якой ніколі раней не было ў яе душы. Нянавісць да бананавага прэзідэнта, да яго халуёў і сэксотаў, да баязліўцаў, якія былі гатовы біцца з кім заўгодна за кавалак хлеба – адно толькі не супраць свайго дзяржаўнага ідала. Яна ненавідзела гэтых людзей і больш нічога для яе не засталося, акрамя гэтай лютай нянавісці.

Насценька рэзка паднала бутлю з зямлі, з вялікай цяжкасцю ўзняла над сваёй галавой і перакуліла яе горлачкам уніз. На яе абрынулася імклівая плынь змесціва бутлі, шасці літрам спатрэбілася не больш за некалькі секундаў, каб не пакінуць аніводнага сухога сантыметра на целе дваццаціпяцігадовай дзяўчыны.

Людзі пад пастаментам пачалі спыняцца, але было позна.

З той жа торбы Насця выцягнула нейкі невялікі металічны прадмет. Унізе, з прыступак, нельга было разабраць, што гэта такое. Між тым, гэта была любімая бензінавая запальнічка Андрэя – сапраўдная амерыканская Zippo, якую Насця падаравала яму тры гады таму.

І толькі пачуўшы характэрны металічны лязг адкінутага верха запальнічкі, людзі ўнізе зразумелі ўсё.

А яна спакойна павярнулася тварам да сонца, раскінула рукі і ў наступны момант шоргнула колцам па крэмні.

Яна не крычала ад болю, не. Яна проста яго не адчувала. Для яе не існавала шалёнае полымя, якое ірвала на кавалкі яе шыкоўную сукенку, абпальвала белую скуру і знішчала неверагоднай прыгажосці светлыя валасы.

І толькі праз дзесяць секундаў, якія спатрэбіліся людзям, каб адысці ад першага шоку і кінуцца ратаваць згараючую дзяўчыну, Насця зрынулася з каменнага пастаменту ўніз, з вышыні пяці метраў на брукаваную паверхню плош-

чы; толькі ў гэты момант, падаючы, яна згубіла прытомнасць. Яна падала нейкую долю секунды, але тым, хто бачыў гэта, падалося, што прайшла цэлая гадзіна перад тым, як ахопленае агнём цела маладой дзяўчыны грукнулася аб зямлю. Насця падала ўніз, як падае белая лебедзь, якая не можа перажыць смерці свайго каханка – і зрынаецца з недасяжнай вышыні, з-пад нябёсаў, на жорсткія камяні, каб там адразу памерці і не адчуваць таго садысцкага болю ў сэрцы, што забівае гадамі. Насця й была такім белым лебедзем, які ўзляцеў высока ўверх толькі дзеля таго, каб прыгожа ўпасці адтуль на халодную зямлю. Каб не заставацца адной. Лебедзі не могуць быць аднымі. Сапраўдныя лебедзі заўжды паміраюць разам.

## Пасляслоўе

Канец гэтай незвычайнай гісторыі кожны можа прыдумаць сам.

Можна паспрабаваць даць гэтай дзіўнай выдуманай бананавай краіне будучыню, і напісаць, як пасля апісаных падзеяў бананавае грамадства пачало разумець, што было не так у іх жыцці, і, галоўнае, што з гэтым рабіць. Падобна гісторыі сучаснай туніскай рэвалюцыі, дзе пасля самаспалення вулічнага гандляра Мухамеда Буазізі выбухнула сапраўднае паўстанне супраць ненажэрнага бананавага прэзідэнта; можна было б прыдумаць адпаведную канцоўку і для гэтага аповеду – з людзьмі, якім надакучыла быць статкам, і кіраўніком племені, што збег з краіны ад страху перад уласным народам.

Можна было б скончыць і зусім інакш – так, як звычайна ўсё і адбываецца. Незалежныя сродкі масавай інфармацыі тыражуюць гісторыю незвычайнага кахання на фоне бананавых касталомаў, дзяржаўныя падкрэслена абыходзяць непрыемную тэму. Людзі на кухнях працягваюць закрываць далонямі твар, нібыта даюць іншым зразумець, наколькі яны ў шоку, але й далей трасуцца за сваю тлустую пятую кропку, працоўнае месца ў офісе й трыста даляраў заробку. Трасуцца да таго моманту, пакуль гэткая ж гісторыя не пройдзе ад іх сусім блізка. У бананавай краіне штосьці падобнае можа здарыцца з кожным. Ды толькі статак не хоча разумець намёкаў. Крэдытны фольксваген бліжэй да офіснай дупы.

Кожны выбірае для сябе не толькі канцоўку кароценькай аповесці, якую б ён хацеў бачыць. Кожны выбірае свой шлях.

Які б ні быў выбар кожнага чалавека, ніхто не мае права яго асуджаць. Адказваць за сябе – вось галоўны прынцып усіх зменаў да лепшага ў свеце.

Часам так хочацца верыць, што ў людзей засталіся нейкія каштоўнасці, вышэйшыя за паўсядзённую пайку. Так хочацца... і не атрымліваецца. Прынамсі, усё ў руках саміх людзей – вярнуць веру ў сябе альбо назаўжды ад яе адмовіцца. У рэшце рэшт, прыгожа паміраць – лёс лебедзяў. Простым людзям гэта не трэба. Ды для іх гэта й недасяжна.

Прыгажуня-лебедзь са спаленымі пёрамі цяжка пакутвала яшчэ два тыдні ў рэанімацыі. Потым яе маленькае сардэчка не вытрымала. Яно й не хацела трываць. Яму трэба было адляцець.

Сапраўдныя лебедзі паміраюць разам.

Дваццаць пятага чэрвеня, дзве тысячы адзінаццатага года, а палове на дзявятую раніцы іх душы зноўку сустрэліся ў недасяжным палёце, у небе над выдуманай бананавай краінай. Сустрэліся, каб назло ўсім ніколі больш не пакідаць адзін аднога.

Бананавыя дыктатары змяняюцца і адыходзяць у нябыт. Лебедзь, страціўшы каханка, разбіўшыся ўслед за ім, жыве вечна. У гэтым ёсць і будзе справядлівасць гэтага свету. І пакуль гэта так, свет не згасне, не знікне ў цемры стагоддзяў. Усё ў жыцці трымаецца на лебедзях. Тых, якія паміраюць разам.

*Красавік – травень 2011 г.*
*De la Fere*

# Ад аўтара

Гэтая кніга не пра дыктатуры і дыктатараў. Не пра каханне, як можа здацца. Яна пра звычайных людзей. Пра іх выбар. Пра іх пачуцці, памкненні, страхі, перамогі і паразы. Пакуль чалавек адмаўляецца думаць і рабіць тое, што падказвае сумленне, ён статыст, не болей. Быць АСОБАЙ – вось натуральнае памкненне любога нармальнага чалавека. Кніга "Лебедзі праміраюць разам" для такіх і пра такіх.

Аўтар гэтай кнігі выказвае падзяку ўсім людзям, без якіх яна, верагодна, не ўбачыла б свет. У першую чаргу гэта Кацярына Колб, якая зрабіла вельмі шмат, каб "Аповесць пра чалавека, які не хацеў быць Богам" дайшла да сваіх першых чытачоў. Дзякуй Каці за веру, за падтрымку, за дапамогу. Без гэтага чалавека не было б і гэтай кнігі.

Дзякуй Мікалаю Мікалаевічу Крывальцэвічу і Ігару Мікалаевічу Кузняцову. Яны – мае сапраўдныя настаўнікі і дапаможцы. Зноў жа, без іх "Аповесць ..." ніколі б не была напісаная.

Дзякуй старшыні Саюза Беларускіх Пісьменнікаў Алесю Пашкевічу за добразычлівасць і магчымасць дэбютаваць, Генадзю Бураўкіну за параду "не саскочыць", уласна Саюзу Пісьменнікаў і ПЭН-цэнтру.

Усім родным і блізкім, шматлікім сябрам.

Дзякуй і тым, хто не верыў (былі й такія). Ваш недавер толькі прымушаў ісці наперад.

Спіс можна было б працягваць да бясконцасці – і гэта паказвае, што ў свеце нават сёння ёсць агромістая колькасць сапраўдных людзей, якія гатовыя дапамагаць проста так,

рабіць добрыя ўчынкі толькі таму, што так падказвае сэрца. І гэта не можа не радаваць.

Веры, моцы, радасці вам, дарагія сябры. Будучыня – гэта мы.

# Змест

**АПОВЕСЦЬ ПРА ЧАЛАВЕКА, ЯКІ НЕ ХАЦЕЎ БЫЦЬ БОГАМ** ........ 3
Мы ........ 10
Жаўнер прывіднай арміі ........ 12
Дзед Юрась ........ 18
Маёр Раманаў ........ 32
Валя ........ 48
Нашыя часы, Інстытут Гісторыі НАН РБ ........ 55
Каляды ........ 60
Пачатак ........ 65
Палігон ........ 71
Малітва ........ 84
Ясік ........ 89
"Кахаю" ........ 100
"TACCIANKA NIE ZYJE!!!" ........ 107
Спадчына ад'ютанта генерала Станіслава ........ 116
Эпілог ........ 127

**ПРАВА ДАРАВАЦЬ** ........ 129

**ЛЕБЕДЗІ ПАМІРАЮЦЬ РАЗАМ** ........ 143

**Ад аўтара** ........ 189

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Егарэйчанка** Сяргей Аляксандравіч

**Лебедзі паміраюць разам**

Дызайн Кацярына Пуставалава
Фото Вольга Шуйская

Падпісана ў друк 22.06.2011 г. Фармат 70x108 $^{1}/_{32}$.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 8,4.
Ул.-выд. арк. 8,4. Наклад 200 асоб. Замова № 1939.

Выдавец І. П. Логвінаў. Пр-т Незалежнасці, 19–5,
220050, г. Мінск. ЛИ 02330/0494468 ад 8.04.2009 г.

Друк ТДА «НоваПрынт». ЛП 02330/0552786 ад 25.02.2009.
Вул. Геалагічная, 59-4-10, 220047, г. Мінск.



**Сяргей Егарэйчанка**
нарадзіўся 17 кастрычніка 1988 года. Скончыў гістарычны факультэт БДУ па спецыяльнасці "Айчынная гісторыя". Дэбютаваў у газеце "Літаратурная Беларусь" творам "Аповесць пра чалавека, які не хацеў быць Богам". У 2011 годзе атрымаў заахвочвальную прэмію імя Максіма Багдановіча ад Саюза беларускіх пісьменнікаў і беларускага ПЭН-цэнтра ў намінацыі "Проза".

«Людзі жылі розныя. І разумныя, і не вельмі. Як усюды. Толькі што баяліся амаль усе, за рэдкім выключэннем. Чаго баяліся, нават не ўсе маглі растлумачыць – ці то падвышэння коштаў на бензін і хлеб, ці то вайны з Тумба-Юмбай і іншапланецянамі, ці то адмены канцэртаў сваіх улюбёных музыкаў. Большая частка, праўда, баялася выключна свайго ўрада, таго самага, які для народа і з народа. Беднаму народу было страшна глядзець на чарговую тлустую падлу на тэлеэкране, глядзець і разумець, што гэтая дзяржаўная дупа для яго і з яго. "Адкуль?" – пытаў сам сябе народ і глядзеў у люстэрка. Тое з абсалютным пастаянствам паказвала схуднелага чалавечка ў зморшчынах, ну ніяк не падобнага да тых, каго чалавечак бачыў у тэлескрыні. Заставалася толькі здзіўляцца, як гэтае маленькае і худое магло спарадзіць тое агромістае і тлустае.»

9 789856 991397

*Лебедзі паміраюць разам*

Сяргей Егарэйчанка